**Установа адукацыі**
**“Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”**

**А.М. Вабішчэвіч**

# АСВЕТА
# Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
# (1921 – 1939 гг.)

МАНАГРАФІЯ

Брэст 2004

ББК 74. 03 (2 б)

УДК 373 (476 - 15) (091)

В12

Рэкамендавана да друку рэдакцыйна-выдавецкім саветам установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”

Навуковы рэдактар – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук М.П. Касцюк.

Рэцэнзенты: доктар гістарычных навук, прафесар У.І. Навіцкі;
доктар гістарычных навук, прафесар М.Э. Часноўскі.

**Вабішчэвіч А.М.**

В-12 Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.): Манаграфія. – Брэст: Выдавецтва УА “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”, 2004. – 116 с.

Аўтар даследуе стан асветы ў заходняй частцы Беларусі ў 1921 – 1939 гг. Прааналізавана палітыка польскіх улад у галіне адукацыі, становішча навучальных установ у краі, праблемы беларускіх гімназій і пачатковых школ, пытанні нацыянальнай асветы ў дзейнасці партый і аганізацый Заходняй Беларусі.

Адрасуецца выкладчыкам, студэнтам, усім, каго цікавіць гісторыя культуры і адукацыі Беларусі.

УДК 373 (476 - 15) (091)
ББК 74.03 (2 б)

ISBN

# УВОДЗІНЫ

Аб'ектам вывучэння дадзенай працы з'яўляюцца стан і праблемы захавання нацыянальнай адукацыі ў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гадах. Пад нацыянальнай маецца на ўвазе толькі беларуская. Пытанні развіцця школьнай справы іншых нацыянальных супольнасцей краю закранаюцца толькі ўскосна. У манаграфіі разглядаецца асвета большай, аўтахтоннай часткі насельніцтва – беларусаў. Пры гэтым зроблена спроба выдзеліць асноўныя фактары, якія ўплывалі на лёс руху за беларускія школы, цяжкасці і поспехі ў яго развіцці, вызначыць характар, накіраванасць, асаблівасці ажыццяўлення школьнай палітыкі польскіх улад, высветліць ролю розных палітычных партый, рухаў, сацыяльных слаёў у справе захавання беларускай нацыянальнай школы. Акрамя таго, прааналізавана дзейнасць культурна-асветніцкіх арганізацый па вырашэнню школьнага пытання, акрэслена месца беларускіх гімназій у нацыянальна-культурным жыцці краю.

Неабходнасць даследавання тэмы вынікае са ступені яе вывучанасці. Многія палажэнні, высновы ранейшых работ патрабуюць цяпер пераасэнсавання, удакладнення.

Варта адзначыць, што асобныя працы па заходнебеларускай тэматыцы наогул пачалі з'яўляцца ў даваенны час ў агульнасаюзным друку яшчэ ў другой палове 1920-х гадоў. У іх стан адукацыі асвятляўся ў агульным рэчышчы бяспраўнага існавання беларусаў у Польскай дзяржаве. Асаблівую ўвагу Заходняя Беларусь выклікала ў вучоных БССР. Аднак навукоўцы гістарычнай камісіі польскага аддзела Інстытута беларускай культуры, камісіі АН БССР па вывучэнню Заходняй Беларусі рабілі толькі падыходы ў вызначэнні месца адукацыйных праблем у нацыянальна-вызваленчай барацьбе. Не закраналіся асобна пытанні нацыянальнай школы і ў калектыўнай працы "Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне" (Мінск, 1940). Навуковыя пошукі ў многім абмяжоўвала адсутнасць зыходных архіўных матэрыялаў. Пераважная большасць брашур і кніг 1920 – 40-х гадоў, прысвечаных заходнебеларускай тэматыцы, мела невялікі аб'ём і з'ўлялася па характару не столькі даследчыцкай, колькі ідэалагічнай, палітычнай літаратурай.

Некаторы ўклад у вывучэнне згаданых пытанняў унеслі даследчыкі, якія самі актыўна ўдзельнічалі ў заходнебеларускім нацыянальна-вызваленчым руху. П.В. Мятла, адзін з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы, у кнізе "Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе" (Мінск, 1932) упершыню прааналізаваў дзейнасць гэтай арганізацыі. Яго праца

паклала пачатак вывучэнню руху за беларускую школу. Аднак з узмацненнем сталінскай дыктатарскай сістэмы гэтая брашура, як і большасць астатніх, была надоўга выведзена з навуковага абароту.

Пытаннямі нацыянальнай школы займаліся і непасрэдна ў Заходняй Беларусі. Толькі ўсе гэтыя артыкулы ў газетах, часопісах уяўляюць сабой найперш каштоўныя крыніцы, а не навуковыя, аналітычныя працы.

З усталяваннем у савецкай гістарыяграфіі манапольнага становішча марксіцка-ленінскай метадалогіі, заідэалагізаванасці падыходаў грамадазнаўцаў да гісторыі беларускага нацыянальнага адраджэння была выключана магчымасць глыбокага і сур'ёзнага вывучэння тэмы. Адсутнасць шырокай крыніцазнаўчай базы – архіўныя дакументы нават цэлае дзесяцігоддзе пасля вайны яшчэ не былі даследаваны і сістэматызаваны – таксама тармазіла працу вучоных.

Рашэнні XX з'езда КПСС паспрыялі больш аб'ектыўным пошукам даследчыкаў. Перыяд з сярэдзіны 1950-х да сярэдзіны 60-х гадоў у гістарыяграфіі дадзенай праблематыкі займае адметнае месца. Хоць і сціпла, але даволі абгрунтавана асобныя аспекты нацыянальнай школы выкладзены ў калектыўных выданнях “История Белорусской ССР” (Минск, 1961), “Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921-1939 гг.)” (Минск, 1966). Толькі ў цеснай сувязі з класавай і нацыянальнай барацьбой разглядалі рух за школы на роднай мове даследчыкі А.М. Мацко, Т.Ю. Глінская, І.П. Хаўратовіч, І.В. Палуян. Гісторык У.А. Палуян у сваіх работах пераканаўча даказаў, што Грамада моцна паўплывала на пераўтварэнне ТБШ у масавую культурна-асветніцкую арганізацыю, дала штуршок барацьбе за беларускую школу. Работы гэтага навукоўца ( сярод іх – “Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг.” (у сааўтарстве з І.В. Палуянам) (Минск, 1962), “Беларуская сялянска-рабочая Грамада” (Мінск, 1967)) фактычна аднавілі пасля доўгіх дзесяцігоддзяў забыцця традыцыю грунтоўнага вывучэння арганізаваных форм барацьбы за беларускія школы.

У другой палове 1960-х – канцы 80-х гадоў даследчыкі больш скрупулёзна вывучалі як стан адукацыі, так і некаторыя моманты, звязаныя з захаваннем нацыянальнай школы ва ўмовах дэнацыяналізацыі. Усе гэтыя пытанні былі тэзісна выкладзены ў фундаментальных калектыўных працах, падрыхтаваных вучонымі Інстытута гісторыі АН БССР. Строга вызначаныя ідэалагічныя ўстаноўкі прадвызначылі метадалогію і тэматыку навуковых прац. Нярэдка гэта перашкаджала ўзважліваму, усебаковаму аналізу тэндэнцый, падзей, асоб. Аднак многія з тых работ не страцілі сваёй навуковай вартасці і цяпер.

Народную асвету ў Заходняй Беларусі ў 1920-1939 гадах закранала ў сваіх работах Г.Р. Сянькевіч (у калектыўным даследаванні "Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі" (Мінск, 1968) і іншых). Яна асвятляла арганізацыю школьнай справы, змест навучання, выхавання ў беларускіх пачатковых школах і гімназіях, педагагічную дзейнасць і погляды Б.А. Тарашкевіча, С.К. Паўловіча, І.С. Дварчаніна, Ф.І. Стэцкевіча, рух за дэмакратызацыю адукацыі. Калі стан адукацыі даследчыца вывучала даволі падрабязна, то праблемы захавання нацыянальнай школы – недастаткова. Няпоўнай была характарыстыка пазіцый заходнебеларускіх арганізацый, партый, ролі беларускіх гімназій, па-за ўвагай застаўся пачатковы перыяд дзейнасці ТБШ. Аднак патрэбна аддаць належнае каштоўным распрацоўкам у галіне гісторыі педагогікі, якія былі выкананы Г.Р. Сянькевіч.

Шмат прац па заходнебеларускай праблематыцы з'явілася ў канцы 1960-х – 70-я гады. Важкі ўклад у яе распрацоўку ўнеслі ўжо згаданы А.М. Мацко, П.І. Зялінскі, М.А. Ракевіч, А.А. Віхраў, М.А. Бабёр, У.Ф. Ладысеў. Імкненне жыхароў Заходняй Беларусі мець школы на роднай мове цесна звязвалася даследчыкамі з іншымі жыццёвымі клопатамі людзей. Замацаваныя ідэалагічныя ўстаноўкі не дазвалялі вучоным больш крытычна паставіцца да поспехаў і памылак заходнебеларускага камуністычнага руху ў справе барацьбы супраць нацыянальнага ўціску жыхароў краю. Аднак навукоўцы ў працах па гісторыі Заходняй Беларусі імкнуліся выдзеліць асобна барацьбу за нацыянальную культуру, супраць паланізацыі. Усё больш увагу даследчыкаў прыцягвалі асобы дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху. Цікавасць уяўляе навукова-папулярная кніга А.С. Ліса "Браніслаў Тарашкевіч" (Мінск, 1966).

У манаграфіі У.А. Палуяна "Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.)" (Минск, 1978) прааналізаваны склад і арганізацыйнае развіццё ТБШ, яго ідэйна-палітычныя пазіцыі, правядзенне кампаніі за адкрыццё беларускіх школ, наладжванне культурна-асветніцкай работы. Аўтар ацаніў Таварыства як прагрэсіўную дэмакратычную культурна-асветніцкую арганізацыю. Агульная выснова навукоўца – менавіта культурна-асветніцкая праца, барацьба за беларускую дэмакратычную школу садзейнічалі захаванню і распаўсюджванню нацыянальнай культуры, павышэнню пісьменнасці працоўных.

У 1980-я гады шматвектарнасць даследаванняў па гісторыі Заходняй Беларусі захавалася. Аднак па-ранейшаму значнае месца займалі працы гісторыка-партыйнай тэматыкі. У.Ф. Ладысеў негатыўна ацэньваў

левасектанцкую практыку КПЗБ у першай палове 1930-х гадоў. Як і ў даследаваннях У.А. Палуяна, у яго працах звярталася ўвага на дзейнасць кансерватыўных і цэнтрысцкіх нацыянальных партый, арганізацый, але яна не атрымоўвала станоўчай ацэнкі.

Да канца 1980-х гадоў у беларускай савецкай гістарыяграфіі былі выкладзены наступныя канцэптуальныя высновы па разглядаемай тэме:

– польская буржуазная школа мела антыбеларускі, рэакцыйны характар, яна была скіравана на паланізацыю насельніцтва Заходняй Беларусі;

– ТБШ у першыя гады свайго існавання знаходзілася пад уплывам беларускіх нацыяналістычных партый, не вяло актыўнай працы;

– рух за беларускую дэмакратычную, працоўную школу быў састаўной часткай рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы;

– ТБШ вырасла ў масавую прагрэсіўную культурна-асветніцкую арганізацыю ў ходзе развіцця вызваленчага руху, пад уплывам КПЗБ, а таксама Грамады і клуба “Змаганне”;

– заходнебеларускія арганізацыі, партыі, дзеячы, якія не належалі да рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера, імкнуліся звесці сваю дзейнасць у плынь нацыяналізма, згодніцтва, буржуазнага культурніцтва.

У цэлым пытанні тэмы разглядаліся пераважна ў кантэксце вызваленчага руху. Прыярытэт партыйнага і класавага прынцыпу не дазваляў даследчыкам даваць больш аб’ектыўныя ацэнкі розным палітычным сілам Заходняй Беларусі ў справе іх змагання супраць нацыянальнага прыгнёту. Асобы многіх відных дзеячаў нацыянальнай інтэлігенцыі (А.І. Луцкевіч, А.В. Станкевіч і іншыя) не занялі належнага месца ў навуковых работах. Асобна не падкрэслівалася, якое значэнне мела поўнае знікненне беларускіх школ для далейшага існавання этнасу.

Новыя падыходы, пераадоленне ідэалагічных стэрэатыпаў знайшлі сваё адлюстраванне ў працах беларускіх гісторыкаў у канцы 1980-х – 90-я гады. Найперш гэта датычыць калектыўных даследаванняў, якія былі выдадзены ў гэты час пры ўдзеле шырокага кола навукоўцаў – “Нарысы гісторыі Беларусі” (частка 2) (Мінск, 1995), “Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917-1945 гг.” (Мінск, 1993), “Гісторыя Беларусі” (частка 2) (пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля) (Мінск, 1998) і іншыя. У заходнебеларускай праблематыцы больш аб’ектыўнай стала ацэнка вопыту асобных партый, рухаў, дзеячаў. У многім гэтаму дапамагло пашырэнне базы дакументаў – за кошт раней забароненых. У шэрагу навуковых артыкулаў У.Ф. Ладысеў зрабіў спробу пераасэнсавання

дзейнасці КПЗБ. Аўтар гэтых радкоў у асобных публікацыях закранаў некаторыя, нават малавывучаныя, аспекты беларускага асветніцтва. Э.А. Мазько ажыццявіў захады для аналізу напрамкаў культурна-асветніцкай дзейнасці Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі.

Прадстаўнікі беларускай дыяспары таксама распрацоўвалі асобныя пытанні тэмы. Для яе шырокага і комплекснага вывучэння ім не хапала архіўных дакументаў, большасць якіх захоўвалася ў БССР. Напісанае імі – гэта пераважна ўспаміны, юбілейныя артыкулы, а не навуковыя акадэмічныя працы. Аўтарамі работ часцей былі непасрэдныя ўдзельнікі заходнебеларускага руху, выпускнікі гімназій. Чыста навуковы характар мелі толькі асобныя артыкулы. Публікацыі, прысвечаныя розным аспектам асветы ў Заходняй Беларусі, раскіданы па многіх часопісах і газетах беларускай дыяспары. У адрозненне ад беларускай савецкай гістарыяграфіі, навукоўцы з асяроддзя беларускага замежжа мелі іншыя канцэптуальныя падыходы і палажэнні ў асвятленні дадзеных пытанняў. Шмат матэрыялаў мемуарнага характару друкавалася ў газеце “Беларус”, часопісе “Полацак” і іншых выданнях Новага свету.

Прысутнасць заходнебеларускай праблематыкі ў перыёдыцы заходняй дыяспары невыпадковая. Многія з аўтараў дзяліліся сваімі ўспамінамі, якія насілі на сабе адбітак асабістых ацэнак падзей, дзеячаў. Надрукаваныя матэрыялы нярэдка аднаўлялі невядомыя старонкі асветніцкага жыцця Заходняй Беларусі вачамі іх сведкаў. Больш грунтоўна дадзенай праблематыкай (як і наогул пытаннямі айчыннай гісторыі) займаліся ў 1990-я гады вучоныя-беларусы ў Польшчы. Актыўнасцю вылучалася створанае ў 1993 г. Беларускае гістарычнае таварыства ў Беластоку. На Беларусі добра вядомы імёны аўтараў шматлікіх манаграфій, зборнікаў дакументаў, артыкулаў, дакладаў і паведамленняў на навуковых канферэнцыях Я. Мірановіча, А. Латышонка, А. Глагоўскай, Р. Сосны і іншых беластоцкіх даследчыкаў.

У польскай гістарыяграфіі заходнебеларуская праблематыка часткова закранalася яшчэ ў 1920-30-я гады. Работы не былі глыбокімі, усебаковымі, аб’ектыўнымі даследаваннямі, выдзяляліся відавочнай тэндэнцыйнасцю – фактычна апраўдвалі нацыянальную палітыку польскіх урадаў.

Іншыя падыходы ў работах польскіх гісторыкаў замацаваліся ў пасляваенны час, асабліва ў 1960-я – першай палове 90-х гадоў. У фундаментальных акадэмічных выданнях ацэнка нацыянальнай палітыкі краіны міжваеннага часу, як курса на асіміляцыю няпольскага насельніцтва, супадала з пазіцыяй беларускіх гісторыкаў. Такія акцэнты прысутнічалі і ў пераважнай большасці манаграфічных прац польскіх

даследчыкаў А. Хайноўскага, Е. Тамашэўскага, Г. Маецкага, А. Садоўскага і іншых.

У некаторых працах польскіх навукоўцаў высвятлялася сітуацыя з канкрэтнымі тыпамі школ – пачатковымі, прафесійнымі. Вывучалася таксама школьная палітыка адносна пачатковых навучальных устаноў з няпольскай мовай выкладання. Аднак пытанні беларускай нацыянальнай школы асобна не разглядаліся.

Больш грунтоўна менавіта беларускае пытанне ў міжваеннай Польшчы вывучалі гісторыкі А. Бергман, К. Гамулка, М. Семаковіч, М. Мароз і іншыя. У сваіх манаграфіях, артыкулах, нарысах па гісторыі КПЗБ, нацыянальна-вызваленчай барацьбы А. Бергман звязвала эфектыўнасць захавання школ не толькі з унутрыпалітычным, але і са знешнім фактарам. Наяўнасць БССР і поспехі там у нацыянальна-культурным развіцці гэтаму спрыялі, згортванне палітыкі беларусізацыі на мяжы 1920-х – 30-х гадоў, сталінскія рэпрэсіі наносілі велізарны фізічны і маральны ўрон. Даследчыца прааналізавала дзейнасць многіх відных асоб, у тым ліку А.І. Луцкевіча. Заслугоўваюць увагі і працы К. Гамулкі. У адной з іх (“Беларусы ў ІІ Польскай рэспубліцы” (Гданьск, 1992) (на польскай мове)) абгрунтоўваецца тэзіс аб моцнай асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва. Сярод фактараў, якія садзейнічалі гэтаму, называюцца нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці беларусаў, малалікасць інтэлігенцыі, адсутнасць знешняй падтрымкі, слабасць арганізацый. Аднак не падкрэслівалася, што асноўнай прычынай з’яўлялася менавіта мэтанакіраваная палітыка Польскай дзяржавы.

Аналіз літаратуры сведчыць аб тым, што пытанні тэмы закраналіся ў многіх навуковых працах, але яе комплекснае вывучэнне не было аб’ектам спецыяльнага даследавання. Некаторыя яе аспекты засталіся па-за ўвагай навукоўцаў. Асобныя вывады патрабуюць цяпер удакладнення, далейшага развіцця, шэраг палажэнняў – дэідэалагізацыі.

Абраная тэма ахоплівае вялікую колькасць крыніц. З друкаваных найперш трэба адзначыць зборнікі дакументаў і матэрыялаў, якія выйшлі ў рэспубліцы і за яе межамі ў 1960-70-я гады [1]. Шырока выкарыстаны надрукаваныя ўспаміны актывістаў нацыянальна-вызваленчага руху, настаўнікаў, выпускнікоў гімназій [2]. Добра яны прадстаўлены і ў выданнях беларускай дыяспары. Некаторыя дакументы аб нацыянальнай палітыцы рэжыма “санацыі” Ю. Пілсудскага былі змешчаны ў навуковых выданнях Польшчы.

Вялікі пласт друкаванай літаратуры – перыядычныя выданні Заходняй Беларусі 20-30-х гадоў ХХ стагоддзя. Пераважную большасць з іх складаюць беларускамоўныя часопісы і газеты – “Летапіс ТБШ”

(“Беларускі летапіс”), “Калоссе”, “Родны край”, “Снапок”, “Студэнцкая думка”, “Сям’я і школа” , “Беларуская крыніца” (“Крыніца”), “Беларуская ніва”, “Беларускі звон”,  “Сіла працы”,  “Чырвоны сцяг” і іншыя. Сярод польскамоўных асабліва выдзяляюцца часопісы “Sprawy narodowościowe”, “Natio”, ведамасныя – міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, папячыцельстваў Палескай (Брэсцкай), Віленскай школьных акругаў і іншыя. У працы выкарыстаны таксама даныя афіцыйнай польскай статыстыкі, дакументы розных урадавых, грамадскіх установаў і арганізацый (статуты, справаздачы, інструкцыі і г. д.). Частка выкарыстаных крыніц – гэта праграмныя дакументы, неперыядычныя выданні беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый, палітычных партый. Пры распрацоўцы тэмы былі вывучаны і падручнікі, дапаможнікі, якія выкарыстоўваліся ў беларускіх гімназіях, пачатковых школах.

Не меншая ўдзельная вага ў крыніцазнаўчай базе работы належыць архіўным дакументам. Шырока прадстаўлены матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, філіяла Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Выкарыстаны таксама дакументы аддзела рукапісаў бібліятэкі АН Літвы, Дзяржаўнага архіва Літвы.

Частка архіўных крыніц раней не была ў навуковым абароце. Іх выкарыстанне дало магчымасць разгледзець некаторыя пытанні тэмы, якія папярэднімі даследчыкамі не вывучаліся ці закраналіся слаба. Менавіта гэтыя дакументы дазволілі падрабязна вывучыць дзейнасць беларускіх гімназій, асобных культурна-асветніцкіх арганізацый (Беларускага Інстытута Гаспадаркі і Культуры, Таварыства беларускай асветы), праграмныя ўстаноўкі і рэальныя адносіны да праблем нацыянальнай школы з боку розных партый Заходняй Беларусі. Хоць праблемы станаўлення беларускай нацыянальнай школы да 1921 г. не з’яўляліся аб’ектам дадзенай працы, але яе аўтар палічыў неабходным пачаць асвятленне сваёй тэмы якраз з таго перыяду, выкарыстоўваючы пры гэтым не толькі працы вучоных, але і архіўныя справы, многія з якіх раней не паступалі да шырокага кола даследчыкаў. Нягледзячы на тое, што ў дадзенай працы асноўная ўвага надавалася непасрэдна пытанням беларускай асветы, аднак закрануты і аспекты, звязаныя з адукацыяй іншых этнічных супольнасцей Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гады.

Такім чынам, наяўнасць разнастайных друкаваных, архіўных дакументаў і матэрыялаў стварае добры грунт для таго, каб даследаваць згаданую тэму.

# РАЗДЗЕЛ І. СТАН АДУКАЦЫІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ДА 1921 г.

Спачатку неабходна коратка ахарактарызаваць стан асветы ў заходнебеларускім рэгіёне напярэдадні Першай сусветнай вайны. У гэтым можа дапамагчы аналіз важнейшых паказчыкаў.

У 1897 г. колькасць пісьменных у адносінах да ўсяго насельніцтва (акрамя дзяцей да 10 гадоў) складала ў беларускіх паветах Віленскай губерні 33,9%, Гродзенскай – 31,5% (пры сярэднім паказчыку па Беларусі 25,7%). Даныя сведчаць аб тым, што доля пісьменных была большай у заходняй частцы Беларусі, але гэта было значна менш у параўнанні з цэнтральнымі губернямі Расійскай імперыі ці асобнымі еўрапейскімі краінамі. У пачатку ХХ ст. царызм пад націскам рэвалюцыйнага руху і патрэб эканамічнага развіцця ажыццявіў шэраг захадаў у вырашэнні пытанняў адукацыі. Аднак значных поспехаў у ліквідацыі непісьменнасці дасягнуць не ўдалося.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны захоўвалася адставанне ўсёй Беларусі ад цэнтральных губерняў Расійскай імперыі і па ахопу навучання дзяцей. У 1911 г. у Гродзенскай губерні пачатковай адукацыяй былі ахоплены толькі 25,5% дзяцей ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў. У той жа час у цэнтральных губернях гэты паказчык дасягаў 40% [1]. У 1913 г. у Гродзенскай губерні налічвалася 26 сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных установаў, дзе было 7,5 тыс. школьнікаў, у Віленскай – адпаведна 5 і 3,5 тыс. вучняў. А агульная колькасць школ усіх тыпаў у Гродзенскай губерні складала ў 1913 г. лічбу 2528, у Віленскай – 1086. У іх займаліся адпаведна 199 і 63 тыс. вучняў. Аднак тагачасная школьная сетка не забяспечвала ў дастатковай меры патрэбы сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця заходнебеларускіх зямель. Адсутнічалі вышэйшыя навучальныя ўстановы, што негатыўна адбівалася на становішчы асветы.

Існуючая сістэма ўстаноў адукацыі спрыяла русіфікацыі гэтых зямель. Асноўным тыпам нацыянальных школ былі рускія. Беларуская мова не была ўключана нават у вучэбныя праграмы, навучанне на ёй забаранялася. Аднак закрытыя пасля рэвалюцыі 1905-1907 гадоў нешматлікія беларускія школы працягвалі працаваць нелегальна. Адсутнасць легальных беларускіх школ напярэдадні Першай сусветнай вайны з’яўлялася вынікам каланіяльнай палітыкі царызма.

Падзеі Першай сусветнай вайны ўнеслі значныя змены ў стан адукацыі ў заходняй частцы Беларусі. Па-першае, дзейнасць навучальных установаў была моцна дэзарганізавана. Некаторыя з іх былі эвакуіраваны на

ўсход, іншыя з-за разбурэнняў, адсутнасці фінансавых сродкаў, галечы насельніцтва, мабілізацыі настаўнікаў – закрыты. Па-другое, пасля акупацыі нямецкімі войскамі восенню 1915 г. Заходняй Беларусі там з’явілася магчымасць для стварэння беларускіх школ. Менавіта часовае аслабленне русіфікатарскага ўплыву і адносная лаяльнасць нямецкіх акупацыйных улад дазволілі нешматлікай беларускай інтэлігенцыі распачаць працу ў гэтым напрамку. Аднак нязначныя ўступкі ў школьным пытанні ніколькі не змянілі каланіяльнай сутнасці нямецкага акупацыйнага рэжыму.

Пры садзейнічанні школьнай камісіі Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, у складзе якой былі І. і А. Луцкевічы, Б. Пачобка, Цётка (А. Пашкевіч), В. Ластоўскі і іншыя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі, 13 лістапада 1915 г. у Вільні была адкрыта першая беларуская пачатковая навучальная ўстанова. Пасля выдання нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў пачатку 1916 г. дырэктыў і інструкцый адносна арганізацыі адукацыі стварэнне беларускіх школ паскорылася. У 1916 г. былі адкрыты новыя школы ў Вільні, Гродзенскім, Лідскім і іншых паветах [2]. За час кайзераўскай акупацыі (да канца 1918 г.) было адкрыта, згодна з рознымі крыніцамі, ад 153 да 350 беларускіх школ [3].

Станаўленне беларускай нацыянальнай школы суправаджалася вялікімі цяжкасцямі: фінансавымі, вучэбна-метадычнымі, недахопам настаўнікаў. Справа абцяжарвалася і нізкім узроўнем нацыянальнай свядомасці беларусаў, што было вынікам неспрыяльных умоў сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту папярэдніх стагоддзяў. Адкрыццю беларускіх школ супраціўляліся польскія памешчыкі, каталіцкае духавенства.

Нягледзячы на ўсе гэтыя аб’ектыўныя і суб’ектыўныя перашкоды, нацыянальная інтэлігенцыя настойліва займалася пытаннямі адукацыі. Былі арганізаваны беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні, з канца 1916 г. пачала працаваць беларуская настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы (за 2 гады яе існавання было падрыхтавана каля 150 педагогаў). Там ажыццяўлялася распрацоўка вучэбна-метадычнага забеспячэння.

Пазіцыя беларускай нацыянальнай школы ў краі паступова ўмацоўвалася. Станоўча на гэта паўплывалі абвяшчэнне і дзейнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. Менавіта праца Народнага Сакратарыята і Рады БНР у галіне развіцця нацыянальнай культуры набыла ў 1918 г. характар сапраўднай дзяржаўнай палітыкі і садзейнічала пашырэнню свядомасці насельніцтва [4].

Пасля эвакуацыі ў снежні 1918 г. нямецкіх войск на заходнебеларускіх землях заставалася складаная ваенна-палітычная сітуацыя. У асобных мясцовасцях часта мяняліся ўлады, што не спрыяла

разгортванню сеткі школ. Аднак спробы выправіць становішча ўсё ж рабіліся. Непрацяглы час частка Віленшчыны і Гродзеншчыны ўваходзіла ў склад Літоўска-Беларускай ССР, урад якой прыняў 21 сакавіка 1919 г. пастанову аб раўнапраўі моў. Гэта давала магчымасць выкладаць у школах і на беларускай мове. Быў прыняты таксама дэкрэт “Аб рэарганізацыі школьнай справы”, у аснову якога быў пакладзены прынцып стварэння ўсеагульнай, бясплатнай, адзінай працоўнай школы на роднай мове.

На практыцы згаданая рэарганізацыя праходзіла марудна. Большасць дзяцей школьнага ўзросту ў Навагрудскім, Дзісенскім, Пінскім і іншых заходнебеларускіх паветах не наведвала школы. Тлумачыцца гэта найперш цяжкасцямі ваеннага часу, нізкім узроўнем жыцця мясцовага насельніцтва. “Знайсці патрэбныя памяшканні для школ немагчыма. Жыхары, якія вярнуліся, самі туляцца ў зямлянках”, – дакладваў кіраўнік Навагрудскага аддзела адукацыі ва ўрад Літоўска-Беларускай ССР [5].

Намаганнямі дзеячаў Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны 1 лютага 1919 г. пачаліся заняткі ў Віленскай беларускай гімназіі. Заснавальнікам гімназіі быў І. Луцкевіч. Нават хвароба не перашкаджала яму займацца арганізацыйнай і выкладчыцкай справай. Смерць І. Луцкевіча (20 жніўня 1919 г.) была вялікім маральным ударам для настаўнікаў і гімназістаў. Прыватны характар гімназіі прымушаў яе першага дырэктара М. Кахановіча пастаянна клапаціцца пра фінансаванне. Матэрыяльныя цяжкасці не палохалі педагогаў – яны самааддана вучылі і выхоўвалі дзяцей.

У гэты час галоўную небяспеку для існавання беларускіх школ пачала ўяўляць польская акупацыя. Новыя ўлады ігнаравалі імкненне беларускага насельніцтва да школы на роднай мове. Напрыклад, ніводная з заяў на адкрыццё беларускіх школ, складзеных летам 1919 г. у Гродзенскім павеце, так і не была задаволена. Існуючыя школы закрываліся ці вымушаны былі працаваць падпольна. Па загаду школьнага інспектара Віленскай акругі была закрыта беларуская гімназія ў Будславе (адкрыта яшчэ ў пачатку 1918 г.), а яе будынак перададзены польскай. На петыцыю пратэсту, падпісаную сялянамі навакольных вёсак, быў дадзены адмоўны адказ. У снежні 1919 г. у Віленскай акрузе засталося толькі 12 пачатковых школ, у Брэсцкай – ужо ніводнай. Дазвалялася існаванне беларускіх школ толькі на Міншчыне – іх там налічвалася 150 [6].

З устанаўленнем акупацыйнага рэжыму польскія ўлады паступова распрацоўвалі асноўныя напрамкі школьнай палітыкі. На заходнебеларускія землі фармальна распаўсюдзілася дзеянне дэкрэта “Аб школьных абавязках” ад 7 лютага 1919 г. Згодна з часовым распараджэннем генеральнага камісара ўсходніх зямель Е. Івашкевіча ад

11 кастрычніка 1919 г., быццам была гарантавана свабода навучання на роднай мове нацыянальных груп насельніцтва. З 1-га класа ў сярэдніх школах уводзіліся 2 гадзіны польскай мовы, прадугледжавалася дапамога найперш тым школам, якія карысталіся афіцыйнымі праграмамі, абавязковасць выкладання рэлігіі на роднай мове вучняў [7]. Аднак была пастаўлена пад сумненне дзяржаўная дапамога беларускім школам – яе можна было атрымаць тады, калі мова выкладання з’яўлялася роднай для больш 2/3 усіх вучняў. Падтрымаць абяцалі толькі ў выпадку “прыхільнай ацэнкі працы з боку дзяржаўнай адміністрацыі” [8]. Лёс беларускіх школ аказаўся ў поўнай залежнасці ад волі польскай адміністрацыі. Толькі ў верасні-лістападзе 1920 г. было ліквідавана каля 200 беларускіх пачатковых школ. Яны знікалі не столькі з-за матэрыяльных цяжкасцей, недахопу настаўнікаў, колькі з-за мэтанакіраваных дзеянняў польскай адміністрацыі. Беларуская мова не была дазволена ў школьным навучанні ў шэрагу паветаў: Гродзенскім, Лідскім, Ваўкавыскім, Беластоцкім, Бельскім, Сакольскім і іншых.

Дзеячы беларускага руху імкнуліся выкарыстаць нават такія неспрыяльныя ўмовы для пашырэння культурна-асветніцкай працы. Нацыянальныя інтарэсы адстойвалі рэгіянальныя, павятовыя і валасныя школьныя рады, якія стваралі беларускія гурткі, хаты-чытальні, распаўсюджвалі літаратуру. Яны былі аб’яднаны ў канцы 1919 г. у Цэнтральную беларускую школьную раду.

Адначасова працягвалася праца па распрацоўцы вучэбна-метадычнага забеспячэння. Былі выдадзены “Праграмы беларускай пачатковай школы”. “Абудзіць масы народа ад застою, заклікаць іх да разумнага грамадзянскага жыцця, да культурнай творчасці можа толькі нацыянальная школа, – падкрэслівалася там. – Беларускаму народу патрэбна свая, нацыянальная школа. ... Асноваю нацыянальнай школы служыць родная мова” [9]. Прынцып адзінай працоўнай школы абвяшчаўся вызначальным у вучэбна-выхаваўчым працэсе.

З канца 1920 г. адносна спрыяльныя ўмовы для пашырэння сеткі беларускіх школ з’явіліся на Віленшчыне, якая пасля захопу войскамі генерала Л. Жэлігоўскага ўвайшла ў склад залежнага ад Польшчы дзяржаўнага ўтварэння – Сярэдняй Літвы. Новым уладам трэба было заручыцца падтрымкай беларускіх дзеячаў напярэдадні плануемага плебісцыта аб дзяржаўнай прыналежнасці згаданай тэрыторыі. Тыя вырашылі выкарыстаць гэта для адкрыцця новых школ, разгортвання культурна-асветніцкай працы. Б. Тарашкевіч згадзіўся ўзначаліць аддзел беларускіх школ пры дэпартаменце асветы. Ужо за першыя месяцы яго дзейнасці было зроблена нямала: у студзені 1921 г. існавала 121

беларуская пачатковая школа [10]. Была таксама адкрыта беларуская настаўніцкая семінарыя ў мястэчку Баруны Ашмянскага павета, дырэктарам якой стаў С. Рак-Міхайлоўскі.

Паступова пераўтваралася ў сапраўды нацыянальную Віленская беларуская гімназія. Спачатку там выкладаліся па-беларуску ўсе прадметы толькі ў падрыхтоўчым, 1-4-м класах. Старшакласнікі вывучалі дысцыпліны, акрамя беларускай літаратуры, гісторыі і геаграфіі Беларусі, на рускай мове. Аднак ужо на пасяджэнні педагагічнай рады 25 красавіка 1920 г. закранался пытанне аб тым, што “гімназія павінна стаць чыста беларускай па духу, мове і падручніках” [11]. Пераходу на беларускамоўнае выкладанне спрыяў прыток дзяцей-беларусаў, якія складалі большасць сярод вучняў.

Дзякуючы працы прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі колькасць беларускіх школ паступова павялічвалася. У 1920/21 навучальным годзе іх налічвалася ў Заходняй Беларусі не менш 359 (асобныя польскія крыніцы лічбу беларускіх школ павялічваюць да 514) [12]. І гэта ў абставінах, якія былі далёкія ад аптымальных.

Напярэдадні заключэння Рыжскага мірнага дагавору Заходняя Беларусь мела менш разгалінаваную сетку навучальных устаноў, чым польскія землі. Калі ў цэлым па Польшчы ў 1920/21 навучальным годзе на 100 кв. км прыходзілася каля 7 школ, на 1 тыс. жыхароў – амаль 117 вучняў, то ў створаных пазней Навагрудскім ваяводстве адпаведна каля 3 і 50, Палескім – менш 1 і 30 [13]. У некаторых паветах Палескага ваяводства колькасць школ была мізэрная. Усё гэта давала магчымасць польскім уладам выканаць тут цывілізатарскую місію – разгарнуць сетку навучальных устаноў, павесці барацьбу з непісьменнасцю.

Такім чынам, Першая сусветная вайна аказала разбуральнае ўздзеянне на сфарміраваную раней сетку навучальных устаноў, якая не задавальняла ні адукацыйныя, ні нацыянальна-культурныя інтарэсы карэннага насельніцтва Заходняй Беларусі. У даволі складаных абставінах ішло станаўленне беларускай нацыянальнай школы. Гэты працэс стрымліваўся нерэалізаванасцю ідэі стварэння ўласнай дзяржавы, польскай акупацыяй. Ужо з самага пачатку польскага акупацыйнага рэжыму ажыццяўляўся наступ на беларускія школы. Хоць яшчэ не былі падрабязна распрацаваны асноўныя напрамкі школьнай палітыкі, але адразу вызначыўся курс насаджэння менавіта польскіх школ. Гэта якраз укладвалася ў планы кіруючых колаў Польшчы хутчэй пераўтварыць заходнебеларускія землі ў каланіяльны прыдатак сваёй краіны.

# РАЗДЗЕЛ II. БЕЛАРУСКАЯ АСВЕТА Ў 1920-я ГАДЫ

## Глава 1. Палітыка польскіх уладаў у галіне адукацыі

На момант уключэння Заходняй Беларусі ў склад Польшчы урад гэтай краіны ўзяў на сябе абавязацельствы аб забеспячэнні няпольскага насельніцтва правамі і свабодамі ў галіне нацыянальна-культурнага жыцця. Згодна з умовамі Рыжскага мірнага дагавору ад 18 сакавіка 1921 г., польскі бок дэклараваў свабоднае развіццё культуры, выкананне рэлігійных абрадаў, карыстанне роднай мовай. “Асобы рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасці ў Польшчы маюць права ў межах унутранага заканадаўства карыстацца сваёй роднай мовай, арганізоўваць і падтрымліваць свае школы, развіваць сваю культуру і ствараць для гэтага таварыствы і саюзы” [1]. Гэта поўнасцю адпавядала палажэнням Версальскага трактату, да якога Польшча далучылася 28 чэрвеня 1919 г. Канстытуцыя Польшчы 1921 г. абвяшчала абавязковасць пачатковай адукацыі, бясплатнасць навучання ў дзяржаўных школах, стыпендыі для вучобы найбольш здольным і незаможным вучням у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Аднак у канстытуцыі адчуваўся адыход краіны ад ранейшых міжнародных абавязацельстваў. Адпаведныя артыкулы насілі чыста дэкларатыўны характар, утрымлівалі шэраг супярэчнасцей. Правы няпольскага насельніцтва павінны былі рэалізоўвацца паводле асобнага заканадаўства. Гэта паставіла пад сумненне гарантаваную дзяржаўную дапамогу для яго нацыянальных школ. Такая сітуацыя была выгаднай для польскага ўраду. Рабіўся выгляд, што быццам выконваюцца міжнародныя і двухбаковыя пагадненні, але гэта ніколькі не перашкаджала іх ігнараваць.

Нязначныя ўступкі беларусам Віленшчыны ў галіне адукацыі былі зроблены ў сувязі з неабходнасцю станоўчага вырашэння ўрадам Польшчы пытання аб канчатковым фарміраванні яе ўсходняй дзяржаўнай мяжы. Добрыя ўмовы існавалі да таго часу, пакуль у складзе Часовай кіруючай камісіі Сярэдняй Літвы былі В. Іваноўскі і Б. Тарашкевіч. Паводле рашэнняў, прынятых на І Усебеларускай канферэнцыі ў канцы верасня 1921 г. ў Празе, Б. Тарашкевіч вымушаны быў адмовіцца ад супрацоўніцтва з уладамі Сярэдняй Літвы. На фоне разгорнутай кампаніі за далучэнне да Польшчы пачалася ліквідацыя беларускай асветы. У выбарах у сейм Сярэдняй Літвы 8 студзеня 1922 г. прынялі ўдзел толькі 64,4% выбаршчыкаў. Большасць беларускага і літоўскага насельніцтва байкатавала выбары. У абставінах рэальнага супрацьстаяння палітыцы інкарпарацыі быў нанесены прэвентыўны ўдар па беларускіх арганізацыях

у Вільні. У ноч з 19 на 20 студзеня 1922 г. там былі праведзены вобыскі, арыштавана больш 30 дзеячаў (сярод іх – М. Гарэцкі, Л. Родзевіч і іншыя). Іх абвінавацілі ў "прыналежнасці да партыі камуністаў і арганізацыі тайных баявых дружын з мэтай замаху на дзяржаўную ўладу". Пасля турэмнага зняволення ў Лукішках арыштантаў з 4 на 5 лютага гвалтоўна дэпартавалі ў Літву.

Пасля прыняцця Віленскім сеймам 20 лютага 1922 г. рашэння аб далучэнні гэтага краю да Польшчы там узмацніўся наступ на беларускія школы. Была закрыта беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах. Таксама быў ліквідаваны аддзел беларускіх школ пры дэпартаменце асветы ў Вільні. Напярэдадні ўключэння Віленшчыны ў склад Польшчы ў сакавіку 1922 г. там заставалася каля 30 пачатковых школ, гімназія ў Вільні [2]. Калі ў канцы 1921 г. на Віленшчыне існавалі 178 дзяржаўных беларускіх пачатковых школ, то да 1924/25 навучальнага года іх засталося толькі 13 [3].

З далучэннем Віленскага краю да Польшчы завяршыўся працэс уніфікацыі кіравання сістэмай адукацыі ва ўсёй Заходняй Беларусі. Дэлегатура Палескай школьнай акругі, якая ўключала тэрыторыю Палескага і 3 паветаў (Баранавіцкага, Нясвіжскага, Стаўбцоўскага) Навагрудскага ваяводстваў, была перайменавана ў папячыцельства. Было створана таксама асобнае папячыцельства Віленскай школьнай акругі, якое ахоплівала Віленскае і большую частку Навагрудскага ваяводства.

Становішча беларускіх школ заставалася няпэўным. Закон "Аб адкрыцці і ўтрыманні грамадскіх пачатковых школ" ад 17 лютага 1922 г. гарантаваў дзяржаўную падтрымку толькі школам з польскай мовай навучання. Да сярэдзіны 1924 г. так і не былі распрацаваны канкрэтныя юрыдычныя дакументы аб стварэнні беларускіх школ.

Складаным было становішча ў культурна-этнічнай сферы жыцця беларусаў. Замест культурнага ўзаемадзеяння ў норму ўвайшоў уціск і гвалт супраць беларускай культуры і мовы. Такое жорсткае сутыкненне было непазбежным. Яно не магло спрыяць дыялогу культур. Не толькі сацыяльна-эканамічныя, але і палітычныя, канфесійныя, дэмаграфічныя, сацыяльна-псіхалагічныя і іншыя фактары прадвызначылі такі канфліктны характар польска-беларускіх міжкультурных адносін. У польскай грамадскай свядомасці быў пашыраны стэрэатып, што Беларусь – гэта этнаграфічны teren przejściowy, беларусы-католікі – палякі і г. д.

Польскія ўрады ў першай палове 1920-х гадоў праводзілі палітыку нацыянальнай асіміляцыі. Найперш гэта праявілася ў паскоранай і гвалтоўнай паланізацыі, што ажыццяўлялася польскай школай, каталіцкай

царквой, друкам, паліцэйска-адміністрацыйным апаратам, праз каланізацыю, агітацыйна-прапагандысцкую работу і г. д.

Польская адукацыя павінна была стаць адным з дзейсных фактараў асіміляцыі жыхароў Заходняй Беларусі. Менавіта гэта найперш улічвалася пры распрацоўцы асноўных напрамкаў школьнай палітыкі. На I Усеагульным з’ездзе Польскага таварыства апекі “крэсаў” у снежні 1923 г. было пацверджана, што дзяржаўная грамадская пачатковая і сярэдняя школа павінна быць польскай. Наданне статуса грамадскай установы для прыватных няпольскіх школ было пастаўлена ў прамую залежнасць ад іх “навуковага ўзроўню і лаяльных адносін да польскай дзяржаўнасці” [4]. Ідэолагі польскай палітычнай эліты (эндэкі) хоць і не адмаўлялі права на нацыянальна-культурнае жыццё няпольскага насельніцтва, але імкнуліся замацаваць за польскай адукацыяй манапольнае становішча і дзяржаўную падтрымку. “Асвета павінна праводзіцца ў польскім духу… Дзяржаўная адукацыя павінна быць польскай. Мясцовыя мовы могуць, безумоўна, стаць вучэбным прадметам, дапаможным сродкам пры навучанні…”. Пры гэтым неабходна было выканаць адказную і складаную місію – “даць мясцоваму насельніцтву ўзорную польскую школу, якая ўзроўнем навучання, культурнасцю выхавання і практычнай накіраванасцю прыцягнула б да сябе розныя нацыянальнасці і веравызнанні” [5]. І гэтыя школы меркавалася зрабіць шматлікімі і даступнымі.

У адносінах да існуючых беларускіх навучальных устаноў актыўна прымяняліся паліцэйска-адміністрацыйныя меры. Афіцыйнымі падставамі для ліквідацыі школ з’яўляліся нізкі ўзровень навучання і выхавання, слабая кваліфікацыя настаўнікаў і іх недахоп, невялікая колькасць вучняў і г. д. Знешне гэта выглядала быццам клопат пра павышэнне эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Беларуская нацыянальная школа, якая толькі перажывала стадыю свайго станаўлення, не магла паспяхова канкурыраваць з польскай, якая пры мэтанакіраванай дзяржаўнай падтрымцы пашырала пазіцыі ў Заходняй Беларусі. Менавіта польская школа павінна была стаць дзейсным фактарам асіміляцыі заходнебеларускага насельніцтва.

Адзін з лідэраў польскай эндэцыі С. Грабскі вырашэнне беларускага пытання бачыў толькі ў забеспячэнні культурных і гаспадарчых патрэб – дамагаўся развіцця польскай адукацыі, грамадскіх і асветніцкіх устаноў, павелічэння ў іх польскай інтэлігенцыі, правядзення меліярацыі для моцнай каланізацыі “усходніх крэсаў” [6]. Дапускаліся зусім неістотныя ўступкі няпольскаму насельніцтву ў культурна-асветніцкім жыцці. “Мясцовыя мовы могуць разглядацца як прадмет выкладання ці як дапаможны навучальны сродак” [7]. Асноўныя пазіцыі адносна школьнай

палітыкі былі выказаны і на ўжо згаданым І Усеагульным з'ездзе Польскага таварыства апекі "крэсаў" (8-9 снежня 1923 г.). "Нацыянальныя меншасці маюць права заснавання прыватных школ з уласнай мовай навучання. Атрыманне права для такіх школ павінна залежаць ад іх навуковага ўзроўню і лаяльных адносін да Польскай дзяржавы. Школа павінна стаць фактарам развіцця культуры на ўсходніх землях. Яна ім стане, калі будзе там працаваць настаўнік-паляк…" [8].

Частка польскай палітычнай эліты спрабавала давесці да кіруючых колаў іншыя пазіцыі па школьнай палітыцы ў адносінах да няпольскага насельніцтва. У прыватнасці, польскі публіцыст і грамадскі дзеяч Л. Васілеўскі прапаноўваў у супрацьвагу нацыянальна-культурнаму будаўніцтву ў Савецкай Беларусі ("Беларускаму П'емонту") разгарнуць шэраг адпаведных мерапрыемстваў на "усходніх крэсах": аздаравіць і рэарганізаваць беларускую адукацыю, аказаць дапамогу ў выдавецкай справе і г. д. "Шкодныя для дзяржавы імкненні меншасці трэба нейтралізаваць шляхам фарміравання адчування, што польская дзяржава запэўнівае лепшыя ўмовы існавання, чым гэта маглі зрабіць іншыя дзяржаўныя арганізмы" [9]. Л. Васілеўскі не прызнаваў планы польскіх нацыянал-дэмакратаў па фарсіраванай паланізацыі. Ён быў прыхільнікам дзяржаўнай асіміляцыі. Хоць стаўленне Л. Васілеўскага да інтарэсаў беларусаў не было прыязным, аднак ён усё-такі лічыў іх асобнай грамадскай супольнасцю, пазбаўленай нацыянальнай самасвядомасці. Таму прапаноўваў уладам Польшчы не падаўляць беларускія памкненні, а спаўна выкарыстаць іх для пашырэння ўплыву на ўсходзе. Гэта ўсё вынікала з прыярытэтнай задачы – захавання, забеспячэння незалежнасці ІІ Польскай рэспублікі. "Задачай польскай дзяржавы з'яўляецца дапамога беларусам у іх культурна-нацыянальным развіцці шляхам адпаведнай эканамічнай і школьнай палітыкі" [10].

Тым не менш рашучы наступ на беларускія школы прывёў да значнага змяншэння іх колькасці. У 1922/23 навучальным годзе налічвалася ўсяго 32 дзяржаўныя беларускія пачатковыя школы [11]. У некаторых мясцовасцях існавалі тайныя беларускія школы. Прыватных, акрамя некалькіх гімназій, наогул не было.

Важнае значэнне ў школьнай палітыцы польскіх улад займалі кадравыя і фінансавыя пытанні. Настаўнікі з Заходняй Беларусі перасяляліся ў цэнтральныя і заходнія ваяводствы Польшчы, іх пасады займалі мігранты, якія не з'яўляліся ўраджэнцамі гэтага краю. Для перападрыхтоўкі настаўнікаў былі створаны курсы ў Кракаве. У 1921/22 навучальным годзе іх скончылі 250 настаўнікаў (большасць з іх перад гэтым скончыла беларускія курсы ў Вільні), 1925/26 – 100, 1927/28 – 40

[12]. Пасля вучобы іх накіроўвалі па-за межы Заходняй Беларусі ў польскія школы. Ва ўмовах рэзкага скарачэння колькасці нацыянальных школ сярод беларускіх настаўнікаў расло беспрацоўе. І гэта ў той час, калі нават у польскіх школах у заходнебеларускіх паветах не хапала педагагічных кадраў.

Падрыхтоўка закона аб няпольскай адукацыі ажыццяўлялася без шырокага ўдзелу грамадскасці, парламентарыяў, у тым ліку беларускіх паслоў. Беларускі пасольскі клуб 21 ліпеня 1924 г. выказаў уласныя прапановы: выдзеліць дзяржаўныя асігнацыі на беларускія школы прапарцыянальна колькасці беларусаў у ІІ Польскай рэспубліцы; арганізаваць настаўніцкія семінарыі, курсы ў Вільні, Гродна, Навагрудку; стварыць сетку пачатковых школ у адпаведнасці з колькасцю беларускага насельніцтва; адкрыць кафедру беларусазнаўства ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя; перадаць кіраўніцтва нацыянальных школ беларускім дзеячам [13]. Аднак гэтыя прапановы не былі ўлічаны стваральнікамі новага школьнага заканадаўства.

Пад націскам нацыянальна-вызваленчага руху і для заспакаення еўрапейскай грамадскасці польскі сейм паспешна прыняў 31 ліпеня 1924 г. “Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей”. Меркавалася, што сістэма адукацыі “будзе выхоўваць дзяцей польскай і няпольскай нацыянальнасці добрымі грамадзянамі” дзяржавы. Паводле закона, у тых паветах, дзе пражывала не менш 25% беларускага насельніцтва, можна было адкрыць школу на роднай мове выкладання пры наяўнасці дэкларацый з подпісамі 40 бацькоў дзяцей. Закон замацаваў няроўнасць беларускай і польскай школ. Калі меліся 20 подпісаў за навучанне па-польску, то адкрывалася двухмоўная (польска-беларуская) школа. Указвалася, што пры наяўнасці ў адной акрузе і польскай, і беларускай школы трэба іх таксама аб’ядноўваць у двухмоўную.

Дзеянне закона распаўсюджвалася на тэрыторыю Палескага, Навагрудскага, Віленскага і 2 паветаў (Гродзенскага і Ваўкавыскага) Беластоцкага ваяводстваў. Значная частка беларусаў Беласточчыны была пазбаўлена права на адкрыццё нацыянальных школ. У школах з няпольскай мовай выкладання (не толькі дзяржаўных, але і прыватных) трэба было абавязкова вывучаць польскую мову, а таксама па-польску гісторыю і геаграфію краіны.

Закон распаўсюдзіў прынцып двухмоўнага выкладання на ўсю сістэму дзяржаўных агульнаадукацыйных школ: пачатковыя, сярэднія спецыяльныя, прафесійныя. Так была наўмысна выключана магчымасць стварэння за кошт дзяржавы беларускіх гімназій ці настаўніцкіх семінарый. Па жаданню бацькоў 150 вучняў-беларусаў існуючую

дзяржаўную сярэднюю школу з польскай мовай навучання можна было пераўтварыць толькі ў двухмоўную.

Польскія ўлады невыпадкова зрабілі стаўку на двухмоўныя школы – фармальна задаволілі нязначныя патрэбы няпольскага насельніцтва і аднaчасова ўзмацнілі асіміляцыю праз дзяржаўную сістэму навучальных устаноў. Таму і невыпадкова, што акцэнт на двухмоўе (утраквізацыю) і надалей быў асноўным у школьнай палітыцы польскіх улад.

Дзеячы заходнебеларускага руху адзначалі асімілятарскі характар закона яшчэ ў час яго прыняцця. У сваёй прамове ў сейме 9 ліпеня 1924 г. Б. Тарашкевіч падкрэсліваў, што закон не садзейнічаў далейшаму станаўленню беларускай адукацыі, бо ў двухмоўнай школе “навучанне адбываецца на польскай мове, а беларускія гадзіны – гэта гімнастыка, маляванне, гульні” [14].

Згаданы закон уступіў у дзеянне з 1 кастрычніка 1924 г., але не быў выпрацаваны канкрэтны механізм яго практычнай рэалізацыі. Было ўстаноўлена, што бацькі павінны падаць школьнаму інспектару павета дэкларацыі з подпісамі на адкрыццё новых школ тады, калі яны ўжо зацверджаны гмінай, старастам, суддзёй (натарыусам). Цэнтральныя польскія ўлады разглядалі 1924/1925 навучальны год як падрыхтоўчы перыяд для рэалізацыі на практыцы школьных законаў. І толькі 7 студзеня 1925 г. міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы выдала дадатковае распараджэнне. Заявы на беларускія школы трэба было падаваць да 31 снежня папярэдняга навучальнага года, на польскія – да 30 красавіка. Гэта азначала, што беларускія школы маглі адкрыцца не раней 1926/27 навучальнага года. Каб атрымаць дазвол на стварэнне польскай школы, дастаткова было правесці сход жыхароў гміны і падаць яго пратакол. Распараджэнне паставіла рэалізацыю закона ў поўную залежнасць ад волі польскай школьнай адміністрацыі. Створаная ў сакавіку 1925 г. секцыя палітычнага камітэта ўрада па справах усходніх ваяводстваў і нацыянальных меншасцей (яе ўзначальвалі С. Тугут, С. Грабскі) планавала на працягу 1925/1926 навучальнага года ажыццявіць шэраг мер на карысць беларускай асветы [15].

Мясцовыя ўлады, шавіністычна настроеныя польскія настаўнікі і школьныя інспектары паўсюдна перашкаджалі сялянам падаваць дэкларацыі аб адкрыцці беларускіх школ. Незацвярджэнні дэкларацый, запалохванні і ашуканствы бацькоў дзяцей, вобыскі, рэвізіі, арышты сялян сталі звычайнай з’явай.

Такія дзеянні знаходзілі адабрэнне з боку польскага ўраду. На нарадзе кіраўнікоў усходніх ваяводстваў Польшчы 19-20 кастрычніка 1925 г. міністр веравызнанняў і грамадскай асветы С. Грабскі заявіў:

“Існаванне беларускіх школ з’яўляецца выключэннем, нават і ў сувязі з вынікамі апытання” [16]. Гэта азначала, што беларускія пачатковыя школы і гімназіі трэба ліквідаваць.

Адначасова ішло адкрыццё новых польскіх школ. У 1925/26 навучальным годзе разам з ужо адкрытымі яны складалі ў Беластоцкім ваяводстве 99 %, Віленскім – 94,7%, Навагрудскім – 99,5%, Палескім – 98,6% ад агульнай колькасці школ. Абсалютную большасць у настаўніцкім корпусе складалі палякі. У снежні 1925 г. на Віленшчыне 324 настаўнікі працавалі там, дзе нарадзіліся, а 441 з’яўляўся выхадцам з цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Польшчы. У Навагрудскім і Палескім ваяводствах гэтыя суадносіны былі адпаведна 241 (568) і 110 (420) настаўнікаў [17]. Гэта было састаўной часткай каланізацыйнай палітыкі Польскай дзяржавы адносна Заходняй Беларусі. Такі падыход да кадравых пытанняў у галіне адукацыі набыў доўгатэрміновую арыентацыю, бо большасць перасяленцаў мела ўзрост 20-29 гадоў.

Безумоўна, матэрыяльныя ўмовы іх працы не заўсёды вызначаліся высокім узроўнем. Аднак частка польскіх кадраў ехала на “усходнія крэсы” для выканання ідэалагічных функцый. Былі сярод іх і такія, каго высылалі туды за праступкі, невялікую прафесійную кваліфікацыю і пазбыліся часова іх прысутнасці. Вялікай карысці ад такіх “спецыялістаў” нельга было чакаць. Майскі (1926 г.) дзяржаўны пераварот у Польшчы не ўнёс кардынальных зрухаў у вырашэнне праблем беларускай адукацыі. Ужо 18 жніўня 1926 г. на пасяджэнні ўрада была прынята праграма адносін да нацыянальных меншасцей у Польшчы. Галоўным напрамкам рэжыму “санацыі” у нацыянальным пытанні стала палітыка дзяржаўнай асіміляцыі меншасцей. Польская мова павінна была стаць пануючай ва ўсіх дзяржаўных установах, органах самакіравання, школах. Было прапанавана наогул перагледзець закон ад 31 ліпеня 1924 г., каб адмяніць працэдуру складвання і падачы дэкларацый на адкрыццё няпольскіх школ. Адносна перспектывы нацыянальнай школы беларусаў кіраўнік Польскай дзяржавы Ю. Пілсудскі выказаўся так: “...Іх мова такая цяжкая і нераспрацаваная, што не можа быць мовай школы і ўстаноў”. Самай зневажальнай была ацэнка беларускай інтэлігенцыі: “...Нешматлікая, яе маральная і інтэлектуальная вартасць вельмі нізкая” [18].

На канферэнцыі папячыцеляў школьных акруг у Варшаве 22-24 чэрвеня 1927 г. падкрэслівалася, што адукацыйная сістэма набыла не толькі агульнаграмадзянскае, але выключна палітычнае значэнне. Ізноў быў пацверджаны акцэнт на двухмоўе (утраквізацыю) школ. Адзначалася таксама, што ўсе існуючыя прыватныя школы павінны былі паступова знікнуць ва ўмовах наўмыснага абмежавання іх працы з боку дзяржавы.

"Прыватная адукацыя законам дазволена, аднак мы павінны дзяржаўную асвету так арганізаваць якасна і колькасна, каб грамадская школа стала патрэбай, а прыватная – лішкам" [19].

Дзеля аслаблення ўплыву рэвалюцыйна-дэмакратычных і хрысціянска-дэмакратычных сіл Заходняй Беларусі група паслоў і сенатараў Віленшчыны і Навагрудчыны, якая была палітычна ангажавана ў Беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам, выступіла летам 1928 г. з шэрагам патрабаванняў у галіне асветы і культуры беларусаў: заснавання дзяржаўнай беларускай настаўніцкай семінарыі ў Вільні, надання статуса дзяржаўных установаў беларускім гімназіям, аказання ім фінансавай дапамогі, стварэння школьнага самакіравання ў заходнебеларускіх ваяводствах і г. д. [20]. Аднак сапраўднай мэтай такіх захадаў было не далейшае развіццё беларускай асветы, а спроба перацягнуць на свой бок памяркоўную частку інтэлігенцыі. Не адмаўляўся асноўны напрамак дзейнасці "крэсавай" адміністрацыі – на паланізацыю беларускай адукацыі.

У адрозненне ад польскіх урадаў 1919-1925 гадоў рэжым "санацыі" разам з рэпрэсіямі шырока выкарыстоўваў розныя абяцанні, уступкі. У 1928 г. выпускнікі Віленскай беларускай гімназіі атрымалі магчымасць здаваць экзамены на атэстат сталасці ("матуру"), што дазволіла ім паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Польшчы. Быў адкрыты інтэрнат для навучэнцаў беларускай гімназіі ў Навагрудку, яна атрымала правы грамадскай сярэдняй школы. Аказвалася дапамога беларускім настаўніцкім курсам у Радашковічах, якія працавалі ў час летніх канікул у 1926-1928 гадах. Былі арганізаваны для настаўнікаў пачатковых школ 3-тыднёвыя курсы па беларускай мове. У 1927 г. яны праводзіліся ў Лідзе, Нясвіжы, Свянцянах, у 1928 г. – у Пружанах, Слоніме, Нясвіжы, Гродна, у 1929 г. – зноў у Пружанах і Гродна, у 1930 г. – апошнія курсы – таксама ў Пружанах. Было наладжана некалькі канферэнцый, прысвечаных праграмам беларускіх школ, падручнікам. Беларуская мова стала вучэбным прадметам у Віленскай праваслаўнай семінарыі. Беларуская мова была таксама ўключана ў навучальныя праграмы ў настаўніцкіх семінарыях у Троках, Вільні (мужчынскай і жаночай), Шчучыне, Барунах, Слоніме, Нясвіжы. На гуманістычным факультэце Віленскага універсітэта быў уведзены лекцыйны курс беларускай мовы.

Адначасова ў некаторых мясцовасцях Заходняй Беларусі былі адкрыты, паводле складзеных раней дэкларацый, беларускія і польска-беларускія школы. У 1927/28 навучальным годзе ўсяго налічваліся 23 дзяржаўныя беларускія пачатковыя школы, 49 польска-беларускіх [21]. З прыватных існавалі яшчэ 2 беларускія пачатковыя, 4 сярэднія школы

(Віленская, Клецкая, Навагрудская, Радашковіцкая). Усяго разам яны складалі мізэрную долю ў агульнай колькасці навучальных устаноў у Заходняй Беларусі. У наступным навучальным годзе былі адкрыты некалькі двухмоўных школ, іх лік дасягнуў 52. Аднак усе гэтыя нязначныя меры не змянілі становішча беларускай нацыянальнай школы. Польскія ўлады наўмысна змяншалі колькасць дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ, выкарыстоўваючы на поўную моц адміністрацыйна-паліцэйскі апарат, бюракратычную валакіту. Паводле афіцыйных звестак, якія істотна адрозніваюцца ад статыстыкі ТБШ, было складзена на пачатак 1929/30 навучальнага году ўсяго 4939 дэкларацый. Адразу былі адхілены ад разгляду па шэрагу прычын 2256 дэкларацый. З астатніх 2683 былі прызначаны несапраўднымі 883. Асноўнымі “прэтэнзіямі” з’яўляліся наступныя: уключэнне дзяцей, што не мелі школьнага ўзросту, адкліканне заяў, адсутнасць подпісаў, польскага грамадзянства і г. д. І нават з уцалелых 1800 дэкларацый 1307, што датычыліся змены мовы выкладання ў школах, так і не былі рэалізаваны на практыцы [22]. Жаданне беларускіх сялян мець школы на роднай мове фактычна не было задаволена.

Згаданыя ўступкі былі зроблены “санацыйным” урадам пад уздзеяннем найвышэйшага пад’ёму нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў час дзейнасці Грамады. Яны з’яўляліся тактычным манёўрам у ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі ў адносінах да беларусаў і не змянілі яе сутнасці, характару.

Адыход рэжыму “санацыі” ад лавіравання да поўнай ліквідацыі беларускіх школ яскрава намеціўся з канца 1920-х гадоў. У 1929 г. была закрыта Радашковіцкая беларуская гімназія. Улады спасылаліся на яе блізкае размяшчэнне каля мяжы з БССР, нізкі ўзровень навучання, непапулярнасць сярод мясцовых жыхароў. І гэта тады, калі ў гімназіі вучылася найбольшая за ўсю яе гісторыю колькасць вучняў – 240 чалавек [23]. Пасол С. Мацкевіч, які належаў да прасанацыйнага Беспартыйнага блоку супрацоўніцтва з урадам, назваў гэтыя дзеянні “аздараўленнем беларускай сярэдняй адукацыі”. Паводле яго слоў, беларускія гімназіі мелі нізкі ўзровень навучання і выхавання, а слабейшыя з іх (меў на ўвазе Радашковіцкую), што доўгі час былі “месцам антыдзяржаўнай агітацыі, размяшчаліся блізка каля мяжы, атрымлівалі даволі “цёмныя” грошы з-за мяжы”, былі закрыты [24].

Аб намерах канчаткова знішчыць беларускія школы сведчаць і выступленні на нарадзе кіраўнікоў усходніх ваяводстваў у Луцку 2-3 снежня 1929 г. Віленскі ваявода У. Рачкевіч прама заявіў, што “імкненне беларусаў да нацыянальнай школы – небяспечнае”. Толькі навагрудскі ваявода З. Бечковіч лічыў неабходным рабіць уступкі беларусам у галіне

асветы, аднак “імкнуцца да саперніцтва лепшай польскай школы з горшай беларускай і так дабівацца павольнага знікнення апошняй” [25].

Уціску падвяргаліся не толькі беларускія, але і іншыя няпольскія школы. З існуючых у 1925 г. 256 літоўскіх школ да 1928 г. захаваліся толькі дзве [26]. Паланізатары вялі актыўны наступ на ўкраінскія школы. Да 1928/29 навучальнага года ў Палескім ваяводстве адсутнічалі як беларускія, так і ўкраінскія пачатковыя дзяржаўныя школы, хоць насельніцтвам былі пададзены шматлікія дэкларацыі на іх адкрыццё. Непрыязнае стаўленне праяўлялі польскія ўлады і да яўрэйскіх прыватных школ.

Дзеля аб’ектыўнасці неабходна адзначыць, што да канца 1920-х гг. польскія ўлады здолелі дасягнуць некаторых поспехаў у галіне адукацыі. Дзякуючы масаваму энтузіязму настаўнікаў і агульнаму патрыятычнаму ўздыму палякаў была адроджана польская асвета, пашырана сетка навучальных устаноў, распрацаваны змест адукацыі, заканадаўчая база, наладжана выданне падручнікаў, падрыхтоўка педагагічных кадраў. Найперш была адноўлена і пашырана сетка навучальных устаноў. З 1924/25 да 1926/27 навучальнага года колькасць вучняў пачатковых школ узрасла ў Віленскім ваяводстве з 96,7 да 118,4 тыс., Навагрудскім – з 76,6 да 89,9 тыс., Палескім – з 59,9 да 80,7 тыс. [27].

Аднак заходнебеларускія землі па-ранейшаму адставалі па асноўных паказчыках ад іншых рэгіёнаў тагачаснай Польскай дзяржавы. Даныя перапісу насельніцтва 1921 г. засведчылі, што на Палессі непісьменныя складалі 71%, на Віленшчыне – 58,3%, у Навагрудскім ваяводстве – 54,6% (пры сярэднім паказчыку ў Польшчы 33,1%). Тэмпы павелічэння колькасці пісьменных у 1920-я гады былі прыкладна такія, як і да Першай сусветнай вайны – каля 1,2% у год [28]. Гэта адсоўвала на працяглы час поўнае вырашэнне праблемы барацьбы з непісьменнасцю.

Адставанне назіралася і ў ахопленасці пачатковым навучаннем дзяцей школьнага ўзросту. У 1924/25 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве не вучыліся наогул 23% дзяцей, каля 50% наведвалі школу нерэгулярна. У Пінскім, Столінскім, Лунінецкім, Ваўкавыскім і іншых заходнебеларускіх паветах існавалі “бясшкольныя акругі”. Некаторыя тэрыторыі не былі ахоплены ніводнай школьнай акругай. У Пружанскім павеце такіх мясцовасцей было 13, Брэсцкім – 26 [29].

Павольна ішло развіццё сеткі польскіх школ менавіта ў вясковай мясцовасці. На заходнебеларускіх землях адкрывалі пераважна 1-класныя пачатковыя школы. У 1924/25 навучальным годзе з 1166 польскіх пачатковых дзяржаўных школ у Віленскім ваяводстве 832 (71,4%)

з’яўляліся 1-класнымі, толькі 30 – 7-класнымі. Школы 2-й і 3-й ступеняў былі прызначаны для дзяцей асаднікаў, чыноўнікаў, памешчыкаў.

Слабым было матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне існуючых пачатковых школ. Адчуваўся недахоп школьных будынкаў, фінансавых сродкаў. Быў уведзены наступны механізм фінансавання школ: 5% выдаткаў гарантавала дзяржава, іншыя пакрываліся гмінай, г. зн. непасрэдна падаткаплацельшчыкамі. З-за недахопу грошай большасць гмін скарачала расходы на адукацыю.

Нават існуючыя польскія пачатковыя школы не забяспечвалі высокі узровень навучання дзяцей. Многія вучні выходзілі з пачатковай школы малапісьменнымі. Распаўсюджаным было другагодніцтва. Немалым быў і адсеў вучняў. Матэрыяльныя цяжкасці, выкарыстанне дзяцей у хатняй гаспадарцы часта прымушалі бацькоў забіраць іх са школы. У Дубноўскай гміне Вілейскага павета ў 1926/27 навучальным годзе бацькі каля 300 дзяцей былі аштрафаваны за тое, што не пусцілі іх у школу [30]. Адсеў вучняў быў таксама з-за антысанітарных умоў навучання, хвароб, аддаленасці школ ад месца жыхарства дзяцей. У Заходняй Беларусі адсутнічалі школы для дзяцей з фізічнымі і разумовымі дэфектамі.

У 1927/28 навучальным годзе ў Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах працавалі 85 гімназій, дзе займаліся 17,8 тыс.вучняў [31]. У 1929/30 навучальным годзе там жа налічвалася 15 настаўніцкіх семінарый, дзе вучыліся 2258 чалавек. Аднак гэтага было недастаткова, каб поўнасцю забяспечыць існуючыя школы педагагічнымі кадрамі. Саслоўна-класавы характар сярэдняй і вышэйшай школы абмяжоўваў доступ туды дзецям беларускіх сялян. Дзеля прыкладу прывядзём звесткі са справаздачы Барунскай настаўніцкай семінарыі. Са 110 навучэнцаў у 2-х бацькі былі заможнымі сялянамі (валодалі больш 5 га зямлі). Хоць ва ўсіх навучэнцаў роднай мовай была пазначана польская, але па веравызнанню там былі католікі, праваслаўныя, уніяты.

Ва ўмовах тагачаснага нацыянальнага і сацыяльнага прыгнечання заходнебеларуская моладзь амаль не мела шансаў атрымаць вышэйшую адукацыю. Беларускія юнакі і дзяўчаты займалі мізэрную долю ў структуры студэнцкага кантынгента Польшчы. У адзінай у краі ВНУ – Віленскім універсітэце імя С. Баторыя – у 1920-я гады доля студэнтаў-беларусаў вагалася ў межах 1-2,8%. У 1921/22 акадэмічным годзе беларусы складалі 2,82% ад агульнага ліку студэнтаў універсітэта, у 1922/23 – 2,18%, 1923/24 – 1,63%, 1924/25 – 1,34%, 1925/26 – 1,04%, 1926/27 – 0,75%, 1927/28 – 1,15%, 1928/29 і 1929/30 – адпаведна па 1,79% [33]. Дадзеныя звесткі нельга лічыць дакладнымі, бо з 1927/28 года пазначалася ў анкетах не нацыянальная прыналежнасць студэнта, а яго

родная мова. Тым не менш, нават дадзеная статыстыка пацвярджае, наколькі крытычным было становішча беларусаў у галіне адукацыі. Незаможнае заходнебеларускае сялянства не мела магчымасці вучыць сваіх дзяцей у ВНУ Польскай дзяржавы.

У даволі складаных умовах знаходзілася асвета не толькі беларусаў, але і іншых этнічных супольнасцей (акрамя палякаў). Ва ўмовах паланізацыі рускаму насельніцтву таксама неабходна было захаваць нацыянальную школу, духоўную культуру, ствараць рускамоўную перыёдыку. Актыўную культурна-асветніцкую працу праводзіла Рускае дабрачыннае таварыства, створанае ў 1924 г. у Варшаве. У многіх гарадах Заходняй Беларусі ўзніклі яго філіялы, што ўтрымлівалі рускія школы, бібліятэкі, ажыццяўлялі асветніцтва. Пры мясцовых арганізацыях Рускага дабрачыннага таварыства ствараліся літаратурныя, тэатральныя гурткі і іншыя творчыя аб’яднанні. У Вільні ў пачатку 1920-х гг. функцыянаваў шэраг рускіх тэатральных калектываў – ансамбль сцэнічных дзеячаў, тэатр “Рэдута”, музычна-драматычны гурток і іншыя. Яны вылучаліся высокім прафесійным узроўнем. Польскія ўлады лаяльна адносіліся да гастроляў рускіх тэатраў, хоць і падрабязна фіксавалі маршруты іх паездак, кантралявалі рэпертуар.

У 1921 г. у Брэсце намаганнямі мясцовага аддзялення Рускага дабрачыннага таварыства была адкрыта руская гімназія. Аднак руская пачатковая школа і гімназія аказаліся безабароннымі перад свавольніцтвам польскіх улад. У 1928/29 навучальным годзе школьныя чыноўнікі запатрабавалі пад пагрозай закрыцця гімназіі займець уласны будынак. Дзякуючы маральнай і матэрыяльнай падтрымцы Рускага дабрачыннага таварыства, мясцовага рускага насельніцтва, праваслаўнай брацкай царквы, якая дала бясплатна участак зямлі, новы будынак гімназіі быў узведзены летам 1930 г.

Духоўныя патрэбы няпольскага насельніцтва толькі часткова задавальняліся прыватнымі школамі. Яўрэйскія школы ўтрымліваліся за кошт платы за вучобу, невялікіх субсідый магістратаў і ахвяраванняў яўрэйскага насельніцтва. Дапамога аказвалася таксама з-за мяжы. Нярэдка навучанне праводзілася ў непрыстасаваных памяшканнях. Адчуваўся недахоп падручнікаў. Так, у 8-класнай школе “Хайрэў” у Пінску на 120 вучняў у бібліятэцы было ўсяго 75 кніг [34]. Асветніцкая арганізацыя “Культур-Ліга”, што выступала за развіццё і распаўсюджванне яўрэйскай культуры ва ўсіх яе формах, паступова стварыла сетку сваіх аддзелаў па ўсёй Заходняй Беларусі. Да пачатку 1930-х гг. толькі ў Палескім ваяводстве налічвалася каля 30 аддзелаў “Культур-Лігі” [35].

Больш масавым з’яўлялася створанае ў 1921 г. “Аб’яднанне яўрэйскіх школ”, што займалася пачатковымі і сярэднімі навучальнымі ўстановамі для яўрэйскіх дзяцей на іўрыце. Ужо ў 1924 г. у Палескім ваяводстве дзейнічала яго 9 філіялаў [36]. Бунд аказваў уплыў на гэтыя арганізацыі. Рэгулярнымі ў іх працы сталі разнастайныя мерапрыемствы, лекцыі. Яны выступалі з ідэямі культурна-нацыянальнай аўтаноміі яўрэйскага насельніцтва.

Украінцы кампактна пражывалі ў паўднёвых паветах Палескага ваяводства. Разам з беларусамі яны актыўна адстойвалі свае нацыянальна-культурныя правы. У сакавіку 1923 г. польскія ўлады зарэгістравалі ў Брэсце ўкраінскае культурна-асветніцкае таварыства “Просвіта”. Фактычна гэта была рэгіянальная арганізацыя ўплывовай “Просвіты”, што дзейнічала ў Заходняй Украіне яшчэ з 1868 г. Яго мэтай з’яўлялася “развіццё асветы і ўздым культурнага становішча ўкраінскага насельніцтва Палесся”. Таварыства разгарнула шырокую дзейнасць: адкрыла бібліятэкі-чытальні, драмгурткі ў Брэсцкім, Кобрынскім і іншых паветах, арганізавала хор. Ажыўленне ўкраінскага культурна-асветніцкага руху на Палессі моцна напалохала польскія ўлады. Сведчанне таму – вытрымка са справаздачы Палескага ваяводскага ўпраўлення аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў чэрвені 1923 г.: “Акцыя ўкраінскіх дзеячаў супраць польскай пачатковай школы падтрымліваецца ўкраінскім насельніцтвам, у некаторых мясцовасцях падае на добрую глебу” [37]. Наступны дакумент – справаздача Корпуса аховы памежжа (ДОК-IX) за 1923 г. – таксама пацвярджае, што “Просвіта” стала рэальнай перашкодай на шляху паланізатараў: “…Акрамя бальшавіцкай агітацыі, на дадзенай тэрыторыі ўсё больш пашыраецца агітацыя з боку ўкраінскай арганізацыі “Просвіта” (украінскія самасційнікі), якія пад выглядам арганізацыі кааператываў аб’ядноўваюцца ў розных месцах тутэйшай акругі… Гэты рух больш небяспечны, чым бальшавізм, бо яго кіраўнікамі з’яўляюцца людзі інтэлігентныя, пераважна з вышэйшай адукацыяй. …Чым далей на поўдзень, тым мацней дзейнасць “Просвіты”…” [38]. У 1924 г. удалося адкрыць прыватную 7-класную ўкраінскую школу ў Брэсце. У адносінах да ўкраінскіх актывістаў прымяняўся паліцэйскі гвалт.

Уздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы паспрыяў арганізацыйнаму росту “Просвіты”. У 1928 г. існавала 112 гурткоў (1601 чалавек), у 1929 – 127 (1754 чалавекі) у Брэсцкім, Кобрынскім, Драгічынскім, Пінскім, Столінскім і Пружанскім паветах [39]. Патрабаванні аб адкрыцці ўкраінскіх школ былі праігнараваны польскімі ўладамі. Аднак удалося стварыць сетку бібліятэк-чытальняў “Просвіты” (у пачатку 1929 г. іх было 127), кааператываў, цэнтраў украінскай культуры.

Таксама распаўсюджваліся часопісы і газеты на ўкраінскай мове, наладжваліся тэатральныя пастаноўкі. Гурткі знаходзіліся пад уплывам Сельраба і іншых заходнеўкраінскіх палітычных партый.

Рэпрэсіўныя дзеянні ўлад падрывалі моц “Просвіты”. У 1930 г. ўцалелі толькі 79 гурткоў (1534 чалавекі), на наступны год – 56 (1031 чалавек) [40]. У 1933 г. былі ліквідаваны ўсе вясковыя бібліятэкі-чытальні “Просвіты” (засталася толькі 1 у Брэсце). Такі ж лёс напаткаў і гурткі – захаваліся толькі 2. З гэтага часу дзейнасць “Просвіты” у Палескім ваяводстве прыйшла ў заняпад. Крытычным было становішча адзінай украінскай школы ў Брэсце.

У той час, калі польская меншасць пры спрыянні дзяржавы не толькі актыўна пашырала, але і насаджвала сваю культуру няпольскаму насельніцтву, беларусы, яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы і іншыя этнічныя супольнасці не атрымалі магчымасцей для паўнапраўнага нацыянальна-культурнага развіцця.

У цэлым, адносіны польскіх улад да патрэб адукацыі насельніцтва Заходняй Беларусі знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад агульнай накіраванасці нацыянальнай палітыкі. Імкненне яго асіміляваць і прадвызначала тое, што тэндэнцыя да ліквідацыі беларускіх школ, якая выразна вылучылася ў 1919-1920 гадах, захавалася і пасля Рыжскага мірнага дагавору. Знішчэнне беларускіх школ стала адным са сродкаў барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам. Гэта вяло да таго, што пасля непрацяглага перыяду свайго станаўлення беларуская нацыянальная школа вымушана была змагацца за сваё існаванне. Спробы трактавання беларусаў як “этнаграфічнай масы”, якая вельмі падатлівая да паланізацыі, у 1920-я гады выглядалі анахранізмам. Менавіта таму яны і выклікалі адмоўную рэакцыю заходнебеларускага насельніцтва да Польскай дзяржавы.

## Глава 2. Першыя гады існавання Таварыства беларускай школы

Стварэнне ТБШ стала магчымым менавіта на Віленшчыне, дзе была сканцэнтравана нешматлікая беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. У новых геапалітычных умовах яна ізноў звярнулася да выпрабаванага раней шляху асветніцтва. Неабходна было захаваць саму ідэю пабудовы беларускай нацыянальнай школы, якая пачала ўжо ўвасабляцца на практыцы ў заходняй частцы Беларусі з часоў Першай сусветнай вайны. Аднак з самага пачатку польскай акупацыі ажыццяўляўся гвалтоўны

наступ на беларускую асвету. Толькі ў Віленскай акрузе са 153 беларускіх школ у пачатку 1920 г. засталося толькі 17 легальных і каля 40 тайных [1]. Таму для абароны нацыянальна-культурных правоў беларусаў была выкарыстана выгадная палітычная кан'юнктура – лаяльнасць улад марыянетачнай дзяржавы – Сярэдняй Літвы. У дэпартаменце асветы быў створаны аддзел беларускіх школ, загадчыкам якога стаў Б. Тарашкевіч. Хоць і сціплая, але аказвалася дапамога беларускім пачатковым школам.

Захады па ўмацаванню пазіцый нацыянальнай адукацыі рабіліся і з боку Беларускай школьнай рады ў Вільні. Найперш трэба было ўрэгуляваць прававое становішча сярэдніх школ, якія з'яўляліся прыватнымі, – Віленскай, Радашковіцкай беларускіх гімназій (адкрыццё апошняй рыхтавалася). На адным з пасяджэнняў Цэнтральнай беларускай школьнай Рады (22 лютага 1921 г.) была прынята наконт гэтага наступная пастанова: "... Стварыць спецыяльнае Таварыства беларускай школы, якому Школьная Рада перадасць свае паўнамоцтвы і маёмасць" [2]. На пашыраным сходзе Рады з удзелам прадстаўнікоў ад Беларускага цэнтральнага вучыцельскага саюза і іншых нацыянальных суполак у Вільні праз 4 дні – 26 лютага – быў адобраны праект статута ТБШ [3]. Дапрацаваны Б. Тарашкевічам статут ТБШ быў зацверджаны дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы 1 ліпеня 1921 г. У ім была абвешчана асноўная мэта Таварыства – "пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу". ТБШ мела права адкрываць, утрымліваць народныя школы, курсы для непісьменных дарослых, настаўніцкія семінарыі, школы выхавацеляў, чытальні-бібліятэкі, сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы. У кола яго абавязкаў уваходзіла таксама і адкрыццё народных дамоў, правядзенне лекцый і курсаў, выданне беларускіх падручнікаў, аказанне грашовай і вучэбна-метадычнай дапамогі нацыянальным школам і г. д.

Была строга размежавана кампетэнцыя кіруючых органаў – Цэнтральнай школьнай і Нагляднай радаў. Восенню 1921 г. старшынёй Цэнтральнай школьнай рады быў выбраны А. Смоліч, сакратаром – І. Краскоўскі. Пасля звальнення з працы ў дэпартаменце асветы Сярэдняй Літвы Б. Тарашкевіч стаў старшынёй, а А. Смоліч – сакратаром. Вясной 1922 года ў склад Цэнтральнай школьнай рады ўваходзілі таксама А. Луцкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Трэпка, М. Касцевіч, А. Станкевіч, П. Пліс, М. Кахановіч, П. Біндзюк, Нагляднай рады – П. Жаўрыд, Ф. Ярэміч, А. Райчонак [4]. Сярод пачынальнікаў Таварыства варта назваць А. Дмахоўскага, Ф. Аляхновіча, Я. Гаўрыліка і іншых прадстаўнікоў заходнебеларускай інтэлігенцыі. Найперш касцяк арганізацыі складалі настаўнікі з Віленшчыны і Навагрудчыны, выпускнікі

беларускіх гімназій. Значна ўзмацніла арганізацыю створанае ў снежні 1921 г. Б. Тарашкевічам ТБШ у Радашковічах.

Дзеячы Цэнтральнай школьнай рады разумелі неабходнасць паўсядзённай "чарнавой" працы на асветніцкай ніве. Пры дапамозе беларускага аддзела дэпартамента асветы былі наладжаны з 20 чэрвеня да 5 верасня 1921 г. курсы для настаўнікаў. Іх кіраўніком быў прызначаны С. Рак-Міхайлоўскі. Ужо на сваім першым пасяджэнні выкладчыкі Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, М. Гарэцкі, Ф. Аляхновіч, С. Кароль і іншыя абмяркоўвалі пытанні павышэння эфектыўнасці навучання. Сярод слухачоў былі і выпускнікі Віленскай беларускай гімназіі – Н. Арсеннева, А. Клімовіч і іншыя. 101 чалавек атрымаў пасведчанне з надпісам "Можна быць беларускім настаўнікам (настаўніцай)" [5]. Гэты факт абвяргае пазнейшыя сцвярджэнні польскіх улад, якія пры закрыцці беларускіх школ спасылаліся нярэдка на адсутнасць падрыхтаваных кадраў.

Намаганнямі інтэлігенцыі пазіцыі беларускай адукацыі на Віленшчыне паступова ўзмацняліся. Згодна з данымі дэпартамента асветы, у студзені 1922 г. у Сярэдняй Літве дзейнічала 178 беларускіх пачатковых школ, беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах, курсы для настаўнікаў, беларускія гімназіі ў Вільні і Радашковічах (апошняя насіла імя Ф. Скарыны) [6]. Паводле іншых звестак, ужо ў канцы 1920 г. іх налічвалася каля 140, а ўсяго ў Сярэдняй Літве было адкрыта 186 беларускіх школ [7]. Аднак пасля прыняцця рашэння аб далучэнні Віленшчыны да Польшчы пачаўся наступ на беларускую адукацыю: закрыта настаўніцкая семінарыя, ліквідаваны аддзел беларускіх школ пры дэпартаменце асветы, колькасць іх рэзка зменшылася.

Рашэнні І Усебеларускай канферэнцыі (Прага, верасень 1921 г.) арыентавалі заходнебеларускі рух на супраціўленне паланізацыі, што актывізавала працу Цэнтральнай школьнай рады. У кастрычніку 1921 г. яе дзеячы накіравалі міністру веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы мемарандум аб крытычным стане беларускай нацыянальнай школы. Хоць гэты зварот не задаволілі, але ён засведчыў, што арганізацыя імкнулася заявіць пра сябе як абаронца інтарэсаў беларусаў. Толькі тэрыторыя пашырэння яе ўплыву была нязначнай – Віленскі край. Вузкая сацыяльная база стрымлівала колькасны рост Таварыства.

Нягледзячы на цяжкасці і перашкоды, разам з іншымі арганізацыямі і ўстановамі Заходняй Беларусі ТБШ наладзіла кнігавыдавецкую справу. Гэта дазволіла часткова забяспечыць падручнікамі беларускія школы не толькі ў межах Польшчы, але і ў Латвіі, Літве. Сярод аўтараў былі пераважна настаўнікі беларускай гімназіі ў Вільні. Да сённяшняга часу не страцілі нацыянальнага каларыту "Гісторыя беларускай літаратуры",

"Хрэстаматыя беларускай літаратуры: XI век – 1905 год" М. Гарэцкага, чытанкі яго жонкі Л. Чарняўскай – "Родны край", "Геаграфія Беларусі" А. Смоліча і іншыя. Хоць падручнікаў, дапаможнікаў было недастаткова, але па іх вучылася, на іх выхоўвалася не адно пакаленне заходнебеларускай моладзі.

Заходнебеларускія дзеячы падтрымлівалі цесныя сувязі з нацыянальнымі цэнтрамі ў Латвіі. Старшыня ТБШ Б. Тарашкевіч у лісце ад 25 лютага 1922 г. рэкамендаваў беларускаму дзеячу К. Езавітаву ўладкаваць на працу на настаўніцкіх курсах у Дзвінску М. Гарэцкага і І. Красоўскага, якіх гвалтоўна вывезлі польскія ўлады разам з некаторымі іншымі "непажаданымі элементамі" на тэрыторыю Літвы. "Абодва настолькі вядомы сваёй педагагічнай, літаратурнай ды нават навуковай дзейнасцю, што даваць ім характарыстыку лічым непатрэбным". У тым жа лісце паведамлялася, што для беларускіх школ у Латвіі рыхтуецца выданне буквара А. Смоліч "Зорка". "Выданне будзе зусім новае, моцна папраўленае і дапоўненае масай ілюстрацый, пропісямі, практыкаваннямі і г. д. На жаль, складванне ідзе крыху марудна, бо не хапае буйных шрыфтаў і даводзіцца рабіць па старонцы" [8].

Пасля таго як кіраўнікі ТБШ – Б. Тарашкевіч, М. Кахановіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч – увайшлі ў склад Беларускага пасольскага клуба, адстойванне адукацыйных правоў было перанесена на парламенцкі ўзровень. Яшчэ 14 снежня 1922 года беларускія паслы і сенатары запатрабавалі ад польскага ўрада выканання шэрагу мер. У час свайго першага выступлення ў польскім сейме Б. Тарашкевіч абвінаваціў улады ў імкненні знішчыць беларускую асвету – састаўную частку нацыянальнай культуры. Сітуацыя сапраўды пагаршалася. З 514 беларускіх школ, якія існавалі ў 1919/1920 навучальным годзе на тых землях, якія адыйшлі па Рыжскаму дагавору да Польшчы, да 1922/1923 г. засталося толькі 32. У дэкларацыі, прынятай 23 студзеня 1923 г. з нагоды прадстаўлення прэм'ер-міністра У. Сікорскага, Беларускі пасольскі клуб да ўвядзення тэрытарыяльнай аўтаноміі з краёвым сеймам у Вільні дамагаўся культурна-асветніцкай аўтаноміі.

У час працы асобных секцый і камісій беларускія парламентарыі дамагаліся адкрыцця беларускай настаўніцкай семінарыі, курсаў, неадкладнага прыняцця спецыяльнага школьнага заканадаўства, допуску беларускай мовы ва ўстановы адукацыі. Звычайна станоўчага адказу не атрымоўвалі. Калі ж рашэнні усё-такі прымаліся, то пры дапамозе бюракратычнай валакіты ці сабатажу мясцовых улад знарок не выконваліся. С. Рак-Міхайлоўскі 15 сакавіка 1923 г. прадставіў у сейме праект адкрыцця дзяржаўнай настаўніцкай семінарыі з беларускай мовай

навучання, але яго не адобрылі ў сеймавых камісіях па адукацыі і бюджэту.

З уключэннем Віленшчыны ў склад Польшчы паўстала праблема аб'яднання ўсіх уцалелых нацыянальных школ на заходнебеларускіх землях. З гэтай нагоды і была прынята 29 студзеня 1923 г. на агульным сходзе ТБШ пастанова аб скліканні з'езда педагогаў беларускіх гімназій. Запланаваны з'езд адбыўся 11-14 красавіка 1923 г. у Вільні. Добрую палавіну ўдзельнікаў складалі віленчукі – выкладчыкі беларускай гімназіі, мясцовай праваслаўнай семінарыі, беларускія парламентарыі. Былі на з'ездзе і настаўнікі Радашковіцкай, Гарадоцкай, Навагрудскай і Нясвіжскай беларускіх гімназій.

У ходзе работы з'езда быў прыняты цэлы шэраг рэзалюцый. Па дакладу А. Луцкевіча была прынята адна з іх – "Аб аб'яднанні беларускіх сярэдніх школ". "З'езд прызнае патрэбным, каб усе беларускія сярэднія школы перайшлі ў рукі ТБШ, якое з'явіцца такім чынам гаспадаром названых школ у межах Польскай рэспублікі. Беларуская Цэнтральная школьная рада павінна ўзяць на сябе заступніцтва перад школьнымі і іншымі ўладамі за ўсе аб'яднаныя беларускія сярэднія школы, атрыманне канцэсій (дазволу – А.В.), зацвярджэнне ўладай дырэктараў, агульнае кіраўніцтва і кантроль за ўнутраным жыццём школ з навукова-педагагічнага боку, правядзенне беларусізацыі там, дзе яна дагэтуль поўнасцю не скончана" [9]. У адной з рэзалюцый падкрэслівалася, што "пры сучаснай ступені развіцця беларускай грамадскай свядомасці і культуры мэта беларускай школы – выхоўваць беларускага інтэлігента" [10]. Толькі пералік дакументаў – "Аб выданні перыядычнага часопіса па пытаннях беларускай школы і педагогікі", "Аб арганізацыі курсаў для педагогаў беларускіх сярэдніх школ", "Аб беларускай пачатковай школе", "Аб выхаванні вучняў", "Аб агульных метадах выкладання ў сярэдняй школе" (на прыкладзе асобных прадметаў) – сведчыць аб глыбокай заклапочанасці дэлегатаў якасцю навучання і выхавання.

Цікавасць уяўляе сумесны даклад А. Луцкевіча і М. Гарэцкага "Аб выкладанні гуманістыкі і аб месцы ў ёй беларусазнаўства", які лёг у аснову адпаведнай рэзалюцыі. Задачу гуманістыкі яны бачылі ў далучэнні вучняў да здабыткаў сусветнай культуры, найперш літаратуры. Шэдэўры сусветнай класікі прапаноўвалася вывучаць у арыгіналах, пры адсутнасці такой магчымасці – у беларускіх прыкладах. На іх думку, вывучэнне рускай літаратуры ва ўмовах, калі ішоў працэс пераўтварэння гімназій у сапраўды беларускія па мове, характару навучання і выхавання, было неабходным крокам да шляху пазнання каштоўнасцей сусветнай цывілізацыі. Вынікала гэта і з добрай забяспечанасці прадмета

рускамоўнымі тэкстамі. Пры гэтым дакладчыкі падкрэслівалі, што варта было “затрымліваецца толькі на характэрнейшых расійскіх творах і выкарыстаць гэты прадмет для азнаямлення з сусветнай літаратурай і ростам агульначалавечай культуры” [11].

Пэўную карысць можа аказаць сучаснаму ўдумліваму, неабыякаваму руплівцу-настаўніку кніга А. Луцкевіча “Як вучыць у новай школе? Увагі для вучыцеляў беларускіх сярэдніх школ”, якая была выдадзена напярэдадні з’езда. Кніга абагульняла вопыт тагачаснай педагогікі, многія яе палажэнні не страцілі актуальнасці. А. Луцкевіч лічыў, што на ўроку ў класе настаўнік павінен даць вучням запас ведаў, якія спатрэбяцца ім у наступным класе, навучыць самастойна думаць і ясна выказваць свае думкі. Выключная ўвага нададзена асобе настаўніка, яго маральнаму вобліку. Толькі добразычлівыя, паважлівыя, талерантныя адносіны да вучняў маглі прынесці аўтарытэт настаўніку. “Не адштурхоўвай ад сябе вучняў холадам, не імкніся паказаць сваю перавагу ці ўладу над імі”. Сумленнасць, праўдзівасць і іншыя станоўчыя этычныя катэгорыі прызнаваліся вызначальнымі ў наладжванні ўзаемаадносін паміж педагогам і вучнёўскім калектывам. Важным сродкам удасканалення педагагічнага майстэрства А. Луцкевіч прызнаваў самакрытыку. Невыпадкова, што ён без змен поўнасцю змясціў адпаведны раздзел з польскамоўнай кнігі Т. Солтысіка. Прыслухаемся да пытанняў, якія павінен пастаянна задаваць сабе настаўнік: “Ці заўсёды прыходзіў у клас адпаведна падрыхтаваны да лекцыі?”, “Ці ведаў прозвішчы вучняў?”, “Ці развіваў сваю дыдактычную тэхніку?”, “Ці заўсёды паказваў патрэбны педагагічны такт?”, “Ці вучні сапраўды мелі карысць з тваёй вучобы?” [12].

Сам факт правядзення I з’езда настаўнікаў беларускіх гімназій сведчыць аб тым, што нават у неспрыяльных умовах нацыянальна-культурнага ўціску на парадак дня ставіліся пытанні павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэта быў таксама крок для пашырэння аўтарытэту Таварыства па-за межамі Віленшчыны. Аднак з-за шэрагу прычын, найперш узмацнення націску з боку польскіх улад на беларускія школы і іх закрыцця, так і не давялося пазней склікаць такія з’езды.

Не маючы магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю ў Польшчы, заходнебеларуская моладзь нелегальна накіроўвалася на вучобу за мяжу. Ішлі юнакі і дзяўчаты праз “зялёную мяжу” на ўсход – у БССР, дзе ім дапамагалі паступіць у навучальныя установы. Усталяваліся кантакты віленчукоў з дзеячамі-адраджэнцамі ў Мінску. Пэўную падтрымку аказвала Бюро дапамогі КПЗБ. На адным з яго пасяджэнняў – 17 ліпеня

1924 г. – сярод іншых было прынята рашэнне пра браніраванне па лініі Наркамасветы да 50 месцаў у вышэйшых навучальных установах для моладзі з Заходняй Беларусі [13].

Траплялі выпускнікі заходнебеларускіх гімназій за ведамі і ў Чэхаславакію. Падтрымку ў гэтай справе аказвала Цэнтральная школьная рада, якая мела сувязі з беларускай палітычнай эміграцыяй у Празе. Звычайна патаемнымі сцежкамі пераходзілі ў Літву, а адтуль з дапамогай беларускіх дзеячаў у гэтай краіне накіроўваліся ўжо ў Чэхаславакію, дзе іх уладкаваннем займаўся прастаўнік Рады БНР М. Вяршынін. Былі і больш складаныя, небяспечныя шляхі – нелегальна прабіраліся цераз польскую мяжу, хаваліся ў лясах, пранікалі на цягнікі, знаходзілі знаёмых, дакументы. Вось як успамінаў свой прыгодніцкі шлях выпускнік Навагрудскай беларускай гімназіі Ю. Сак. “Разам з Клаўсуцем, Аляксандрам Сакам, Лаўскім, Бусько і Жуком прыбылі мы ў Вільню. Там нам дапамаглі аплаціць дарогу і накіравалі ў Літву. З Каўнаса мы паехалі цераз Гданьскі калідор у Берлін, а адтуль у Прагу. Вопраткі не было, выглядалі як батракі, замучаныя, галодныя…”.

Кіраўніцтва ТБШ было зацікаўлена ў тым, каб моладзь аддавала перавагу педагагічным спецыяльнасцям. Гэта магло б паспрыяць развіццю беларускіх школ непасрэдна ў Заходняй Беларусі. Вельмі патрэбны былі і свае кадры ў сельскагаспадарчай, лясной галінах. Многія студэнты выбіралі таксама тэхнічныя, медыцынскія спецыяльнасці. Атрымоўваючы рэкамендацыі і запэўніванні ў падтрымцы ад Цэнтральнай школьнай рады, яны нярэдка афармлялі распіскі-абавязацельствы. Вось тэкст адной з іх. “Я, ніжэйпадпісаны Янка Станкевіч, за пасланне мяне Цэнтральнай беларускай школьнай радай як стыпендыята ў вышэйшую чэшскую школу ў Празе абавязуюся:

1. Скончыўшы школу, вярнуцца працаваць на Бацькаўшчыну;
2. Паслаць за граніцу ў вышэйшыя школы за свой кошт і ўтрымліваць там аднаго матурыста-беларуса, прадстаўленага Цэнтральнай беларускай школьнай радай;
3. Напісаць і выдаць па сваёй спецыяльнасці кнігу на роднай мове;
4. У выпадку невыпаўнення гэтых пунктаў абавязуюся выплаціць Цэнтральнай беларускай школьнай радзе ўсю суму стыпендыі, атрыманай за час навукі ў Празе” [14].

Адбор кандыдатаў на вучобу быў даволі сур’ёзны. “Пасылаць трэба толькі нацыянальна свядомых кандыдатаў, узяўшы пісьмовае абавязацельства” [15]. Студэнт У. Жылка прасіў у адным з лістоў да А. Луцкевіча прыслаць “разумных, думаючых хлопцаў, чэсных і любячых, якія маглі б потым з гонарам заступіць Вас, старшых”. У цэлым студэнты-

беларусы падтрымлівалі праз перапіску цесны кантакт з асобнымі заходнебеларускімі дзеячамі.

Нягледзячы на сваю матэрыяльную нястачу, студэнты адрывалі ад сябе частку грошаў для патрэб нацыянальнай адукацыі. У снежні 1923 г. у Празе яны заснавалі Таварыства прыяцеляў беларускай школы. З-за абмежаваных магчымасцей было вырашана дапамагчы толькі нацыянальным школам у Заходняй Беларусі. Старшыня суполкі В. Грышкевіч адразу звярнуўся да Цэнтральнай школьнай рады з просьбай даслаць спіс існуючых беларускіх школ, дакладную інфармацыю пра іх стан. Сціплыя ахвяраванні студэнтаў аказвалі больш маральнае ўздзеянне і не маглі значна паправіць становішча беларускіх школ.

Паводле звестак студэнта М. Гарошкі, у міжваенны час у Празе вучылася каля 200 беларусаў [16]. Іншыя крыніцы падаюць значна большыя лічбы – у Пражскім універсітэце ў 1921/22 навучальным годзе было 10, 1922/23 – 50, 1923/24 – 90, 1924/25 – 110, 1925/26 – 100 студэнтаў-беларусаў [17].

Хоць і павольна, але павышаўся аўтарытэт ТБШ у заходнебеларускім грамадстве. Беларускія паслы і сенатары праводзілі шырокую растлумачальную працу ў заходнебеларускіх мястэчках і вёсках. Па ініцыятыве беларускіх дэпутатаў у 1923/24 навучальным годзе быў наладжаны ў многіх кутках Заходняй Беларусі байкот польскіх школ. Як сведчыць справазадача кіраўніка Палескага ваяводства за кастрычнік 1923 г., у большасці паветаў беларускае насельніцтва непрыхільна ставілася да польскіх школ.

“Хаджэнне ў народ” абуджала навучэнцаў. “Сярод школьнай моладзі праводзіцца агітацыя ў вельмі нацыянальным духу, існуе таксама небяспека стварэння скаўцкіх арганізацый як сярод вучняў пачатковых, так і старэйшых класаў, – адзначалася ў справаздачы ДОК-IX (Корпуса аховы сумежжа). – ... Сярод моладзі Баранавіцкага, Слонімскага, Навагрудскага паветаў праводзілася прапаганда за заснаванне такіх жа гімнастычных таварыстваў” [18]. У 1922-1923 гг. на Віленшчыне былі складзены 80 заяў аб адкрыцці беларускіх школ, у Навагрудскім і Беластоцкім ваяводствах – адпаведна 72 і 40 [19].

Працягвалася адстойванне нацыянальных інтарэсаў і непасрэдна з трыбуны польскага сейму. На працягу 1922-1924 гг. беларускія дэпутаты накіравалі польскаму ўраду 12 запытаў аб гвалце і ганеннях адносна беларускіх школ. У дэпутатаў не было ілюзій наконт таго, што “Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей” ад 31 ліпеня 1924 г. карэнным чынам зменіць становішча беларускіх школ. Ужо з моманту яго прыняцця яны выкрывалі яго асімілятарскі характар.

Аднак беларускія паслы выступілі за тэрміновае і дакладнае выкананне закона, які даваў хоць нейкія шансы. Толькі з 28 лістапада 1924 г. да 20 кастрычніка 1925 г. імі было складзена 49 запытаў аб грубых парушэннях школьнага заканадаўства.

Аналізуючы перыяд станаўлення ТБШ, трэба выдзеліць яго выключную прыхільнасць асветніцтву. Арганізацыя пазбягала выкарыстання радыкальных палітычных метадаў і сродкаў змагання. У адной са справаздач аддзела бяспекі Віленскага ваяводства адзначалася, што “у першыя гады існавання ТБШ не назіралася канкрэтных выпадкаў яго антыдзяржаўнай дзейнасці, акрамя той тактыкі, якой яно прытрымлівалася ў галіне асветы, так і ў Цэнтральнай радзе, на чале якой стаялі у асноўным дэпутаты Беларускага пасольскага клуба” [20]. Б. Тарашкевіч паступова прыйшоў да высновы, што неабходна было пераадолець малалікасць, інтэлігенцкі характар Таварыства і стварыць народную арганізацыю на аснове барацьбы за беларускую нацыянальную школу, выкарыстоўваючы падачу дэкларацый. Дзеля пашырэння ўплыву варта было школьную кампанію цесна звязаць са змаганнем супраць сацыяльнага прыгнёту.

Перспектывы пашырэння сацыяльнай базы Таварыства з’явіліся восенню 1924 г., калі на месцах актывізаваўся рух за складванне і падачу дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ. У новых абставінах на ТБШ ускладалася адказная задача – стаць каардынуючым органам школьнай кампаніі, паспрыяць яе развіццю. Хоць яшчэ заставаўся нераспрацаваным механізм увядзення згаданага закона ў дзеянне – растлумачальная запіска да яго была прынята міністэрствам веравызванняў і грамадскай асветы толькі 7 студзеня 1925 г., але складванне заяў пачалося паўсюдна ў заходнебеларускіх землях.

У сакавіку 1925 г. у Цэнтральнай школьнай радзе ў Вільні было зарэгістравана 6524 дэкларацыі аб навучанні 9520 дзяцей па-беларуску, якія бацькі падалі школьным інспектарам. Геаграфія पададзеных заяў была наступнай (у дужках прыводзіцца колькасць дзяцей). Найбольшая колькасць дэкларацый прыходзілася на Палескае ваяводства – усяго 2536 (3440), у тым ліку ў Пружанскім павеце – 1294 (1754), Косаўскім – 1159 (1568), Столінскім – 32 (40), Пінскім – 27 (40), Лунінецкім – 24 (38). Далей высокія паказчыкі адзначаны на Навагрудчыне – 1832 (2795) (Нясвіжскі павет – 570 (906), Навагрудскі – 565 (836), Слонімскі – 508 (772), Валожынскі – 94 (136), Лідскі – 55 (90), Баранавіцкі – 40 (55)). У Віленскім ваяводстве (1490 заяў (2288 дзяцей)) вылучаліся Віленскі і Дзісенскі паветы – адпаведна 592 (895) і 587 (988). У спісе фігуравалі таксама Дунілавіцкі (181 (197)), Свянцянскі (78 (1909)), Ашмянскі (52 (99)) паветы.

Цяга да нацыянальных школ назіралася ў беларускага насельніцтва Гродзенскага і Ваўкавыскага паветаў, што ўваходзілі ў склад Беластоцкага ваяводства – адпаведна 454 (671) і 212 (326) [21]. Нягледзячы на недакладнасць звестак, гэтыя паказчыкі сведчылі аб масавым руху ў абарону сваіх правоў. Нягледзячы на запалохванні, рэпрэсіўныя меры польскіх улад, людзі дамагаліся школ на роднай мове. Па звестках ТБШ, да канца 1925 г. было пададзена каля 15 тыс. дэкларацый [22].

У многіх мясцовасцях прыхільнікі Таварыства імкнуліся адкрыць беларускія прыватныя пачатковыя школы. Толькі ў студзені 1925 г. былі складзены дэкларацыі на адкрыццё 95 такіх школ, але беспаспяхова. Мясцовыя ўлады адмаўляліся зацвярджаць настаўнікаў, праследавалі іх. Вялікай актыўнасцю вылучалася арганізацыя ТБШ у Радашковічах.

Беларускі пасольскі клуб па-ранейшаму кантраляваў унутранае жыццё ў ТБШ. Выбары кіраўніцтва на агульным сходзе 14 снежня 1924 г. гэта пацвердзілі. У склад Цэнтральнай беларускай школьнай рады ўвайшлі Б. Тарашкевіч (старшыня), С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч (намеснік), В. Рагуля, П. Мятла. Пасол Ф. Ярэміч і сенатар А. Уласаў былі ўключаны ў Наглядную раду. Сярод кіраўніцтва Таварыства фігуравалі таксама прозвішчы Я. Шнаркевіча, І. Савіцкага, У. Манкевіча, Р. Астроўскага, М. Кепеля, А. Сакаловай, Я. Гаўрыліка, А. Трэпкі, М. Марцінчыка, Ф. Стэцкевіча і некаторых іншых [23]. Лёсам было наканавана ім разам выступаць супраць паланізацыі, за беларускую школу.

Польскія ўлады ажыццяўлялі наступ на беларускую асвету не толькі напрамую, але і “абходнымі манёўрамі”. Не без іх удзелу была створана ў верасні 1924 г. праўрадавая Беларуская часовая рада, якая на словах стаяла за непадзельную і суверэнную Беларусь, а на справе не ішла далей куцай культурна-нацыянальнай аўтаноміі ў межах Польшчы. Гэтае апазіцыйнае да Беларускага пасольскага клуба палітычнае аб’яднанне вырашыла забраць у свае рукі пытанні беларускай адукацыі з дапамогай уласнага таварыства “Прасвета”. На скліканым 18-19 снежня 1924 г. сходзе настаўнікаў была зроблена спроба перахапіць у ТБШ ініцыятыву і падначаліць сабе існуючыя школы. Пазней дзеячы “Прасветы” накіравалі польскаму ўраду спецыяльны ліст. Яны прасілі змяніць стаўленне да беларускіх школ, каб паспрыяць польскасці на “усходніх крэсах”, прапаноўвалі адкрыць найперш 300 беларускіх пачатковых школ (па 2 на гміну), некалькі гімназій і настаўніцкія курсы ў Вільні. Аўтары ліста абяцалі падбор кандыдатаў на настаўніцкія пасады, якія павінны зацвярджацца польскімі ўладамі з улікам “пасведчання маральнасці” [24]. Аднак польскія ўлады не спяшаліся рабіць нават мізэрныя ўступкі на карысць беларускай асветы.

Амбіцыі гэтай арганізацыі ўсур’ёз устрывожылі беларускіх дэпутатаў. На сваім сходзе 3 студзеня 1925 г. яны выкладалі прынцыповую пазіцыю: ніякіх уступак і кампрамісаў у школьнай справе. Было адназначна заяўлена, што існуючыя навучальныя ўстановы павінны кантраляваацца толькі Цэнтральнай школьнай радай у Вільні. Прызнавалася небяспечным, каб кіраўніцтва беларускай адукацыяй перайшло да палітычных авантурыстаў. Як паказаў далейшы ход падзей, Беларуская часовая рада так і не змагла рэалізаваць свае вялікія прэтэнзіі.

Кіраўніцтву ТБШ даводзілася аператыўна, хоць і не заўсёды паспяхова, выступаць у абарону нацыянальных інтарэсаў. У прыватнасці, даволі негатыўную рэакцыю выклікала рашэнне школьнай адміністрацыі ўвесці ў няпольскіх школах выкладанне па-польску шэрагу дысцыплін. Цэнтральная Беларуская школьная рада ў лісце ад 22 жніўня 1925 г. у Вышэйшы адміністрацыйны трыбунал выказвала нязгоду з адвольнай трактоўкай польскімі школьнымі ўладамі аднаго з артыкулаў закона, які прадугледжваў навучанне ў беларускіх школах польскай мовы, гісторыі Польшчы і паланістыкі [25].

15 верасня 1925 г. кіраўніцтва ТБШ разам з яўрэйскімі, літоўскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі ў асобным мемарандуме на адрас міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы хадайнічала аб прыпыненні распараджэння Віленскага школьнага папячыцельства аб абавязковым выкладанні згаданых дысцыплін па-польску. Віленская школьная адміністрацыя засталася на ранейшай пазіцыі, хоць і дазволіла выкладанне па-беларуску [26]. Аднак распараджэннем міністра 2 чэрвеня 1926 г. няпольскія гімназіі былі абавязаны выкладаць па-польску польскую мову, літаратуру, гісторыю Польшчы і паланістыку. Бліжэйшая задача Беларускага пасольскага клуба была вызначана так: “Дамагацца ажыццяўлення на практыцы моўнай уставы (закона), закрыцця польскіх школ і адкрыцця замест іх дзяржаўных беларускіх пачатковых школ, … заснавання беларускіх настаўніцкіх курсаў” [27].

Хоць да 1926 г. ТБШ мела свае структурныя адзінкі толькі на Віленшчыне, а таксама ў Клецку, Навагрудку, Радашковічах, але ўжо з канца 1924 г. яго дзейнасць пачала распаўсюджвацца на іншыя мясцовасці. Усё больш настойліва прапагандавалася ідэя пабудовы школы на роднай мове. Яна станоўча ўспрымалася не толькі ў асяроддзі інтэлігенцыі, але і часткі працоўнага сялянства. Гэта быў пралог, пярэдадзень масавага руху за адкрыццё беларускіх школ. Якраз верай у тое, што надыдзе найвялікшы пад’ём у дзейнасці Таварыства ў бліжэйшы час, прасякнута эмацыянальнае выступленне лідэра Беларускай сялянска-работніцкай Грамады Б. Тарашкевіча ў польскім сейме 17 лістапада 1926 г.

Чытаючы тэкст прамовы, пераконваешся ў аратарскіх здольнасцях, смеласці, ідэйнай стойкасці гэтага чалавека. Б. Тарашкевіч сцвярджаў пра шматлюдныя шэрагі барацьбітаў – “...усім народам, цэлай масай вядзём барацьбу за нацыянальную культуру і школу”. Ён не сумняваецца, што працоўны люд беларускі скажа сваё слова. “Мы ўсё ж будзем даказваць свае права і, вядучы барацьбу арганізаванай масай, пакажам сваю сілу, загартуем яе ў барацьбе. Мы дэкларацыі будзем складаць, дэкларацыямі і пратэстамі засыпем Вас, пане міністр… Няхай Вам сняца горкія слёзы нашых дзяцей, бітых у польскай школе за тое, што гавораць па-беларуску” [28].

Маючы невялікую колькасць гурткоў у паветах, да сярэдзіны 1920-х гадоў Таварыства не магло яшчэ скласці вялікай пагрозы існуючаму палітычнаму рэжыму. Аднак да таго часу яно ўжо паспела зарэкамендаваць сябе ў супрацьдзеянні паланізацыі, вяло агітацыйную працу, аказвала падтрымку існуючым беларускім гімназіям (асабліва Віленскай) і пачатковым школам. У ходзе разгорнутай кампаніі па збору подпісаў за адкрыццё школ на роднай мове назапашваўся вопыт для арганізацыі ў далейшым разгалінаванай сеткі акруговых упраў і гурткоў ТБШ. Менавіта “грамадаўскі” уздым дазволіў стаць руху за беларускую школу шырокім і масавым.

## Глава 3. Рух за беларускія школы ў 1926 – 1929 гады

Якасна новы этап у развіцці барацьбы за беларускія школы пачаўся ў сярэдзіне 1920-х гадоў. У гэты час разгортвала сваю дзейнасць Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Пытанні нацыянальнай адукацыі былі ўключаны ў агульнадэмакратычныя палажэнні яе праграмы. “БСРГ стаіць за ўвядзенне адзінай працоўнай школы з бясплатным навучаннем за кошт дзяржавы для працоўных, – адзначалася ў праграме арганізацыі. – Навучанне ва ўсіх дзяржаўных школах павінна весціся на роднай мове вучняў” [1]. Гэта поўнасцю адпавядала спадзяванням заходнебеларускага насельніцтва.

Гурткі Грамады праводзілі працу па самаадукацыі людзей, стваралі ў вёсках бібліятэкі-чытальні, збіралі сродкі для будаўніцтва школьных будынкаў. Кіраўнікі Грамады (Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі і інш.) займаліся агітацыйнай работай на месцах, заклікаючы сялян падаваць заявы аб адкрыцці школ на роднай мове. Да прапагандысцкай кампаніі далучыліся летам 1926 г. многія павятовыя арганізацыі. Перыядычныя выданні Грамады, асабліва сатырычны часопіс “Маланка”, асвятлялі стан

адукацыі, выкрывалі антынародную сутнасць школьнага заканадаўства 1924 г.

Польская дэмакратычная грамадскасць таксама падтрымала справядлівыя дамаганні беларускага насельніцтва. На аднолькавых з Грамадой пазіцыях па школьнаму пытанню стаяла Незалежная сялянская партыя (НПХ). Яна выступала за агульнадаступнасць школ для дзяцей працоўных, за дэмакратызацыю народных школ.

У новых абставінах узнікла неабходнасць актывізаваць дзейнасць ТБШ. Пасля доўгай цяганіны 18 мая 1926 г. віленскі ваявода зацвердзіў новы статут Таварыства. Мэты, правы арганізацыі засталіся ранейшыя. Асноўнымі кіруючымі органамі сталі Галоўная ўправа і Наглядная рада. Дзейнасць Таварыства пашыралася цяпер на ўсю Заходнюю Беларусь. У адрозненне ад статута 1921 г., у новым не была так выразна акрэслена прыхільнасць да кансерватыўных і клерыкальных пазіцый, што сведчыла аб узмацненні рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл у Таварыстве.

Аб значным уплыве Грамады на ТБШ яскрава сведчаць не толькі змяненні ў статуце, але і вынікі выбараў Галоўнай управы і Нагляднай рады на надзвычайным сходзе 8 верасня 1926 г. Старшынёй Галоўнай управы выбралі Р. Астроўскага, яго намеснікамі – А. Уласава, А. Трэпку. У Галоўную ўправу ўвайшлі таксама Б. Тарашкевіч, М. Кепель, М. Сіняўскі, Я. Шнаркевіч, М. Марцінчык, Ф. Стэцкевіч, У. Лукашэвіч, А. Коўш, І. Савіцкі, П. Мятла, А. Мацейчык, сярод новых асоб – І. Дварчанін, М. Шавель. У склад Нагляднай рады трапілі С. Рак-Міхайлоўскі (старшыня), К. Крук, У. Самойла, а таксама новыя члены – Ф. Акінчыц, С. Астапчык [2]. Такім чынам, у кіраўніцтве ТБШ перавагу атрымалі дзеячы Грамады, яе прыхільнікі, у тым ліку і з колаў нацыянальнай дэмакратычнай інтэлігенцыі. Па прапанове Б. Тарашкевіча Галоўная ўправа стварыла 3 аддзелы: выдавецкі, прыватнай пачатковай школы і педагагічных курсаў, пазашкольнай асветы.

Актывісты ТБШ імкнуліся пашырыць рух за адкрыццё беларускіх школ. Да студзеня 1926 г. па ўсёй Заходняй Беларусі ўдалося падаць каля 16 тыс. заяў на адкрыццё больш 400 школ. Вялікую дапамогу на месцах аказвалі члены Грамады. Як адзначалася ў справаздачы палескага ваяводы за верасень 1926 г., пад уздзеяннем прапаганды гурткоў Грамады "насельніцтва кожны раз з большай неахвотай адносіцца да польскіх школ" [3]. Статыстыка Галоўнай управы сведчыць аб тым, што да 1928 г. агульная колькасць дэкларацый перавысіла 30 тыс. – на 1229 школ [4]. Амаль усе яны так і не былі задаволены. С. Грабскі дэмагагічна заяўляў аб адсутнасці патрэбы беларускага насельніцтва ў школах на роднай мове. "Чыста польская школа ёсць найлепшым сродкам нацыянальна-

культурнай асіміляцыі, але толькі тады, калі насельніцтва не мае рэальнай патрэбы чытаць і пісаць на роднай мове. Яно не мае гэтай патрэбы ў Віленскім, Навагрудскім, Палескім і значнай частцы Валыні” [5]. Афіцыйныя звесткі пра колькасць пададзеных заяў так і не былі апублікаваны. Захады па адкрыццю прыватных беларускіх школ таксама не мелі поспеху. Нягледзячы на нязначныя рэальныя вынікі, школьная кампанія дасягнула галоўнага – паспрыяла абуджэнню цягі беларусаў да сваёй мовы, культуры.

Новая тактычная і стратэгічная лінія, замацавання на III канферэнцыі КПЗБ (студзень 1926 г.), якая ўлічвала патрабаванні агульнадэмакратычнага характару, прадвызначыла пазіцыю партыі да пытанняў беларускай адукацыі. З восені таго ж года яе дзеячы ўключыліся ў школьную акцыю. Лозунгі пачалі рэальна ажыццяўляцца на практыцы намаганнямі радавых камуністаў, якія агітавалі за складванне дэкларацый, адкрыццё бібліятэк-чытальняў, народных дамоў.

Дзеля пашырэння ўплыву Таварыства пайшло на супрацоўніцтва з культурна-асветніцкімі арганізацыямі нацыянальных меншасцей. У сумесным мемарандуме ТБШ, Яўрэйская цэнтральная школьная арганізацыя, Яўрэйскі цэнтральны камітэт адукацыі, літоўскае культурна-асветніцкае таварыства “Рытас” 26 ліпеня 1926 г. вылучылі мінімальныя патрабаванні ў галіне адукацыі на Віленшчыне. “Патрабуем школ для беларусаў – на беларускай мове, для яўрэяў – на яўрэйскай, для літоўцаў – на літоўскай мове. Неабходныя для ўтрымання гэтых школ сродкі павінна выдзеліць дзяржава і выплаціць існуючым асветніцкім арганізацыям на аснове роўнасці і з захаваннем прапорцыі. Школьную справу трэба вызваліць ад штогадовых складаных клопатаў, якія звязаны з атрыманнем канцэсіі на адкрыццё школ, і прызнаць наша права на стварэнне новых школ звычайным шляхам – у форме заявы аб іх рэгістрацыі. Наведванне сваіх нацыянальных школ беларускімі, яўрэйскімі і літоўскімі дзецьмі трэба лічыць выкананнем абавязковага школьнага навучання. Неабходна ўраўняць у правах беларускія, яўрэйскія і літоўскія гімназіі, семінарыі з такімі ж польскімі навучальнымі ўстановамі. Настаўнікам і вучням усіх нашых школ трэба надаць такія ж правы (воінская павіннасць, пенсія і г. д.). Ранейшыя распараджэнні і цыркуляры былога міністра Ст. Грабскага і яго папярэднікаў трэба неадкладна адмяніць… Пытанне аб кваліфікацыі нашых настаўнікаў трэба вырашыць, зыходзячы з жыццёвых інтарэсаў нашых школ, улічваючы наступныя ўмовы: а) настаўнікаў, якія займаюцца педагагічнай працай больш 5 гадоў, трэба вызваліць ад дзяржаўных экзаменаў; б) тэрмін здачы дзяржаўных экзаменаў астатнімі настаўнікамі трэба перанесці на 1930 г., так як Віленшчына толькі ў 1922 г. была

далучана да Польшчы; в) праграму экзаменаў па польскай мове і літаратуры для нашых настаўнікаў трэба скараціць, бо яны выкладаюць у школах з няпольскай мовай навучання. Паліцэйска-адміністрацыйныя ўлады трэба адхіліць ад якога-небудзь кантролю над школамі, трэба пазбавіць іх права ўмешвацца ва ўнутранае жыццё школ, а гэтыя абавязкі ўскласці выключна на польскія ўлады…” [6]. Польскія ўлады так і не далі адказу на гэты сумесны мемарандум шэрагу культурна-асветніцкіх арганізацый этнічных супольнасцей Заходняй Беларусі.

Супрацоўніцтва з БСРГ дало магчымасць ТБШ стварыць уласную сетку арганізацыйных адзінак ва ўсім краі. Паводле няпоўных даных, у канцы 1926 г. налічвалася больш 250 гурткоў, 3 акруговыя ўправы (у Вілейцы, Гродна, Навагрудку), а агульная лічба членаў дасягнула 3,5 тыс. чалавек, большасць якіх належала да Грамады [7]. Склаліся прынцыпы арганізацыйнай пабудовы (гурткі – павятовыя, акруговыя ўправы – агульны з’езд (у перапынках – Галоўная ўправа)), асноўныя метады і формы працы. Хоць колькасны рост гурткоў і стрымліваўся, але ТБШ няўхільна ператваралася ў буйную дэмакратычную культурна-асветніцкую арганізацыю Заходняй Беларусі.

Рух за адкрыццё школ на роднай мове актывізаваўся і знешнім фактарам: разгортваннем культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў БССР, пашырэннем тэрыторыі рэспублікі ў 1924, 1926 гадах. Вызначальнай рысай грамадска-палітычнага жыцця там з’яўлялася палітыка беларусізацыі, якая набыла з сярэдзіны 1920-х гадоў цэласны, канцэптуальны характар. Яе першыя поспехі прызнавалі ўсе заходнебеларускія палітычныя сілы. БССР аказвала матэрыяльную, інфармацыйна-метадычную дапамогу. Так, у 1926-1927 гадах толькі на падтрымку 4 беларускіх гімназій, ТБШ, а таксама выданне легальнай газеты, патрэб Грамады, праз прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б было выдзелена 132 тыс. рублёў [8]. Цяжка вызначыць, колькі з гэтай сумы пайшло менавіта на інтарэсы адукацыі. Накіроўвалі з БССР таксама падручнікі. Пастунова з-за ідэалагічных меркаванняў дапамога выдзялялася выбарачна.

Узмацненне ўплыву Грамады на Таварыства з’яўлялася непасрэдным вынікам дыферэнцыяцыі заходнебеларускага нацыянальнага руху. З гэтым не хацелі пагаджацца лідэры Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, якая стаяла на іншай ідэйна-палітычнай платформе, чым БСРГ. Гэтая партыя выступала супраць аддзялення школы ад царквы, дамагалася выхавання дзяцей у школах у клерыкальным духу. У яе другой праграме, прынятай у лістападзе 1927 г., было пацверджана права навучацца ў школах на роднай мове, патрабаванне аб абавязковым

выкладанні там рэлігіі. Лідэр БХД А. Станкевіч лічыў, што трэба абуджаць нацыянальную свядомасць людзей на аснове хрысціянскай этыкі і дэмакратычных прынцыпаў. Пашырэнне ўнутры ТБШ рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў прызнавалася шкодным для захавання яго аўтарытэту. "БХД заўсёды добра разумела, што яе вартасць аказваецца праўдзівай тады, калі яна ідзе ў пару з працай культурна-асветнай для народу" [9]. Таму пасля дасягнення паразумення з Беларускім сялянскім саюзам была створана альтэрнатыўная ТБШ культурна-асветніцкая арганізацыя – Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, якая павінна была пашырыць сацыяльную базу БХД.

У статуце БІГіК, які быў зацверджаны 26 мая 1926 г., так была вызначана яго мэта: садзейнічаць развіццю сельскай гаспадаркі, промыслаў, народнага мастацтва, духоўнай культуры, навукі і адукацыі. Крыніцамі фінансавання былі вызначаны ўзносы, ахвяраванні, даходы ад рухомай і нерухомай маёмасці, мерапрыемстваў і г. д. Спачатку дапамогу аказваў Амерыканскі камітэт у Варшаве, дзе і знаходзілася цэнтральнае праўленне таварыства (старшыня – А. Більдзюкевіч).

Першая рэгіянальная арганізацыя (аддзел) БІГіК была створана 28 чэрвеня 1926 г. у Вільні. У яе праўленне трапілі прадстаўнікі Беларускага пасольскага клуба В. Багдановіч, А. Станкевіч, Ф. Ярэміч, а таксама Я. Казлоўскі, Б. Туронак. Пры аддзеле былі створаны секцыі – тэатральна-мастацкая і лекцыйная. Пазней узніклі аддзелы ў Радашковічах, Навагрудку, павялічылася і колькасць нізавых адзінак – у пачатку 1927 г. дзейнічалі 50 гурткоў (каля 800 членаў), 22 бібліятэкі. Лекцыі, урачыстасці, тэатральныя пастаноўкі сталі асноўнымі формамі працы гурткоў. Намаганнямі БІГіК з 28 лютага 1927 г. у Вільні былі адкрыты беларускія кааператыўна-бухгалтарскія курсы. На першых курсах вучылася 40 чалавек, з іх 29 атрымалі адпаведнае пасведчанне [10]. Восенню 1927 г. кіраўніцтва БІГіК прыступіла да адкрыцця ў Вільні Беларускага кааператыўнага прамыслова-сельскагаспадарчага банка [11].

У ліпені 1926 г. БІГіК заклікаў сваіх прыхільнікаў далучыцца да школьнай кампаніі. Найперш увага надавалася растлумачальнай рабоце. На працягу 1926-1928 гадоў БІГіК падаваў заявы на адкрыццё некалькіх дзесяткаў прыватных школ, але толькі адна з іх пасля валакіты ўлад пачала працаваць. У цэлым арганізацыя павялічвала свой уплыў сярод беларусаў-католікаў, пераважна ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах. Па меры станаўлення БІГіК узмацніліся яго супярэчнасці з ТБШ. Выклікана гэта было тым, што ў другой палове 1926 г. абвастрыліся адносіны паміж БХД і Грамадой, якая стала масавай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй. Усё гэта выключыла магчымасць супольных дзеянняў у школьнай справе.

Асобна спрабавала наладзіць школьную кампанію Беларуская Часовая Рада. Аднак далейшае развіццё нацыянальна-вызваленчай барацьбы прывяло гэтае праўрадавае аб'яднанне ў заняпад. Таварыства "Прасвета" так і не змагло скласці сур'ёзнай канкурэнцыі ні ТБШ, ні БІГіК.

Разгром Грамады рэжымам "санацыі" у студзені-лютым 1927 г. адбіўся і на ТБШ – рэзка зменшылася колькасць гурткоў. Рэпрэсіўныя дзеянні рэжыма "санацыі" супраць заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху выклікалі абурэнне ў грамадскасці савецкай Беларусі. Пры гэтым трэба адзначыць, што народнае волевыяўленне пільна каардынавалася партыйнымі органамі. Створаны ў рэспубліцы камітэт навуковых работнікаў і пісьменнікаў па абароне Беларускай сялянска-работніцкай грамады на чале з Я. Купалам выступіў са зваротам "Да навуковых і культурных дзеячаў і працоўных усяго свету". "Арганізацыя беларускай школы і культурных устаноў, кааператаванне насельніцтва і г. д. – вось віна Грамады перад польскім урадам, віна, за якую была разгромлена 100-тысячная арганізацыя, арыштаваны сотні яе членаў..." [12]. Аднак такія акцыі пратэсту не перашкаджалі працягваць ганенні і рэпрэсіі ў Заходняй Беларусі, у тым ліку і супраць культурна-асветніцкіх арганізацый. Адначасова новая сітуацыя паспрыяла іх масаваму росту, бо Грамада і КПЗБ загадзя паклапаціліся аб пераўтварэнні ТБШ у "другую лінію акопаў". Уцалелыя ад ганенняў грамадаўцы пераходзілі ў яго гурткі. Найбольш значным было пашырэнне сеткі гурткоў менавіта там, дзе існавалі шматлікія і актыўныя арганізацыі Грамады – у Навагрудскім, Косаўскім, Гродзенскім, Слонімскім, Стаўбцоўскім паветах. Колькасць гурткоў дасягнула 30-50 у кожным павеце.

Асабліва хутка ішоў колькасны рост Таварыства ў другой палове 1927 – пачатку 1928 гадоў. У літаратуры лічба членаў вагаецца ў межах 10,3-30 тыс. чалавек. Мяркуем, што найбольш абгрунтаванымі і пераканаўчымі выглядаюць сцвярджэнні У.А. Палуяна аб тым, што ў сярэдзіне 1927 г. больш 400 гурткоў аб'ядноўвалі 12-13 тыс. чалавек, а да сярэдзіны наступнага года, калі пачалася новая хваля рэпрэсій супраць ТБШ, налічвалася 14-15 тыс. чалавек у 430 гуртках [13]. Гэтая статыстыка ўвабрала ў сябе даныя як Галоўнай, так і акруговых упраў.

Амаль уся тэрыторыя Заходняй Беларусі пакрылася сеткай гурткоў, бібліятэк-чытальняў, народных дамоў. Галоўная ўправа вымушана была непасрэдна займацца стварэннем на месцах гурткоў, акруговых упраў, застаючыся асноўным цэнтрам каардынацыі школьнай кампаніі. Да канца 1927 г. было ўжо 12 акруговых упраў: у Вільні, Баранавічах, Беластоку, Вілейцы, Гродна, Глыбокім, Косаве, Лідзе, Міры, Навагрудку, Свіслачы,

Слоніме. Важным напрамкам працягвала заставацца культурна-асветніцкая дзейнасць Таварыства.

Вынікі арганізацыйнага развіцця ТБШ былі падведзены на яго I з’ездзе 28-29 снежня 1927 г. у Вільні. Там быў выказаны пратэст супраць праследаванняў арганізацыі польскімі ўладамі. У прынятай рэзалюцыі ўтрымліваліся патрабаванні аб дакладным выкананні “моўнага закона” ад 31 ліпеня 1924 г., адкрыцці каля 600 дзяржаўных беларускіх школ (у выпадку ліквідацыі двухмоўных), настаўніцкіх курсаў, нацыянальных гімназій у шэрагу гарадоў (Гродна, Слонім, Ліда, Пінск), наданні правоў грамадскіх установ ужо існуючым беларускім гімназіям, стварэнні пры школьных папячыцельствах асобных аддзелаў і г. д. У сувязі з выбыццём па працэсу Грамады некаторых членаў Галоўнай управы яе ўзначаліў А. Трэпка. Сярод яе новых членаў трэба адзначыць Р. Шырму.

Школьныя пытанні былі ўзняты ў час прапагандысцкай кампаніі перад выбарамі ў польскі сейм у сакавіку 1928 г. У гэты перыяд мясцовы актыў Таварыства вёў актыўную агітацыю за кандыдатаў левaрадыкальных спісаў. Напрыклад, у студзені 1928 г. адбыўся павятовы з’езд ТБШ у Навагрудку. Удзел у працы з’езда прымала каля 90 дэлегатаў з 56 гурткоў. На з’ездзе прысутнічалі прадстаўнікі Галоўнай управы І. Дварчанін, А. Уласаў. І. Дварчанін у сваім выступленні вылучыў актуальныя пытанні беларускай асветы: дамагацца адкрыцця беларускіх павятовых і сярэдніх школ, ВНУ; ураўнення беларускіх настаўнікаў у правах з іншымі; арганізацыі народных дамоў. Дэлегаты з’езда заклікалі галасаваць за кандыдатаў, якія будуць працаваць для аб’яднання беларускага народа, за сялянска-рабочы блок. Падобныя рэзалюцыі прымаліся і на з’ездах арганізацый ТБШ у іншых паветах Заходняй Беларусі.

Газеты арганізацыі “Змаганне” падрабязна асвятлялі дзейнасць Таварыства, прапагандавалі вопыт культурна-асветніцкай працы. Праз уласны друк “Змаганне” агітавала беларусаў паўсюдна падаваць заявы аб адкрыцці дзяржаўных і прыватных нацыянальных школ. У буйных населеных пунктах рэкамендавалася адкрываць народныя дамы і бібліятэкі-чытальні. Пры гэтым дзеячы “Змагання” разам з Галоўнай управай ТБШ заклікалі народныя масы супрацьпаставіць сваю культуру буржуазнай.

Так як ТБШ агітавала на карысць былых грамадаўцаў, то гэта выклікала серыю масавых арыштаў яго актывістаў. Аднак інтэнсіўнасць працы гурткоў у першай палове 1928 г. не спадала, асабліва ў Слонімскім, Косаўскім, Навагрудскім паветах.

У маі 1928 г. ізноў было закрыта шмат гурткоў. Неаднаразова высоўвалася патрабаванне аб выдаленні "падрыўных элементаў", у тым ліку і з кіраўніцтва Таварыства. Адмова пайсці па такому шляху і з'явілася фармальнай прычынай для забароны 28 жніўня 1928 г. дзейнасці Галоўнай управы. Для выканання яе функцый была створана Часовая камісія, куды ўвайшлі прадстаўнікі нацыянальнай дэмакратычнай інтэлігенцыі А. Трэпка, Я. Шнаркевіч, К. Крук. Ёй і даручылі падрыхтаваць з'езд, ажыццявіць выбары Галоўнай управы.

Разам з былымі грамадаўцамі камуністы Заходняй Беларусі таксама шырока выкарыстоўвалі легальны характар ТБШ. Яны атрымалі перавагу ў многіх яго акруговых управах. Грамадаўскія метады працы надалі КПЗБ некаторы станоўчы ўплыў і аўтарытэт у Таварыстве. Курс на далейшае пашырэнне такой работы быў пацверджаны на I з'езде КПЗБ (чэрвень-ліпень 1928 г.). У прынятай рэзалюцыі "Сітуацыя і задачы партыі", якая мела праграмны характар, былі вызначаны канкрэтныя задачы ў барацьбе супраць нацыянальнага прыгнёту. У іх аснову было пакладзена змаганне за агульнадэмакратычныя патрабаванні.

Камуністы выступілі рашуча супраць закрыцця гурткоў таварыства. Аднак паступова намецілася тэндэнцыя адыходу камуністаў ад вызначаных арыенціраў. Хоць і была наладжана з верасня 1928 г. кампанія пратэсту супраць рэпрэсій польскіх улад адносна ТБШ, але выступленні не сталі масавымі. Рашучае адкідванне лозунга адзінага нацыянальнага фронта адштурхоўвала ад партыі частку інтэлігенцыі. Мяркуем, што гэта было адгалоскам трывожных прыкмет у ажыццяўленні палітыкі беларусізацыі ў БССР.

Пасля забароны Галоўнай управы ў кіраўніцтве Таварыства рэзка ўзмацнілася палярызацыя поглядаў наконт далейшага характару яго дзейнасці. Як і камуністы, прадстаўнікі беларускага пасольскага клуба "Змаганне" І. Дварчанін, Я. Гаўрылік і іншыя выступалі за актыўную палітычную працу Таварыства. Барацьба супраць нацыянальнага ўціску звязвалася імі неадрыўна з класавым змаганнем. Імкненне да палітызацыі работы ТБШ было натуральным вынікам пашырэння рэвалюцыйна-дэмакратычных настрояў у заходнебеларускім грамадстве. На радыкальны характар нацыянальна-вызваленчага руху ўплывала нявырашанасць сацыяльных праблем. У такіх абставінах важна было кіраўнікам ТБШ стрымлівацца ад штучнай і празмернай палітызацыі, каб не страціць магчымасць легальнай барацьбы.

Група дзеячаў нацыянальнай дэмакратычнай інтэлігенцыі (Р. Астроўскі, А. Луцкевіч, Я. Шнаркевіч і іншыя) настойвала сканцэнтравацца выключна на культурна-асветніцкай працы. Безумоўна,

што паварот на шлях лаяльнай дзейнасці быў вельмі выгадны польскім уладам, якія мелі намер “уціхамірыць” арганізацыю. Такі раскол у кіраўніцтве рэзка ўскладніў сітуацыю ў Таварыстве. З восені 1928 г. супрацьстаянне перакінулася ў акруговыя і павятовыя ўправы, што падрывала адзінства ТБШ.

Часовая камісія, якая выказалася супраць палітызацыі дзейнасці Таварыства, пагадзілася з некаторымі дамаганнямі польскай адміністрацыі. Таму яе прапановы аб супрацоўніцтве ў справе падрыхтоўкі, правядзення агульнага з’езда не маглі прыняць праціўнікі згодніцтва. Непрыняцце іншадумства адвярнула ад гурткоў частку інтэлігенцыі нацыянальна-дэмакратычных поглядаў, якую беспадстаўна абвінавачвалі ў здрадзе беларускаму народу. Нягледзячы на цяжкасці, Часовая камісія ўсё-такі змагла ўключыць у парадак дня плануемага з’езда пытанні аб справаздачы мясцовых гурткоў, упраў, выбарах Галоўнай управы, Нагляднай рады.

Супрацоўніцтву з нацыянальнай дэмакратычнай інтэлігенцыяй перашкаджала пераацэнка, спрашчэнне аб’ектыўных тэндэнцый развіцця грамадства заходнебеларускім камуністычным рухам. Яго кіраўніцтва імкнулася высоўваць максімалісцкія лозунгі і патрабаванні [14]. Не заўсёды станоўча ўспрымаліся пазіцыі нават прыхільнікаў рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера. Напрыклад, І. Дварчанін адгукнуўся на заклік аб стварэнні адзінага нацыянальнага фронта, які быў выказаны на ІІІ з’ездзе БХД 25 лістапада 1928 г. Да таго ж, дэлегаты форума патрабавалі і неаднакладнага вырашэння пытанняў адукацыі. Аднак за гэта І. Дварчанін быў падвергнуты неабгрунтаваным абвінавачванням.

Дзякуючы актыўнай агітацыйнай працы клуба “Змаганне”, на з’езд ТБШ былі выбраны пераважна прыхільнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. Польскія ўлады не дазволілі яго правядзенне 9 снежня 1928 г. у Вільні. Але дэпутаты клуба “Змаганне” І. Дварчанін, Ф. Валынец правялі сярод дэлегатаў, якія туды прыехалі, растлумачальную работу. На арганізаваным імі сходзе былі прыняты рэзалюцыі з асуджэннем як дзеянняў рэжыму “санацыі”, так і групы Р. Астроўскага – А. Луцкевіча. Дазвол на правядзенне з’езда не быў атрыманы і на наступны дзень.

Па меры ўзмацнення расколу ТБШ усё менш увагі надавалася непасрэдна школьнай кампаніі. Хоць спынілася стварэнне новых гурткоў, асобныя гурткі Таварыства (пераважна ў Навагрудскім ваяводстве) былі адкрыты намаганнямі дэпутатаў клуба “Змаганне”. Аднак і клуб пераходзіў на больш непрымірымыя пазіцыі адносна беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі. І гэта тады, калі ўзмацняўся наступ на заходнебеларускі вызваленчы рух. На працягу 1928 – першай паловы 1929

гадоў польскія ўлады закрылі больш 100 гурткоў, 5 акруговых упраў ТБШ – у Глыбокім, Вілейцы, Навагрудку, Слоніме, Гродна [15].

Польскія ўлады прымянялі рэпрэсіўныя меры і ў дачыненні да радыкальнай часткі навучэнцаў беларускіх гімназій. 18 снежня 1928 г. папячыцельства Віленскай школьнай акругі загадала дырэкцыі Віленскай гімназіі выключыць 18 вучняў, якія "прымалі актыўна ўдзел у акцыі Саюза камуністычнай моладзі Заходняй Беларусі, а таксама ў іншых нелегальных пачынаннях антыдзяржаўных элементаў" [16]. На наступны дзень адпаведнае рашэнне было прынята. У знак пратэсту 20 снежня 1928 г. адбылася забастоўка гімназістаў. Была прынята рэзалюцыя з асуджэннем дзеянняў польскіх уладаў і школьнай адміністрацыі. "Гімназія пад кіраўніцтвам Астроўскага – гэта барацьба дырэкцыі з вучнямі, звальненне выкладчыкаў, якія не згодны з яго (Астроўскага) палітыкай" [17].

Новая забастоўка ў Віленскай гімназіі адбылася 27 лютага 1929 г. Пасля гэтага выступлення быў выключаны 41 вучань. У знак пратэсту супраць выключэння вучняў пракацілася хваля забастовак у іншых беларускіх гімназіях. Усяго ў 1928/1929 навучальным годзе з Віленскай гімназіі выключылі 64 вучні, разам з іншымі гімназіямі – каля 130 [18].

У час забастовак навучэнцы праявілі высокі ўзровень нацыянальнай і грамадскай свядомасці. Аднак пры аналізе вынікаў школьнай акцыі (на нарадзе прадстаўнікоў камсамольскіх ячэек гімназій у чэрвені 1929 г.) адзначалася, што яна "на першай стадыі праходзіла вельмі слаба". "Асабліва дрэнна адбілася на развіцці гэтай кампаніі некамуністычная апатыя і пасіўнасць значнай часткі арганізацыі" [19]. Незадавальненне камсамольскіх лідэраў выклікала нежаданне часткі вучнёўскай моладзі ўступаць у адкрытую канфрантацыйную барацьбу. "Яскравай праявай правага ўхілу было неразуменне ролі палітычнай забастоўкі ў беларускіх гімназіях, што мела месца ў Клецку, дзе таварышы вырашылі абмежавацца толькі складаннем ліста пратэсту, не здолелі таксама дастаткова падрыхтаваць акцыю і выкрыць да канца палітыку Астроўскага і К$^{o}$" [20].

Былі акрэслены і іншыя "памылкі". "У адозвах, выдадзеных ад Віленскай гімназіі, ёсць шэраг неясных і памылковых лозунгаў: "За сапраўдную беларускую гімназію, за злучэнне Заходняй Беларусі з Усходняй, супраць увядзення ў 2 і 3 класах гісторыі Польшчы...". Лозунгі гэтыя няясныя і могуць садзейнічаць нацыяналістычнаму скрыўленню нашай лініі, асабліва лозунг "Злучэнне Заходняй Беларусі з Усходняй" з'яўляецца ў корані памылковым – [яго] "выстаўляюць таксама сацыял-фашысты, якія прыкрываюць імперыялістычныя (федэратыўныя) імкненні польскай буржуазіі" [21].

Не ўсе прадстаўнікі заходнебеларускай інтэлігенцыі лічылі школьныя выступленні мэтазгоднымі. Сярод іх – А. Луцкевіч. “Уцягванне школьнай моладзі (асабліва малодшых класаў), якая не можа адказваць за свае ўчынкі, якіх не разумее ... прыносіць ганьбу тым, ... хто моладзь пхае...” [22].

У красавіку 1929 г. прыхільнікі палітызацыі Таварыства дабіліся таго, каб яго Наглядная рада прыняла рашэнне аб ліквідацыі Часовай камісіі, бо яна была створана з парушэннем статута, і правядзенні 19 мая 1929 г. агульнага з’езда. Былі ажыццёўлены дадатковыя выбары ў склад Галоўнай управы, якую ўзначаліў Ф. Стэцкевіч. У прынятай адозве да гурткоў выкрывалася “здрадніцкая дзейнасць Часовай камісіі”.

У час падрыхтоўкі да з’езда праводзілася ўзмоцненая агітацыя за складванне рэзалюцый-пратэстаў супраць закрыцця гурткоў мясцовымі ўладамі. Пры гэтым ізноў зневажаліся імёны дзеячаў беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, да іх беспадстаўна прыклейваўся ярлык “нацыянал-фашыстаў”. У духу рашэнняў VI кангрэса Камінтэрна ЦК КПЗБ прыняў рэзалюцыю з катэгарычным патрабаваннем: “Управы і гурткі ТБШ ні ў якім выпадку не падпарадкоўваюцца сфабрыкаванаму фашысцкаму кіраўніцтву і праводзяць барацьбу за легальнае існаванне ...”. “З’езд павінен даць рашучы адпор на спробы фашызму ў напрамку апанавання ТБШ, на спробы расколу нацыянальна-вызваленчага руху пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў. Праз акцыю паглыбіцця ў масы, арганізаваць сходы гурткоў і акруговыя з’езды, падтрымаць нацыянальна-вызваленчы рух і ТБШ асабліва, выбіраючы на з’езд дэлегатаў і даючы ад сходаў дырэктывы, прымаючы рэзалюцыі супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. Звярнуць асаблівую ўвагу на масавасць самога з’езду, у якім павінны прыняць удзел прадстаўнікі забароненых і закрытых упраў. Мабілізуючы масы вакол з’езду ТБШ, абвастрыць барацьбу з беларускімі сацыял-фашыстамі, якія фабрыкуюць самазванскі з’езд ТБШ, дапамагаюць ураду зрабіць ТБШ ці пераўтварыць яго ў прыдатак фашысцкай дыктатуры” [23].

Як і было запланавана, з’езд Таварыства адбыўся нелегальна ў Вільні 19 мая 1929 г. Большасць яго дэлегатаў складалі камуністы, камсамольцы і іх прыхільнікі. Усе праціўнікі палітызацыі ТБШ – Р. Астроўскі, А. Луцкевіч, А. Трэпка, В. Грышкевіч, А. Уласаў, Я. Станкевіч, Я. Шнаркевіч, А. Коўш, М. Чатырка і іншыя – былі выключаны з яго за “шкодную дзейнасць”. З’езд закляйміў іх як рэнегатаў і здраднікаў нацыянальных інтарэсаў. На Часовую камісію, якая не пагадзілася са сваім роспускам і працягвала дзейнасць, была ўскладзена віна за тое, што праца кіруючых органаў Таварыства была паралізавана. У

новы склад Галоўнай управы ўвайшлі Ф. Стэцкевіч (старшыня), М. Пяткевіч, Р. Шырма, І. Дварчанін, Ф. Валынец, І. Грэцкі, П. Крынчык, М. Кепель, М. Марцінчык, П. Пяткун, Нагляднай рады – А. Лябецкая, Н. Ламашэвіч, А. Астравецкі, У. Рэшэта [24]. З’езд узмацніў супрацьстаянне ўнутры арганізацыі. Зноў нізавыя гурткі былі ўцягнуты ў акцыю байкоту прыхільнікаў згодніцкіх дзеянняў. На акруговых з’ездах ТБШ прымаліся адпаведныя рэзалюцыі. У многіх выпадках клуб “Змаганне” настойваў на ўключэнні ў іх прапаноў па паляпшэнню беларускай нацыянальнай школы.

БСРПК “Змаганне” і яго сакратарыяты вялі актыўную работу па аднаўленню і стварэнню новых мясцовых структур ТБШ, уважліва назіралі за іх становішчам, удзельнічалі ў змаганні за беларускую асвету. У чэрвені 1929 г. паслы клуба рабілі захады па арганізацыі беларускай гімназіі ў Гродне і курсаў беларускіх настаўнікаў на Віленшчыне.

У сувязі з тым, што арганізацыйныя адзінкі таварыства на месцах адмаўляліся праводзіць сходы, выбіраць дэлегатаў на плануемы агульны з’езд, то гэта было ажыццёўлена прымусова – па загаду староставаў, з дапамогай паліцыі. У выпадку адпраўкі дэлегатаў на з’езд абяцалася ўсялякая дапамога, нават дазвалялася аднаўленне гвалтоўна закрытых гурткоў ТБШ. Мясцовыя ўлады нават пагадзіліся на аказанне матэрыяльнай дапамогі дэлегатам гэтага з’езда. У выніку такой “растлумачальнай” працы частка мясцовых структур таварыства выбрала дэлегатаў на з’езд.

Адначасова напярэдадні з’езда былі закрыты найбольш левырадыкальныя акруговыя ўправы ў Гродне і Свіслачы. Арыштоўвалі як мясцовых актывістаў, так і членаў Галоўнай і акруговых упраў. Першачарговай задачай новай Галоўнай управы ТБШ была легалізацыя сваёй дзейнасці. Ужо на другім пасяджэнні было вырашана накіраваць да віленскага ваяводы для вырашэння гэтай справы дэлегацыю ў складзе Ф. Стэцкевіча, Р. Шырмы, С. Паўловіча. Ваяводскія ўлады 12 жніўня 1929 г. заявілі ім, што змена адносін да Таварыства будзе залежаць ад “ступені вызвалення яго ад камуністычных груп” [25].

Выключаныя з Таварыства працягвалі займацца школьнымі справамі. Па ініцыятыве А. Луцкевіча, В. Грышкевіча, Р. Астроўскага, А. Сакаловай-Лекант, Я. Шнаркевіча і іншых быў заснаваны Беларускі настаўніцкі саюз (Беларускі прафесіянальны вучыцельскі саюз). Былі абвешчаны мэты новай арганізацыі: абарона прафесійных інтарэсаў настаўнікаў, садзейнічанне ўдасканаленню іх педагагічнага майстэрства, распаўсюджванне здабыткаў нацыянальнай культуры. У склад управы саюза былі выбраны выключна настаўнікі беларускіх школ – В. Грышкевіч

(старшыня), А. Сакалова-Лекант, Я. Шнаркевіч, Р. Якубёнак, С. Кароль. Яны адразу запатрабавалі ад польскіх уладаў выдзялення субсідый, адкрыцця беларускіх пачатковых школ, настаўніцкай семінарыі ў Вільні і г. д. Паступова дзейнасць саюза пашырылася на ўсю Заходнюю Беларусь. Аднак вузкапрафесійны склад арганізацыі, абмежаванасць выключна асветай не дазволілі ёй стаць масавай.

У красавіку 1929 г. група дзеячаў Беларускага навуковага таварыства, Беларускага выдавецкага таварыства, ТБШ, сярод якіх былі ўжо згаданыя Н. Банцлебен, Я. Шнаркевіч, В. Грышкевіч, А. Сакалова-Лекант, а таксама А. Коўш, А. Трэпка, Р. Астроўскі, А. Міхалевіч, накіравала папячыцелю Віленскай школьнай акругі змястоўны мемарандум у справе патрабаванняў беларускага насельніцтва ў галіне асветы на роднай мове. У названым дакуменце ўтрымліваліся наступныя дамаганні: адкрыць адпаведную колькасць беларускіх пачатковых школ, беларускую настаўніцкую семінарыю ў Вільні, надаць правы грамадскай установы Клецкай беларускай гімназіі, заснаваць яшчэ адну нацыянальную гімназію ў Пінску, выдзеліць дзяржаўныя субсідыі, доўгатэрміновы крэдыт для выдання падручнікаў [26]. Рэалізаваць на практыцы ўдалося толькі асобныя патрабаванні.

У сакавіку 1927 г. узнікла ў Вільні Таварыства беларускай інтэлігенцыі. Асноўнымі яго мэтамі было аб’яднанне нешматлікай беларускай інтэлігенцыі, правядзенне культурна-асветніцкай працы. Сярод яго стваральнікаў былі А. Аўсянік (старшыня), Я. Мамонька, М. Гурын, Г. Канапацкі, М. Шыла, Я. Ярашэвіч і інш. Гэтая арганізацыя дамагалася павелічэння колькасці беларускіх школ, выданняў, прапагандавала розныя прадстаўленні. Хоць яна праіснавала да 1933 г., але значнай ролі ў нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі не сыграла. Таварыства беларускай інтэлігенцыі абмяжоўвалася толькі складваннем мемарандумаў польскім уладам, ў сваёй дзейнасці не выйшла па-за межы Вільні.

Сярод цікавых культурных пачынанняў інтэлігенцкіх колаў трэба адзначыць выданне ў Вільні ў 1927-1931 гадах беларускага ілюстраванага часопіса для дзяцей “Заранка”. Рэдактарам-выдаўцом часопіса з’яўлялася Л. Войцік (З. Верас). На старонках “Заранкі” з вершамі, апавяданнямі, артыкуламі выступалі М. Машара, Г. Леўчык, Я. Пачобка, У. Паўлюкоўскі і іншыя літаратары. З маладых аўтараў асабліва вылучаўся С. Новік-Пяюн, які падпісваўся псеўданімам Малады Дзядок. Перадрукоўваліся творы Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі і іншых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Юныя чытачы дасылалі свае літаратурныя творы, казкі, легенды, паданні ў пастаянны аддзел “Працы нашых чытачоў”.

Большыя магчымасці для асветніцкай працы павінна было адкрыць ТБШ. З’езд, які адбыўся 9 ліпеня 1929 г., быў не вельмі прадстаўнічы, перавагу там мелі якраз асобы з інтэлігенцкага асяроддзя. Па асобных пытаннях не было адзінай думкі, ўзнікалі вострыя рознагалоссі. Улічваючы рэальную сітуацыю ўнутры ТБШ, А. Луцкевіч дамагаўся дзеля яго захавання не паглыбляць канфрантацыю. Менавіта ён адрэдагаваў многія пункты прынятай рэзалюцыі. Дэлегаты пацвердзілі сваю ранейшую пазіцыю аб тым, што Таварыства павінна займацца выключна культурна-асветніцкай працай. А. Луцкевіч пераканаў іх у тым, што трэба зацвердзіць выбраную 19 мая гэтага года Галоўную ўправу – на перыяд да чарговага з’езда, які планавалася правесці ў бліжэйшы час. Пасля з’езда канструктыўная пазіцыя А. Луцкевіча была падвергнута вострай крытыцы з боку камуністаў краю. “Выступленне Луцкевіча азначае толькі манёўр для атуманьвання мас, што яны быццам не фашысты, каб так заваяваць пэўны давер да сябе...”, – так адрэагаваў Сакратарыят ЦК КПЗБ. Не пагадзіліся з А. Луцкевічам таксама Р. Астроўскі і яго аднадумцы. Польскія ўлады ўсё-такі ў канцы жніўня 1929 г. дазволілі легальнае існаванне Галоўнай управы Таварыства.

Цікавыя звесткі адносна пазіцыі вышэйшых уладных структур Польшчы да ТБШ утрымліваюцца ва ўспамінах міністра юстыцыі А. Мейштовіча. “Забарона дзейнасці гэтага Таварыства здавалася абавязковай. Тым часам пасля ліквідацыі грамады ў Таварыстве пачалася барацьба паміж уплывамі радыкальнага клуба дэпутатаў і ўплывамі пана Астроўскага, які займаў адносна памяркоўнае становішча. З забаронай Таварыства цягнулі доўга... Усё-такі было забаронена, але амаль адразу забарона была знятая дзякуючы намаганням групы палякаў, якія падтрымлівалі беларускі рух і сцвярджалі, што былыя грамадаўцы падзяліліся на лявіцу і правіцу, што ТБШ будзе аб’ядноўваць правіцу і яго можна будзе выкарыстаць для змагання з левымі”. Праўда, непасрэдна сам А. Мейштовіч займаў катэгарычную пазіцыю: “Пану Астроўскаму нельга давяраць” [27]. Гэта яшчэ раз пацвярджае, наколькі сур’ёзную пагрозу для планаў паланізацыі ўяўляла Таварыства.

Рэпрэсіўныя дзеянні польскай адміністрацыі не спынілі працэс радыкалізацыі настрояў заходнебеларускай моладзі. Актыўны ўдзел у грамадска-палітычных акцыях прымалі вучні Клецкай беларускай гімназіі. “Ужо цэлы год у беларускай гімназіі ў Клецку існавала добра заканспіраваная камуністычная арганізацыя, – адзначалася ў справаздачы Навагрудскага ваяводы за лістапад 1929 г. – ...Выявіць членаў гэтай арганізацыі было складана, бо дырэктар беларускай гімназіі ў Клецку Рыгор Якубёнак, які быў па перакананню “бунтаўшчыком” і агрэсіўным

беларускім нацыяналістам, у некаторай ступені паблажліва адносіўся да камуністычнай дзейнасці вучняў старэйшых класаў” [28]. Менавіта Р. Якубёнак прыняў да сябе ў школу частку гімназістаў з Вільні, Навагрудка, Радашковічаў, што былі выключаны з навучальных устаноў за ўдзел у школьных забастоўках. Пад ціскам паліцэйска-адміністрацыйных улад педсавет вымушаны быў выключыць 4 вучняў з Клецкай гімназіі за распаўсюджванне лістовак клуба “Змаганне”. Гэта выклікала дэманстрацыю пратэсту школьнікаў 18 лістапада 1929 г. Вынікі гэтай акцыі былі яшчэ больш прыгнятальнымі – з гімназіі выключылі 22 вучняў.

У другой палове 1929 г. паслы “Змагання” ажыццяўлялі даволі значную работу ў арганізацыях ТБШ у Палескім ваяводстве. Непасрэдна гэтай справай там займаўся І. Грэцкі. У Віленскім, Навагрудскім ваяводствах таксама праводзілася праца па аднаўленню арганізацыйнай сеткі Таварыства. Аднак з-за рэпрэсіўных дзеянняў польскіх улад рабіць гэта было вельмі складана. У справаздачы старасты Пружанскага павета ад 10 студзеня 1930 г. адзначалася актывізацыя легальнай працы ТБШ, спроба стварэння акруговай управы ў Пружанах, што адбывалася пры цесным кантакце аддзяленняў Таварыства з клубам “Змаганне” [29].

У гэты час працягвала працаваць на ніве культурна-асветніцкай дзейнасці другая арганізацыя – БІГіК. Рабіліся захады атрымаць дазвол на адкрыццё беларускай настаўніцкай семінарыі ў Вільні, аднак з-за фінансавых цяжкасцей гэта было зацягнута да 1930 г. Пры садзейнічанні БІГіК было наладжана выданне з 1929 г. часопіса студэнтаў-беларусаў “Шлях моладзі”, які заняў нацыянальныя, клерыкальныя пазіцыі. Спрабавалі таксама стварыць таварыства беларускай моладзі “Будучыня”, спартыўнае аб’яднанне “Гайсак”, але беспаспяхова. Радыкалізацыя нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі часткова звузіла сацыяльную базу БІГіК.

БХД выступала супраць нацыянальнага ўціску беларусаў не толькі праз БІГіК. Актыўна выкарыстоўваліся іншыя легальныя сродкі барацьбы, ў тым ліку парламенцкая трыбуна. Яе прадстаўнікі ў Беларускім пасольскім клубе, які працягваў дзейнічаць у 1928-1930 гг. паралельна з клубам “Змаганне”, як і раней, адстойвалі агульнадэмакратычныя, сацыяльныя, нацыянальныя інтарэсы народа. Не апошняе месца ў працы беларускіх паслоў і сенатараў займалі пытанні нацыянальнай школы. Адзін з іх, А. Стэповіч, у сваёй прамове ў сейме 7 лютага 1929 г. катэгарычна заявіў, што пакуль урад “санацыі” не адмовіцца ад нацыянальнага ўціску ў галіне адукацыі, рэлігіі, нельга гаварыць аб нейкім беларуска-польскім збліжэнні. З асаблівай заклапочанасцю адзначаў ён нізкі ўзровень навучання дзяцей у двухмоўных і польскіх школах, шкодны

ўплыў на гэта выкладання па-польску [30]. Парламенцкія формы змагання маглі толькі падтрымаць беларускія школы. Карэннае змяненне іх становішча залежала найперш ад актыўнасці масавых палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый.

У справе захавання беларускай асветы немалое значэнне мела і народная самадзейнасць. Калектывы мастацкай самадзейнасці ў Заходняй Беларусі ставілі п’есы беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх драматургаў, пераважна на тэмы народнага жыцця – “Паўлінка” і “Прымакі” Я. Купалы, “Модны шляхцюк” К. Каганца, “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча, “Мікітаў лапаць” М. Чарота і іншыя. Беларускі народны тэатр, што існаваў з 1915 г., у перыяд дзейнасці Грамады пакідаў Вільню і паказваў спектаклі ў многіх заходнебеларускіх гарадах і мястэчках. Пасля ліквідацыі Грамады ўлады рэзка абмежавалі яго дзейнасць. Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, гэты тэатр праіснаваў да 1939 г. “Аб’яздны тэатр” Галоўнай управы БІГіК паказваў на Віленшчыне, Ашмяншчыне “Залёты” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Апошняе спатканне” У. Галубка і іншыя. У рэпертуары хораў пераважалі беларускія народныя песні.

Аматарскія спектаклі і канцэрты ператвараліся ў сапраўдныя святы, былі формай пратэсту супраць паланізацыі. Беларускія сяляне выступалі ў абарону сваёй нацыянальнай культуры, патрабавалі яе свабоднага развіцця. Паліцыя пастаянна арыштоўвала кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, забараняла спектаклі.

Падводзячы вынікі развіцця руху за беларускія школы ў 1926-1929 гадах, варта выдзеліць яго арганізацыйнае сталенне, шырокі размах. Якраз тады назіраўся найвышэйшы ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы заходнебеларускага насельніцтва. У той час ТБШ пераўтварылася ў масавую арганізацыю. Асабліва паспрыяла гэтаму Грамада, нават пасля разгрому якой Таварыства адчувала на сабе ўплыў яе аўтарытэту. Польскія ўлады пад прыкрыццём барацьбы з антыдзяржаўным рухам спрабавалі разбіць яго ці хаця б падпарадкаваць сабе. Аднак Таварыства ўцалела. Прыхільнікі згодніцкай лініі імкнуліся павярнуць арганізацыю на шлях культурніцкай працы, якая была б лаяльная ўладзе, але поспеху не мелі.

Барацьба за ўплыў у ТБШ паміж рознымі палітычнымі сіламі Заходняй Беларусі часта перашкаджала выніковасці, эфектыўнасці яго працы. Не заўсёды прыходзіла разуменне аб аб’яднанні намаганняў у змаганні за нацыянальныя каштоўнасці. Невыпадковым ва ўмовах дыферэнцыяцыі заходнебеларускага руху было стварэнне БІГіК, які таксама шмат зрабіў па ажыўленню цягі людзей да сваёй культуры, мовы, адукацыі, хаця і быў арганізацыйна слабейшы за ТБШ. Ідэя нацыянальнай

школы ўсё больш пранікала ў шырокія слаі заходнебеларускага грамадства.

## Глава 4. Беларускія гімназіі і пачатковыя школы

Унікальнай з’явай культурнага жыцця краю з’яўляліся беларускія гімназіі. Хоць іх было няшмат – у пачатку 1920-х гадоў працавалі 6 такіх сярэдніх школ (у Вільні, Гродна, Нясвіжы, Навагрудку, Радашковічах, мястэчку Гарадок Вілейскага павета), аднак яны беражліва захоўвалі і развівалі традыцыі беларускай нацыянальнай школы.

Адметнае месца сярод беларускіх гімназій займала Віленская. Як і іншыя беларускія гімназіі, яна мела статус прыватнай. Гімназія з’яўлялася 8-класнай навучальнай установай гуманістычнага тыпу. У кастрычніку 1921 г. з 346 гімназістаў беларусаў было 264, яўрэяў – 59, рускіх – 11, немцаў – 7, па некалькі прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей [1]. Фінансавую падтрымку ёй аказвала Цэнтральная беларуская школьная рада, потым – ТБШ, а з 1928 г. – бацькоўскі камітэт гімназіі. Часта даводзілася наладжваць збор ахвяраванняў сярод насельніцтва. На патрэбы гімназій аддавалі частку сваёй зарплаты беларускія паслы і сенатары. Грошы прысылалі прадстаўнікі беларускай эміграцыі.

Пэўную дапамогу гімназіям аказвалі беларускія культурна-асветніцкія арганізацыі, што дзейнічалі на тэрыторыі Латвіі. 24 студзеня 1924 г. старшыня Цэнтральнай беларускай школьнай рады А. Станкевіч накіраваў таварыству “Бацькаўшчына” у Дзвінску зварот настаўнікаў заходнебеларускіх гімназій. Дырэктар Люцынскай беларускай гімназіі К. Езавітаў арганізаваў збор ахвяраванняў. Да гэтай кампаніі далучыліся настаўнікі, вучні, мясцовыя жыхары-беларусы. Усяго было сабрана 2300 рублёў [2].

Падтрымлівалі гімназіі беларускія студэнты, што вучыліся ў Чэхаславакіі. 2 верасня 1923 г. у Празе было створана Таварыства прыяцеляў беларускай сярэдняй школы. Яго ўдзельнікі абавязаліся кожны месяц адлічваць на гэтыя патрэбы па 10 чэшскіх крон. Беларуская студэнцкая секцыя на сваім агульным сходзе 3 кастрычніка 1923 г. прыняла рашэнне аб абавязковай прыналежнасці сваіх членаў да згаданага Таварыства. Да лістапада 1924 г. было сабрана 1817 крон, з якіх асноўную частку накіравалі беларускім гімназіям у Навагрудку і Нясвіжы [3]. Хоць гэта была нязначная дапамога, але яна мела велізарнае маральнае значэнне. Падтрымку гімназіям аказвала і БССР. На пасяджэнні Бюро дапамогі КПЗБ 17 ліпеня 1924 г. было прынята рашэнне аб бранiраваннi па

лініі Наркамасветы рэспублікі да 50 месцаў у ВНУ для заходнебеларускай моладзі, выдзяленні 500 рублёў Віленскай беларускай гімназіі [4].

Паводле пагаднення, якое падпісалі з праваслаўнымі ўладамі ў Вільні 16 жніўня 1921 г. прадстаўнік Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны А. Станкевіч і дырэктар гімназіі М. Кахановіч, для патрэб гімназіі і беларускага музея быў перададзены ў карыстанне будынак семінарыі (вул. Вострабрамская, 9) [5]. Гімназіі была перададзена маёмасць, бібліятэка закрытай польскімі ўладамі ў Барунах беларускай настаўніцкай семінарыі [6]. Вучням і самім даводзілася зарабляць – праводзіць канцэрты, вечарыны. Аднак для нармальнага функцыянавання гімназіі пастаянна не хапала сродкаў. Настаўнікі працавалі выключна на энтузіязме. “Гэта было ў духу тагачаснага беларускага пакалення”, – адзначалі выпускнікі гімназіі [7].

Адсутнасць правоў грамадскай установы абцяжарвала доступ выпускнікам Віленскай гімназіі да вышэйшай адукацыі ў тагачаснай Польскай дзяржаве – пасля сканчэння 8-га класа яны не мелі магчымасці здаваць экзамены на атэстат сталасці. Многія выпускнікі вымушаны былі нелегальна ехаць вучыцца за мяжу – у БССР, а таксама ў Чэхаславакію і іншыя еўрапейскія краіны. Паводле асобных крыніц, так зрабілі каля 100 чалавек са 189, якія скончылі Віленскую гімназію за першыя 10 гадоў яе існавання [8]. Толькі ў 1928 г. гімназія атрымала доўгачаканае права прымаць экзамены на атэстат сталасці – “матуру”. Вясной 1928 г. Віленскае школьнае папячыцельства стварыла спецыяльную экзаменацыйную камісію (кіраўнік – прафесар М. Масоніюс) для выпускнікоў Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій. З 12 прэтэндэнтаў 10 атрымалі атэстат сталасці [9].

Па-беларуску спачатку выкладаліся ўсе прадметы толькі ў падрыхтоўчым, першым і другім класах. Старшакласнікі вучыліся па-руску (выключэнне складалі беларуская літаратура, гісторыя і геаграфія Беларусі). Паступова гімназія станавілася сапраўды нацыянальнай навучальнай установай. З 1924 г. усе дысцыпліны там выкладаліся па-беларуску. Павелічэнне колькасці дзяцей-беларусаў паскорыла працэс пераводу навучання на іх родную мову. Паводле статута гімназіі, прымалі на вучобу найперш дзяцей з беларускіх сем’яў, а потым ужо кандыдатаў іншых нацыянальнасцей [10]. Акрамя беларусаў там вучыліся рускія і яўрэі.

Статут гімназіі прадугледжваў, што Цэнтральная беларуская школьная рада, якая павінна была атрымоўваць адпаведны дазвол ад папячыцельства Віленскай школьнай акругі, разам з дырэктарам абавязана ажыццяўляць агульнае загадванне справамі. Менавіта яна вызначала памер

платы за вучобу і знаходжанне ў інтэрнаце. Пасля ўнясення ўступнага ўзносу плата праводзілася 2 разы на працягу навучальнага году – у верасні і студзені. Па хадайніцтву педсавета Цэнтральная беларуская школьная рада вызваляла ад яе вучняў з незаможных сем'яў.

Пасля першага дырэктара М. Кахановіча гэтую пасаду непрацяглы час займалі Б. Тарашкевіч, А. Трэпка. У лістападзе 1923 г. папячыцельства Віленскай школьнай акругі зацвердзіла Р. Астроўскага дырэктарам гімназіі, якую ён узначальваў з невялікім перапынкам да 1936 г. Нельга даць адназначную ацэнку яго дзейнасці на гэтай пасадзе – жорсткі стыль кіравання выклікаў тады негатыўную рэакцыю многіх дзеячаў заходнебеларускага руху. Аднак яму ўдалося зберагчы школу ад поўнага закрыцця.

Пазіцыі беларускіх гімназій увесь час слабелі. Не вытрымаўшы ўціску і фінасавых цяжкасцей, спыніла сваё існаванне яшчэ ў 1921/22 навучальным годзе беларуская гімназія ў Гродна. Прыватная беларуская гімназія гуманітарнага тыпу ў мястэчку Гарадок Вілейскага павета была заснавана ў 1920 г. Дазвол на адкрыццё гэтай гімназіі атрымаў К. Тышкевіч. Спачатку існавалі толькі 4 асноўныя і 1 падрыхтоўчы класы. Як сведчыць ліст кіраўніка школы К. Цітко у Вільню (18 сакавіка 1921 г.), гімназія ў Гарадку мела вялікае культурна-асветніцкае значэнне для навакольных вёсак і мястэчак. “Пасля 7-гадавой адсутнасці якіх-небудзь школ, адкрыццё гімназіі, у якой дзеці вучацца на сваёй роднай мове, аказала моцнае ўражанне на тутэйшых жыхароў” [11]. Выкладчыцкай працай акрамя К. Тышкевіча займаліся там П. Баталін, С. Кароль, А. Агіевіч і іншыя. У 1922/1923 навучальным годзе ў Гарадоцкай беларускай гімназіі вучылася 119 чалавек [12]. З-за матэрыяльных цяжкасцей, адміністрацыйных перашкод, а таксама аддаленасці ад густанаселенай мясцовасці кіраўніцтва гімназіі ў Гарадку з 1922 г. спрабавала перанесці яе ў Валожын, але праз 2 гады польскія ўлады наогул закрылі школу.

Такі лёс напаткаў і гімназію ў Нясвіжы. Прыватная беларуская жаночая гімназія ў Нясвіжы была адкрыта ў 1921 г. Папячыцельства Палескай школьнай акругі выдала дазвол на яе ўтрыманне землеўласніку Е. Жаўняркевічу. У 1921/22 навучальным годзе там вучылася 120 дзяўчат, у наступным годзе – 96. Вучнёўскі кантынгент быў пераважна з сем'яў беларускіх сялян. Аднак да 1/3 школьнікаў складалі яўрэйскія дзеці. Усяго ў гімназіі працавала 12 настаўнікаў, сярод якіх былі К. Шчэнсновіч (дырэктар), М. Заморын, Я. Шнаркевіч, Р. Якубёнак і іншыя [13]. У 1923 г. папячыцельства Палескай школьнай акругі адмовілася выдаць дазвол на яе ўтрыманне, патлумачыўшы гэта тым, што “мясцовае насельніцтва не мае

патрэбы ў беларускай школе" [14]. Рабіліся спасылкі і на нізкі ўзровень навучання, слабую матэрыяльна-тэхнічную забяспечанасць і г. д. Дзякуючы намаганням нацыянальнай інтэлігенцыі і падтрымцы дэмакратычных колаў заходнебеларускага грамадства, гімназія прадоўжыла сваю дзейнасць у Клецку.

Найбольш устойлівай заставалася Віленская гімназія. Гэта было выклікана наяўнасцю там згуртаванага, кваліфікаванага, патрыятычна настроенага педагагічнага калектыва. Знаёмства з успамінамі выпускнікоў Віленскай гімназіі дае магчымасць сцвярджаць, што настаўнікі аказалі найбольшае ўздзеянне на выхаванне моладзі. Павага да вучняў, да сваіх прадметаў выкладання, клопат аб добрай рэпутацыі гімназіі – вось што вызначала воблік большасці настаўнікаў [15].

Нацыянальнай справе сумленна служылі не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. "...Я зусім не ведала беларускай мовы, – пісала ў адным з лістоў у 1923 г. выкладчыца нямецкай мовы Н. Банцлебен. – Цяжкія перажыванні на ніве беларускай школьнай працы, дагэтуль зусім мне незнаёмага народа, зраднілі мяне з душой яго, пабудзілі мяне аддаць яму свае сілы і энергію, каб працаваць карысна і бліжэй падыйсці да дзяцей, давераных мне" [16]. Хоць настаўнікі мелі розныя палітычныя погляды, але яны выхоўвалі патрыятычныя пачуцці, любоў да беларускай мовы, пашыралі дэмакратычныя, гуманістычныя погляды.

У 1920-я гады ў гімназіі працавала цэлая плеяда відных дзеячаў палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі: М. Гарэцкі, А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Станкевіч, А. Смоліч, С. Рак-Міхайлоўскі, С. Паўловіч, І. Дварчанін, Я. Драздовіч, Р. Шырма. Выкладалі таксама Л. Чарняўская-Гарэцкая, А. Сакалова-Лекант, Ю. Мэнке, А. Якубецкі, М. Красінскі і іншыя.

Б. Тарашкевіч выкладаў у старэйшых класах беларускую літаратуру, лацінскую мову. Яго лекцыі сведчылі пра высокае педагагічнае майстэрства. Ён "ужо сваім красамоўным выкладаннем захапляў вучняў" [17]. Нават пасля выбрання паслом у польскі сейм у 1922 г. Б. Тарашкевіч усё роўна цікавіўся справамі гімназіі, дапамагаў ёй.

Лекцыі па беларускай літаратуры М. Гарэцкага і А. Луцкевіча былі "павучальнымі, мілагучнымі, эмацыянальнымі, патрыятычнымі і часам арыгінальнымі па метадзе выкладання" [18]. Наконт заняткаў, якія праводзіў М. Гарэцкі, былы вучань гімназіі М. Пецюкевіч успамінаў: "Не было выпадку, каб хто з вучняў нашага класа ўцёк з урока беларускай мовы ці літаратуры. Прыходзілі на ўрокі М. Гарэцкага нават і тыя, каго лекар звольніў па хваробе" [19].

Доўгі час вёў урокі каталіцкай рэлігіі ў Віленскай беларускай гімназіі вядомы палітычны дзеяч, публіцыст, гісторык, ксёндз А. Станкевіч. “Выкладаў на вельмі прыгожай беларускай мове, што выдзяляла яго ад многіх настаўнікаў... Яго лекцыі – размовы аб духоўнасці і нацыянальнай свядомасці...” [20]. Урокі рэлігіі павінны былі спрыяць маральнаму выхаванню гімназістаў. У навучальныя планы былі ўключаны таксама беларуская, польская, руская, нямецкая, французская, лацінская мовы, гісторыя, геаграфія, матэматыка, фізіка, хімія, маляванне, спевы, прыродазнаўства і іншыя прадметы.

Вывучэнне гісторыі пачыналася з 2-га класа. На працягу двух першых гадоў вучні вывучалі гісторыю Беларусі. У аснову праграмы па айчыннай гісторыі была пакладзена перыядызацыя, распрацаваная В. Ластоўскім, У. Ігнатоўскім: полацкі, літоўска-беларускі, польскі, расійскі. У 4-7-м класах выкладалася сусветная гісторыя. Адначасова вывучалася больш грунтоўна і гісторыя Беларусі. У 4-м класе гэта была адпаведна “Старажытная гісторыя” і “Полацкі перыяд”, 5-м класе – “Сярэднявечча” і “Літоўска-беларускі перыяд”, 6-м класе – “Новая гісторыя да Французскай рэвалюцыі” і “Польскі перыяд”, 7-м класе – “Новая гісторыя ад Французскай рэвалюцыі да апошніх часоў” і “Расійскі перыяд”. А ў 8-м класе гімназісты знаёміліся з тагачасным становішчам Беларусі. Такім чынам, у аснову гістарычнай адукацыі быў пакладзены прынцып сінхроннага вывучэння айчыннай гісторыі ў кантэксце сусветнай, што павінна было паспрыяць фарміраванню нацыянальнай свядомасці вучняў.

Настаўнікі Віленскай беларускай гімназіі актыўна праводзілі вучэбна-метадычную працу. Беларускае навуковае таварыства, якое ўзначальваў А. Луцкевіч, з іх удзелам займалася распрацоўкай навуковай тэрміналогіі, напісаннем, перакладам і выданнем падручнікаў. Сам А. Луцкевіч пераклаў на беларускую мову падручнікі “Сусветная гісторыя” (Частка 2) В. Остэрлёфа і Я. Шустэра (1921 г.), “Элементарная алгебра” А. Кісялёва (1922 г.) і іншыя.

Яшчэ ў 1920 г. у Вільні была надрукавана кніга М. Гарэцкага “Гісторыя беларускай літаратуры” (у 1921, 1924 гг. з’явіліся дапоўненыя выданні). У згаданай кнізе прааналізаваны асноўныя этапы гісторыі нацыянальнай літаратуры, пачынаючы ад часоў узнікнення пісьменнасці. Яна складаецца з 3 радзелаў. У першым (“Старадаўняе пісьменства (X-XVIII ст.)”) дадзены кароткі агляд вядомых на той час літаратурных помнікаў, вызначана месца і роля дзеячаў айчыннай культуры. У другім і трэцім раздзелах прааналізавана творчасць пісьменнікаў “народніцкай” і “нашаніўскай” пары. Доўгі час гэта быў адзіны падручнік па літаратуры не

толькі ў заходнебеларускіх гімназіях, але і ў сярэдніх, вышэйшых навучальных установах БССР.

У 1922 г. у Вільні была выдадзена яшчэ адна кніга М. Гарэцкага – “Хрэстаматыя беларускай літаратуры. XI век – 1905 год”. У 1927 г. у дапаўненне да яе Беларускае выдавецкае таварыства надрукавала “Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 году)”, складзеную І. Дварчаніным. Кніга была адрасавана вучням старэйшых класаў беларускіх гімназій.

У 1922 г. Беларускае Навуковае Таварыства падрыхтавала да друку перакладзены А. Смолічам ужо згаданы падручнік В. Остэрлёфа і Я. Шустэра “Сусветная гісторыя” (Частка 3), дзе разглядаліся пытанні ад Вялікіх геаграфічных адкрыццяў да падзелу Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. Шэраг падручнікаў па фізіцы, геаметрыі падрыхтаваў А. Трэпка, геаметрыі і астраноміі – Р. Астроўскі. Нярэдка вучні старэйшых класаў удзельнічалі ў калектыўных перакладах падручнікаў на беларускую мову.

Віленская гімназія пераўтваралася ў вучэбна-метадычны цэнтр не толькі нацыянальных сярэдніх, але і пачатковых школ Заходняй Беларусі. Менавіта там працавала Л. Чарняўская-Гарэцкая, аўтар чытанак для пачаткоўцаў “Родны край”, у якіх было змешчана шмат матэрыялу, прызначанага для пашырэння кругагляду дзяцей, выхавання ў іх эстэтычных і этычных пачуццяў. Немалое значэнне надавалася фарміраванню гістарычнай свядомасці вучняў. Вучням 3 і 4-га класаў былі прапанаваны для чытання тэксты “Аповесць аб паходзе Ігаравым”, “Князь Усяслаў”, “Хрысціянства”, “Ліцвіны”, “Пачатак беларускага друку”, “Літоўскі статут”, “Бітва пад Оршай”, “Люблінская унія” і іншыя. Пры перавыданні ў 1923 г. чытанкі для 2-га класа А. Луцкевіч змясціў у раздзеле “Жыццё слаўных беларусаў” уласныя нарысы пра Е. Полацкую, Ф. Скарыну, П. Багрыма, Ф. Багушэвіча, І. Луцкевіча, А. Пашкевіч (Цётку).

Значнае месца ў чытанцы “Родны край” было адведзена асобным творам беларускіх пісьменнікаў і паэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Багдановіча, Ц. Гартнага, Я. Лёсіка, К. Буйло, К. Каганца. Частка твораў была ўключана з чытанак В. Ластоўскага. У кнігах Л. Чарняўскай прысутнічалі таксама творы рускіх, польскіх, англійскіх, яўрэйскіх, украінскіх, французскіх аўтараў. Асобныя з іх яна пераклала сама на беларускую мову. У цэлым чытанка “Родны край” улічыла класічныя патрабаванні дыдактыкі – ад незнаёмага да вядомага, ад простага да складанага.

Актыўна выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе пачатковых школ падручнікі Ал. Смоліч “Зорка: Беларуская граматыка”, Я. Станкевіча “Беларускі правапіс з практыкаваннямі”, Б. Тарашкевіча “Беларуская

граматыка для школ”, С. Рак-Міхайлоўскага “Арыфметычны задачнік для пачатковых школ” (Частка 2) і іншыя. Аднак для вывучэння асноўных прадметаў – беларускай і польскай моў, матэматыкі, геаграфіі, прыродазнаўства, гісторыі, рэлігіі і іншых – усё роўна не хапала падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Вялікая ўвага ў беларускіх пачатковых школах надавалася вывучэнню роднай мовы. У праграмах, падручніках, навукова-метадычных распрацоўках падкрэслівалася, што вывучэнне беларускай мовы дае аснову для лепшага засваення іншых прадметаў. На першы план у букварах, чытанках Л. Чарняўскай-Гарэцкай, Ал. Смоліч і іншых выступаў краязнаўчы матэрыял. Кнігі прывівалі дзецям пачуццё справядлівасці, любві да працы, роднага краю.

У 1920-я гады беларускія падручнікі друкаваліся ў Вільні пераважна ў друкарнях Б. Клецкіна, Я. Левіна, Беларускага выдавецкага таварыства, ТБШ, Беларускага навуковага таварыства, Грамады, Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны і іншых. Акрамя Вільні, беларускія падручнікі выдаваліся таксама ў Мінску, які стаў буйнейшым цэнтрам нацыянальнага кнігавыдання. Толькі ў сярэдзіне 1922 г. агульны тыраж новых падручнікаў дасягнуў там 150 тыс. экзэмпляраў. Падручнікі, выдадзеныя ў БССР, можна было набыць у кнігарні Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні. Сярод іх варта адзначыць наступныя: па мове і літаратуры – “Беларуская мова. Падручнік для тэхнікумаў і самаадукацыі” (Мінск, 1927) А. Багдановіча, “Асноўныя пытанні мовазнаўства. Падручная кніга для настаўнікаў беларускай мовы і студэнтаў-лінгвістаў” (Мінск, 1926) П. Бузука, па матэматыцы – “Элементарная алгебра” Ч. I (Берлін, 1922), Ч. II (М.-Л., 1924) А. Круталевіча, па прыродазнаўстве – падручнікі М. Грамыка, І. Трояноўскага, па геаграфіі – кнігі А. Смоліча, М. Азбукіна, К. Гарабурды і іншыя.

Пэўную вучэбна-метадычную дапамогу заходнебеларускія гімназіі атрымлівалі і з Літвы. Вучні выкарыстоўвалі слоўнікі В. Ластоўскага, якія былі выдадзены ў Коўна (Каўнасе). У каталозе беларускай літаратуры кнігарні “Пагоня” у Вільні насупраць назвы “Слоўнік геаметрычных і трыганаметрычных тэрмінаў і сказаў” (Коўна, 1923), напісанай ім сумесна з К. Дуж-Душэўскім, было адзначана: “Вельмі карысны для беларускіх вучняў і студэнтаў” [21].

Практычнае значэнне для настаўнікаў меў таксама “Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік” В. Ластоўскага (Коўна, 1924). У Літве было надрукавана некалькі падручнікаў, якія пераклаў на беларускую мову К. Дуж-Душэўскі: “Фізіялогія і анатомія чалавека” (1923), “Батаніка” В. Зяленскага (1924). Апошняе выданне было

перапрацавана і дапоўнена. У 1925 г. Беларускі цэнтр у Літве выдаў перакладзены К. Дуж-Душэўскім “Падручнік навейшай гісторыі з планамі” Р. Віпера. Даступнымі для заходнебеларускіх гімназістаў былі таксама кнігі, выдадзеныя беларускімі дзеячамі ў Латвіі.

Безумоўна, што кнігавыданне ў самой Заходняй Беларусі мела шансы для свайго прагрэсіўнага развіцця толькі ў выпадку карэннай змены нацыянальнай палітыкі польскіх урадаў. Аднак нават у такіх неспрыяльных умовах самаахвярнай працай арганізацый, прыватных асоб кнігавыдавецкая справа (найперш у Вільні) была фактарам нацыянальна-культурнага жыцця. Паводле некаторых звестак, усяго ў 1921-1939 гг. выйшлі ў свет 58 падручнікаў, вучэбных кніг, што складала 13% ад агульнага аб’ёму беларускамоўнай друкаванай прадукцыі таго часу [22].

Пад уплывам вызваленчай барацьбы, грамадска-палітычнага руху за дэмакратызацыю адукацыі вызначаўся змест навучання і выхавання ў беларускіх гімназіях і пачатковых школах. Прагрэсіўныя настаўнікі і грамадскія дзеячы ўводзілі ў практычную дзейнасць школ ідэі арганізацыі беларускай працоўнай школы. Найбольш поўна яны адлюстраваны ў працах С. Паўловіча. Аб сваім бачанні мэтаў, задач, зместу выхавання пісаў ён у “Беларускім календары” на 1929 г. і ў брашуры “Аб арганізацыі беларускае працоўнае школы” (Вільня, 1928).

Сутнасць працоўнай школы, паводле яго слоў, заключалася ў выхаванні і чалавека, і грамадзяніна. Ён лічыў патрэбным абагульніць сусветны вопыт і выкарыстаць яго з улікам нацыянальных традыцый. “Трэба, каб у беларускай школе, пабудаванай на запазычаны ўзор, панаваў дух беларускасці, каб яна адпавядала ўсяму жыццю народнаму, псіхіцы і нацыянальным імкненням беларускага народа, каб з яе выходзілі людзі высокай культуры і моцныя барацьбіты за беларускую справу”. Народная школа павінна быць агульнадаступнай, працоўнай і спрыяць гарманічнаму развіццю дзяцей, падрыхтаваць іх да творчай і прадукцыйнай працы ў грамадстве. Аўтар лічыў, што ў працоўнай школе важнае значэнне набывалі фізічная і разумовая праца, грамадскае выхаванне. Усе гэтыя спадзяванні не былі марныя, бо ўжо назіраліся некаторыя поспехі ў станаўленні адзінай працоўнай школы ў БССР.

Адным з прынцыпаў працоўнай школы С. Паўловіч лічыў нацыянальны характар выхавання. Гэта лагічна ўкладвалася ў шматвяковыя традыцыі народнай педагогікі. На працягу многіх стагоддзяў беларуская сялянская сям’я была і яшчэ заставалася тады адзіным ахоўнікам педагагічных традыцый. Таму народная школа не магла не лічыцца з гэтым. Дзеці прыходзілі ў школы з закладзеным у сям’і светаўспрыманнем. На такой аснове патрэбна было далей развіваць

дзяцей. Найбольш аптымальна гэта можна было ажыццявіць ў нацыянальнай школе. Настаўнік павінен быць абавязкова ўраджэнцам дадзенага павета, добра ведаць родную мову вучняў, традыцыі народа, яго эканамічнае, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё. Ад яго адукаванасці, нацыянальнай свядомасці і ведання ўсіх бакоў побыту людзей залежаў поспех навучання і выхавання. З гэтай нагоды прапаноўвалася ва ўсіх сярэдніх навучальных установах і Віленскім універсітэце абавязкова вывучаць беларускую гісторыю, літаратуру, эканамічныя, сацыяльныя, прававыя аспекты жыцця жыхароў краю.

На думку С. Паўловіча, моцны патэнцыял для развіцця пазнавальных здольнасцей вучняў уяўлялі экскурсіі. "Асаблівае значэнне мае тут і тое, што экскурсіі праводзяцца грамадою, калектывам і такім чынам ідзе выхаванне пачуцця грамадскага. Экскурсіі даюць шмат і дзеля ўзбагачэння і пашырэння мовы". Аб выхаваўчым аспекце экскурсіі пісаў ён і ў сваім артыкуле "Да пытання аб асноўных прынцыпах навучання і ўзгадавання ў пачатковай беларускай школе" (Родныя гоні. – 1927. – №1 – 4), які быў надрукаваны пад крыптонімам "С. П.". На яго думку, для фарміравання эстэтычных густаў вучняў шмат маглі даць школьныя спектаклі, вечары.

У цэлым менавіта ў поглядах С. Паўловіча на мэты, задачы, змест выхавання праявіўся дэмакратычны характар яго педагагічных ідэй. Аб шчырай прыхільнасці беларускім нацыянальным інтарэсам сведчыць яго справаздача за 1927/28 навучальны год, калі яму даводзілася часова выконваць абавязкі дырэктара Віленскай гімназіі. "Уся праца ў гімназіі павінна быць арганізавана так, каб вучні атрымлівалі ў нас адпаведныя веды і добрае выхаванне, а сама гімназія па-ранейшаму заставалася галоўным цэнтрам нацыянальна-культурнага адраджэння" [23].

Яшчэ ў 1926 г. у Вільні была надрукавана падрыхтаваная С. Паўловічам "Свяшчэнная гісторыя Старога Завету: Для беларускіх пачатковых школ і малодшых класаў гімназій". Трэба аддаць належнае аўтару, які творча перапрацаваў тэкст Бібліі і падаў яго ў даступнай для ўспрымання вучняў форме. Кніга павінна была стаць універсальнай – яе магла чытаць на роднай мове вясковая і гарадская школьная моладзь.

У 1929 г. у Вільні ў Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны была выдадзена кніга С. Паўловіча "Пішы самадзейна: Развіццё навыку самастойнага пісьма". Сама структура кнігі сведчыць аб высокім вучэбна-метадычным майстэрстве складальніка. Для выпрацоўкі навыкаў самастойнага пісьма вучням дадзены розныя па жанру і зместу практыкаванні з малюнкамі, а таксама ўрыўкі для чытання. У канцы

падручніка быў змешчаны слоўнік цяжкіх па правапісу слоў. У дапаўненне да кнігі С. Паўловіч надрукаваў “Метадычныя ўвагі...”.

Разам з іншымі прадстаўнікамі заходнебеларускай інтэлігенцыі С. Паўловіч рэзка выступіў супраць ўвядзення з 1929/30 навучальнага года ў беларускіх і польска-беларускіх пачатковых школах буквара (лацінкай) С. Любіч-Маеўскага. У сваёй брашуры “Некалькі ўвагі аб беларускім “лемантары” Ст. Любіч-Маеўскага” (надрукавана пад псеўданімам “Паляшук” у 1929 г.) аўтар зрабіў крытычны аналіз буквара і прыйшоў да высновы, што яго выкарыстанне нясло значную шкоду нацыянальнай свядомасці дзяцей. Рашучае “не” было дадзена пераходу на лацінскую азбуку. “Кірыліца зраслася з усім укладам нашага жыцця, з усімі нашымі навуковымі і літаратурнымі дасягненнямі, яна спадарожнік нашага культурнага адраджэння”. Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы вымушана было зняць буквар з карыстання, але ўжо у наступным годзе “папраўленае” выданне зноў паступіла ў школы.

Беларускія прыватныя пачатковыя школы знаходзіліся ў даволі складаных матэрыяльных абставінах, без гарантаванага фінансавання, ва ўмовах пастаяннага адміністрацыйна-паліцэйскага ўціску. Вось што паведамляла ў Галоўную управу ТБШ у чэрвені 1926 г. настаўніца С. Таўлай з в. Рудаўка Слонімскага павета. “Школа размешчана ў маім доме. …Прыходзіцца працаваць у вельмі цяжкіх умовах, без кавалка чорнага хлеба, бо жыву на 3-х дзесяцінах зямлі і не маю каня, а сяляне не могуць утрымліваць школу за свой кошт, бо ўсе выязджалі ў Расію і дагэтуль многія жывуць у зямлянках” [24].

Удасканальваннем форм і метадаў навучальна-выхаваўчага працэсу займаліся не толькі ў Віленскай, але і ў іншых беларускіх гімназіях. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, паступова ішоў працэс беларусізацыі ў Навагрудскай гімназіі. У 1923/1924 навучальным годзе вучнёўскі кантынгент дасягнуў 237 дзяцей. Па сацыяльнаму паходжанню 36,1% былі з сялян, 32,2% – з мяшчан. Аднак праз 2 гады колькасць навучэнцаў рэзка зменшчылася (1 снежня 1925 г. – толькі 138). Пераважную большасць з іх складалі дзеці заходнебеларускіх сялян. Частка былых навучэнцаў-яўрэяў перайшла ў асобную прыватную яўрэйскую школу. У 1925/26 навучальным годзе па-беларуску навучанне праводзілася ў 1-5-х, па-руску – 6-8-х класах. Гімназія мела прыродазнаўчы ўхіл, хоць значнае месца адводзілася і прадметам гуманітарнага цыкла. Акрамя беларускай, рускай, польскай моў, вывучалі там таксама французскую, нямецкую, лацінскую. Шмат клапаціліся пра матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне гімназіі яе арганізатар і дырэктар

Я. Цеханоўскі. Пасля яго ад'езду за мяжу на заробкі абавязкі дырэктара выконваў П. Скрабец.

Вялікім аўтарытэтам сярод вучняў карыстаўся настаўнік А. Данілевіч. У Навагрудскай гімназіі навучэнцы былі ўцягнуты ў працу шэрагу гурткоў – па беларусазнаўству, прыродазнаўству, сусветнай літаратуры. Для паглыблення ведаў па беларускай мове вучні складалі слоўнік да твораў Ядвігіна Ш. (А. Лявіцкага), збіралі фальклор. Вучні першых трох класаў займаліся зборам, распрацоўкай тэрміналогіі мясцовай флоры і фауны, выдавалі рукапісны часопіс "Жаваранак". Хор і аркестр пад кіраўніцтвам кампазітара А. Валынчыка набыў вядомасць нават па-за межамі Навагрудка. У 1927-1930 гг. у Навагрудскай беларускай гімназіі выкладаў маляванне Я. Драздовіч.

Як узгадваў выпускнік гэтай гімназіі А. Анішчык, кіраўніцтва і педагагічная рада звярталі ўвагу не толькі на навучанне, але і на выхаваўчы бок работы, на педагагічнае і фізічнае развіццё моладзі. "Дырэктар Цеханоўскі добра разумеў, што акрамя ведаў, прынцыпаў дабра, сумленнасці дзецям неабходна прывіваць пачуццё, навыкі дысцыпліны, парадку, адказнасці за свае ўчынкі" [25].

Адной з балючых праблем Навагрудскай гімназіі была адсутнасць уласнага памяшкання. Пасля хадайніцтва бацькоўскага камітэта і дырэкцыі мясцовыя ўлады выдзелілі ў 1926 г. адпаведную плошчу для будаўніцтва. "Хутка сотні навучэнцаў разам з настаўнікамі, узяўшы лапаты, дружна сталі капаць канавы для падмурка. Знайшоўся і грамадскі прараб. Бацькі бясплатна збіралі і звозілі каменне з блізкіх вёсак, падвозілі вапну, цэглу ды іншыя будаўнічыя матэрыялы. Па сёлах і мястэчках раз'ехаліся настаўнікі і старэйшыя вучні збіраць ахвяраванні. Хоць сяляне яшчэ не паспелі ачухацца ад вялізных страт, нанесеных вайной, але дзяліліся апошнім. Не было ніводнага выпадку адмовы. Сабранае збожжа прадавалася, а вырučаныя за яго грошы пералічваліся ў фонд на пабудову гімназіі" [26]. Ва ўрачыстай цырымоніі закладкі каменю пад будынак гімназіі у 1928 г. прысутнічаў прэзідэнт Польшчы Ю. Масціцкі. Пасля гэтага ён ахвяраваў на будаўніцтва 3 тыс. злотых. Пазней беларускія паслы дабіліся ў сейме дзяржаўнай датацыі ў суме 200 тыс. злотых. Істотную дапамогу аказалі прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША. Аднак з-за адміністрацыйна-бюракратычных перашкод ажыццявіць праект пабудовы ў пачатку 1930-х гг. так і не ўдалося.

Шырокай культурна-асветніцкай дзейнасцю займалася Клецкая гімназія, якую ўзначальваў Р. Якубёнак. У 1924/1925 навучальным годзе ў 1-4-х класах Клецкай гімназіі вучылася 58 дзяцей, у падрыхтоўчым – 20. Праз год кантынгент вучняў у 5-ці класах павялічыўся да 78 чалавек. А ў

1930/1931 навучальным годзе ў 8-мі класах было 160 навучэнцаў з усёй Заходняй Беларусі [27]. Для дзяцей з незаможных сем’яў былі адкрыты 3 інтэрнаты, іх вызвалялі ад платы за навучанне. Выкладчыкамі там працавалі В. Арэнь, В. Русак, А. Якімовіч, Ю. Мушкат, В. Сініцына, А. Валынчык і іншыя. Да 1930 г. атрымальнікам канцэсіі (дазволу) на дзейнасць гімназіі быў А. Якімовіч, старшыня таварыства “Прасвета”, а з 1930 г. – бацькоўскі камітэт гімназіі. Гэтая навучальная ўстанова мела матэматычна-прыродазнаўчы профіль. Створаны там літаратурны гурток хутка пераўтварыўся ў літаратурна-мастацкі. У навакольных вёсках набылі папулярнасць гімназічны хор і аркестр.

Настаўнікі Клецкай гімназіі імкнуліся выкладаць свае прадметы на належным узроўні. Як узгадваюць выпускнікі ў сваіх успамінах, педагогі па-бацькоўскаму клапаціліся, каб іх выхаванцы глыбока засвойвалі асновы навук і спадчыну агульначалавечай культуры. Рабіліся захады, каб укамплектаваць бібліятэку навуковай, грамадска-палітычнай і мастацкай літаратурай. Вялікую дапамогу ў гэтай справе аказвалі заходнебеларускія дзеячы з Вільні. У бібліятэцы гімназіі аказалася шмат твораў не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры на беларускай, польскай, рускай мовах. Гімназісты мелі магчымасць таксама азнаёміцца з прагрэсіўнымі перыядычнымі выданнямі.

Мясцовае беларускае насельніцтва аказвала падтрымку гімназіі. У маі 1928 г. на сходзе сялян з ваколіц Клецка кіраўнік гуртка ТБШ І. Чарапавіцкі прапанаваў ахвяраваць участкі зямлі для будаўніцтва школьнага будынку. Сяляне горача падтрымалі такую прапанову [28]. Значную дапамогу аказвала секта метадыстаў. 14 верасня 1929 г. пасля чарговага набажэнства святар Ё. Віт перадаў Клецкай гімназіі грошы для інтэрната [29].

Радашковіцкая гімназія імя Ф. Скарыны была адкрыта ў 1922 г. намаганнямі вядомага грамадскага дзеяча, сенатара А. Уласава. Спачатку дырэктарам гімназіі быў А. Вернікоўскі, потым – Ф. Стэцкевіч. Гэтая сярэдняя навучальная ўстанова мела гуманітарны накірунак. У 1925/1926 навучальным годзе ў 1-7-м і падрыхтоўчым класах вучылася 150 юнакоў, дзяўчат з навакольных вёсак і мястэчак. З лістапада 1923 г. у Радашковіцкай гімназіі рэгулярна арганізоўваліся тэатральныя пастаноўкі, выдаваліся рукапісныя часопісы. Пры дапамозе місіі амерыканскіх і беларускіх метадыстаў быў адкрыты інтэрнат для гімназістаў. У 1926 г. пры гімназіі былі адкрыты курсы настаўнікаў пачатковых школ, пазней у час летніх канікулаў збіраліся выкладчыкі беларускіх гімназій. Настаўнікі Радашковіцкай беларускай гімназіі вызначаліся высокім прафесіяналізмам. Сярод іх трэба ўзгадаць Я. Гаўрыліка, які выкладаў

беларускую мову, геаграфію, С. Караля, М. Касцевіча (Краўцова) і іншых. Мясцовая арганізацыя ТБШ аказвала дапамогу гімназіі – арэндавала памяшканне, забяспечвала палівам, выдавала стыпендыі вучням з незаможных сем’яў. Усяго ў 1922-1929 гадах у Радашковіцкай гімназіі вучылася каля 800 чалавек, з іх 86 атрымалі “матуру”.

Рабіліся захады адкрыць беларускую гімназію ў Глыбокім. У 1926 г. Глыбоцкая акруговая ўправа ТБШ (старшыня – П. Мятла) лічыла гэта найпершай задачай. Быў прыняты заклік да заходнебеларускай грамадскасці, беларускіх суполак за межамі Польшчы аб падтрымцы гэтай акцыі. Быў наладжаны збор ахвяраванняў, аднак польскія ўлады не далі дазволу на адкрыццё гімназіі. Кіраўніцтва Таварыства планавала адкрыць гімназіі ў Гродна і іншых гарадах краю, але зрабіць гэта не ўдалося.

На педагагічныя погляды настаўнікаў беларускіх гімназій і пачатковых школ аказвалі ўплыў поспехі ў галіне адукацыі ў БССР. У 1920-я гады органы народнай адукацыі, грамадскасць рэспублікі правялі значную работу па разгортванню сеткі школ і ўмацаванню іх вучэбна-матэрыяльнай базы. Там ствараліся перадумовы для ажыццяўлення ўсеагульнай пачатковай адукацыі. На практыцы ўвасабляліся асноўныя прынцыпы адзінай працоўнай школы: бясплатнасць, абавязковасць, політэхнічны характар, агульнадаступнасць, бессаслоўнасць, абавязковая свецкасць на ўсіх ступенях навучання, перавага дзяржаўных школ, навучанне на роднай мове, раўнапраўнасць мужчын і жанчын, пераемнасць, сувязь з грамадскім жыццём, дэмакратычная і матэрыялістычна-гуманістычная накіраванасць. Таму многае з лепшага вопыту выкарыстоўвалася і творча развівалася прагрэсіўнымі настаўнікамі ў Заходняй Беларусі. Розніца палітычных поглядаў настаўнікаў, ідэалагічных платформ культурна-асветніцкіх арганізацый прадвызначала выбіральнасць асноўных прынцыпаў адзінай працоўнай школы. Аднак вызначальныя рысы (дэмакратызм, гуманістычная накіраванасць, сувязь з грамадскай практыкай, вучоба на роднай мове вучняў) знайшлі сваё ўвасабленне ў навучальным і выхаваўчым працэсе беларускіх гімназій і пачатковых школ.

Атмасфера глыбокай павагі да дэмакратычных, нацыянальных каштоўнасцей спрыяла разгортванню гімназічнага руху ў заходнебеларускім рэгіёне. Ужо ў пачатку 1920-х гадоў у Віленскай гімназіі быў створаны вучнёўскі гурток, дзейнасць якога мела культурна-асветніцкі характар. Гурток выдаў 7 нумароў часопіса “Маладое жыццё”, мэтай якога з’яўлялася “гартаванне маладых беларускіх сіл на змаганне за духоўнае адраджэнне Беларусі і закліканне ў свае рады новых байцоў за

гэтую ж ідэю" [30]. Менавіта там дэбютавалі маладыя паэты Н. Арсеннева, Х. Ільяшэвіч.

У 1922 г. у Віленскай гімназіі выходзіў вучнёўскі літаратурны часопіс "Зорка". У адным з нумароў быў змешчаны верш "Досыць спаць!", які заклікаў да нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Аналагічныя вучнёўскія газеты і часопісы рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку выдаваліся таксама ў Радашковіцкай, пазней – Клецкай гімназіях. Як правіла, пасля выхаду 1-2 нумароў яны забараняліся польскімі ўладамі. Потым навучэнцы Віленскай гімназіі выдавалі таксама друкаваныя і рукапісныя часопісы "Рунь", "Покліч", "Золак, "Васілёк", "Усход", "Наперад", "Вучнёўскі звон".

З 1922 г. у Віленскай гімназіі нарадзіліся традыцыі скаўцкага руху. Яго ініцыятарамі былі С. Рак-Міхайлоўскі, А. Луцкевіч, А. Смоліч, М. Гарэцкі, Ф. Аляхновіч і іншыя дзеячы заходнебеларускага грамадства. Былі створаны 4 дружыны. Нават пасля забароны іх польскімі ўладамі старшакласнікі прапагандавалі ідэі скаўцкага руху ў час летніх канікулаў у вёсках. Скаўты займаліся нацыянальна-патрыятычным выхаваннем. У 1926 – 1929 гг. у жаночым інтэрнаце ў Вільні пры падтрымцы амерыканскіх баптысцкіх арганізацый дзейнічала дзявочая скаўцкая дружына "Сёстры вогнішча".

З сярэдзіны 1920-х гадоў ажывіўся культурна-асветніцкі напрамак вучнёўскай самадзейнасці. У Віленскай гімназіі дзейнічалі тэатральны і драматычны гурткі. У 1926-1927 гадах Я. Драздовіч наладзіў там мастацкую майстроўню. У гэтай студыі займаліся Р. Семашкевіч, М. Васілеўскі, В. Сідаровіч і іншыя здольныя да малявання вучні. Многія з навучэнцаў усведамлялі, што сапраўднай прафесійнай адукацыі ў Заходняй Беларусі ім не атрымаць, таму ў пачатку 1930-х гг. нелегальна перайшлі ў БССР, дзе працягвалі вучобу ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме [31]. Многія вучні былі заняты ў духавым і струнным аркестрах. Р. Шырма, які з 1926 г. працаваў выкладчыкам спеваў у гімназіі і выхавацелем у інтэрнаце, арганізаваў вучнёўскі хор. Гэты калектыў шмат зрабіў у справе папулярызацыі беларускай народнай песні.

Паступова гімназісты ўцягваліся ў нацыянальна-вызваленчую барацьбу. Кожны год урачыста адзначалася свята ў гонар абвяшчэння незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 г. Ва ўсіх беларускіх гімназіях, у асяроддзі студэнтаў шырока выкарыстоўвалася нацыянальная сімволіка – герб "Пагоня", бела-чырвона-белы сцяг. Яна была элементам школьна-гімназічнага касцюма беларускіх вучняў.

Як сведчыць справаздача польскай паліцыі за 1926 г., у час святаў і канікулаў вучні-гурткоўцы Віленскай гімназіі агітавалі на карысць

Грамады. Выдадзены ў снежні таго ж года першы нумар часопіса “Наперад” адкрываўся радкамі “Мы выйдзем шчыльнымі радамі...”. Ідэі Грамады імпанавалі гімназістам. Пасля яе разгрому польскімі ўладамі ў беларускіх гімназіях адбываліся забастоўкі пратэсту. 10 сакавіка 1927 г. па ініцыятыве вучнёўскага гуртка была праведзена забастоўка ў Радашковіцкай гімназіі. Пазней там быў наладжаны збор сродкаў для палітзняволеных.

Гімназісты-камсамольцы аказвалі пэўны ўплыў на фарміраванне светапогляду навучэнцаў, арганізоўвалі культурна-асветніцкую работу. У Віленскай гімназіі найбольш актыўнымі ўдзельнікамі камсамольскага падполля з’яўляліся Я. Міско, В. Таўлай, Я. Урбановіч, П. Радзюк, А. Салагуб, М. Васілёк і іншыя. Вучнёўскі гурток быў легальнай пляцоўкай для іх дзейнасці.

Усё гэта давала падставы польскім уладам называць гімназіі “логавам камунізма”. У справаздачы камандавання польскага корпуса ДОК-III за 3-ці квартал 1928 г. падкрэслівалася, што “Віленская і Радашковіцкая гімназіі выхоўвалі моладзь у камуністычным духу” [32]. Таму ўлады звольнілі многіх настаўнікаў, асабліва прыхільнікаў рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў.

У ходзе школьных забастовак вучні праяўлялі высокі ўзровень нацыянальнай свядомасці. Вялікі размах набыла забастоўка 20 снежня 1928 г. Была прынята рэзалюцыя з асуджэннем рэпрэсій польскіх улад. “Мы, дзеці беларускіх сялян і рабочых, з самага пачатку існавання гімназіі змагаемся за тое, каб адукацыя, якую мы атрымоўваем у школе, дала нам магчымасць быць вернымі змагарамі за справу вызвалення беларускіх працоўных мас, каб атрыманыя веды аддаць барацьбе, якую вядзе беларускі селянін і рабочы супраць фашызму і польскага імперыялізму за вызваленне прыгнечаных мас, за рабоча-сялянскую Беларусь” [33]. Асуджаны былі і дзеянні Р. Астроўскага, які пасля судовага працэсу Грамады адстойваў пазіцыю супрацоўніцтва з польскім урадам “санацыі”.

Больш моцныя хваляванні назіраліся ў гімназіі 27 лютага 1929 г. Для “уціхамірвання” выступлення была выклікана паліцыя, праведзены выключэнні гімназістаў. У знак пратэсту супраць гэтага пракацілася хваля забастовак у іншых беларускіх гімназіях. У Навагрудскай гімназіі выступленне працягвалася 2 тыдні. “Забастоўка мела спакойны характар, сярод настаўнікаў панавала маральнае прыгнечанне і боязь аб закрыцці гімназіі”, – адзначалася ў справаздачы масцовых польскіх уладаў [34]. Падаўленне школьных забастовак прынесла значныя страты – масавыя выключэнні вучняў. Пасля гэтага многія з іх (Я. Скурко (М. Танк),

В. Таўлай і іншыя) працягвалі прымаць актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе.

Трэба адзначыць неадназначнасць вынікаў школьных акцый пратэсту. З аднаго боку, яны абуджалі нацыянальную свядомасць навучэнцаў, з'яўляліся сродкам загартоўкі змагароў за беларускія інтарэсы. З другога боку, нягледзячы на шчырыя намаганні некаторых дзеячаў КПЗБ, забастоўкі насілі ў пэўнай ступені дэструктыўны характар, бо заканчваліся пераважна масавымі выключэннямі навучэнцкай моладзі, а пазней – нават закрыццём устаноў. Лічым, што апошняе было вынікам лявацкага ўхілу у заходнебеларускім камуністычным руху.

Забастоўкі з'яўляліся для польскіх улад толькі фармальнымі падставамі для ганенняў. Асноўнай прычынай было імкненне нанесці знішчальны ўдар па заходнебеларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху. Беларускія гімназіі якраз былі пляцоўкамі грамадска-палітычнага жыцця краю. Яны таксама перашкаджалі ажыццяўляць нацыянальна-культурную асіміляцыю беларускага насельніцтва.

Па меры пераходу ў наступленне ў БССР супраць "нацыянал-дэмакратызму" з канца 1920-х гадоў савецкая прапаганда пачала называць заходнебеларускія гімназіі "расаднікамі буржуазнага нацыяналізму". Аднак ніякіх падстаў для такіх сцвярджэнняў не было. Форма кіравання, змест і характар навучання, выхавання ў гімназіях сведчылі аб іх адмежаванасці ад старой буржуазнай школы з нацыянальнымі, сацыяльнымі і рэлігійнымі антаганізмамі. Школы былі даступны дзецям працоўных. Іншая справа, што польскія ўлады не давалі магчымасці гэта рэалізаваць. Вучні выхоўваліся не нацыяналістамі, а патрыётамі сваёй Айчыны. Гэта дасягалася засваеннем як нацыянальных, так і сусветных, агульначалавечых духоўных каштоўнасцей.

З гімназій выйшла цэлая плеяда відных дзеячаў. Віленскую гімназію скончылі мастакі М. Васілеўскі, Р. Семашкевіч, В. Сідаровіч, паэты Н. Арсеннева, Х. Ільяшэвіч, А. Салагуб, дзеячы грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі І. Дварчанін, А. Клімовіч, Я. Шутовіч, М. Пецюкевіч і многія іншыя. Згаданы паэт В. Таўлай таксама там вучыўся некалькі гадоў. З Радашковіцкай школай звязаны жыццёвы шлях другога славутага заходнебеларускага паэта – М. Танка. Вучнямі Навагрудскай гімназіі з'уляліся будучыя вучоныя Л. Барысаглебскі, Б. Кіт і іншыя. Па-рознаму складаўся лёс тых, хто вучыўся ў гімназіях: хтосьці перайшоў у Савецкую Беларусь (большасць з іх стала ахвярай сталінізму), іншыя выехалі вучыцца на Захад і там засталіся, частка – працягвала жыць у Заходняй Беларусі (некаторыя потым таксама апынуліся ў эміграцыі). У

любых абставінах яны імкнуліся быць вернымі тым прынцыпам, якія ім прывівалі настаўнікі ў гімназіях.

У цэлым беларускія гімназіі ўнеслі свой уклад у супрацьдзеянне палітыцы паланізацыі. Яны фарміравалі кадры нацыянальнай інтэлігенцыі, якая разумела неабходнасць захавання адукацыі на роднай мове, культуры, традыцый народа, далучэння да вызваленчай барацьбы. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы дзейнасці, гімназіі з'яўляліся вучэбна-метадычнымі цэнтрамі (асабліва Віленская), нацыянальнымі асяродкамі культурна-асветніцкага і палітычнага жыцця Заходняй Беларусі.

# РАЗДЗЕЛ III. ЗАНЯПАД БЕЛАРУСКАГА АСВЕТНІЦТВА Ў 1930-я ГАДЫ

## Глава 1. Канчатковая ліквідацыя беларускіх школ

Адыход аўтарытарнага рэжыму Ю. Пілсудскага на мяжы 1920-30-х гадоў ад палітыкі нязначных уступак беларусам у галіне адукацыі да поўнай і незваротнай ліквідацыі іх нацыянальных школ быў невыпадковы. Выклікана гэта было неабходнасцю нанесці знішчальны ўдар па заходнебеларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху. Яскрава аб гэтым выказаўся міністр веравызнанняў і грамадскай асветы Я. Янджэевіч: "Пакуль беларускія школы не перастануць быць антыдзяржаўнымі ачагамі, датуль да іх будуць адмоўныя адносіны». Сапраўдныя мэты ўрада "санацыі" старанна маскіраваліся. "Мы не хочам іх асіміляваць, мы толькі хочам, каб беларусы цягнуліся да нас, а не да Масквы", – заяўляў ад імя кіруючых колаў згаданы чыноўнік [1]. Магчымасць існавання беларускіх школ была ім пастаўлена ў прамую залежнасць ад паслухмянасці, пакорнасці, добрых адносін да польскіх улад. "Калі беларусы зразумеюць неабходнасць саюза з Польшчай, то тады будуць мець свае школы", – так была вызначана перспектыва беларускай нацыянальнай адукацыі. Безумоўна, што такія абяцанні з´яўляліся толькі сродкамі дэзарыентацыі, увядзення ў зман. Нельга было спадзявацца на змяненне стаўлення да запатрабаванняў беларусаў.

Выразна адлюстраваў у публіцыстыцы пазіцыю ўлад на беларускае пытанне Т. Галуўка: "Ідэалам беларускага селяніна з'яўляецца польская пачатковая школа, дзе вывучалі б і беларускую мову". Пры гэтым лічыў існуючыя беларускія гімназіі ў Вільні, Навагрудку і Клецку "ачагамі беларускага шавінізму і камунізму" [2]. Паводле Т. Галуўкі, асіміляцыйныя мерапрыемствы павінны былі прывесці да такога

становішча, каб “граніца Польскай дзяржавы была адначасова мяжой заходняй культуры” [3]. Падобных поглядаў аб магчымасці асіміляцыі беларусаў прытрымліваліся не толькі палітыкі з кіруючага лагеру, але і польская чыноўнікі ў Заходняй Беларусі.

Змены міжнароднай сітуацыі таксама прадвызначылі паварот у адносінах да беларускіх школ. Ліга нацый страціла здольнасць аказваць уздзеянне за парушэнні правоў няпольскага насельніцтва. Зручным для польскага ўрада стала і згортванне палітыкі беларусізацыі, культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў БССР. Агульныя перапісы насельніцтва 1921, 1931 гг. праводзіліся ў заходнебеларускіх землях з шырокім выкарыстаннем адміністрацыйна-паліцэйскіх мер, злоўжыванняў, фальсіфікацый для таго, каб даказаць дамінуючае становішча польскага насельніцтва на “усходніх крэсах”. Наўмыснае змяншчэнне лічбы беларускага насельніцтва было выгаднай падставай для непрызнання яго патрабаванняў пра нацыянальныя школы, культурна-асветніцкія ўстановы [4].

Ва ўмовах, калі разгортваліся ганенні супраць нацыянальна-вызваленчага руху, знішчаліся і беларускія школы. У выніку амаль поўнага спынення арганізаванага руху за беларускія школы польскія ўлады атрымалі магчымасць значна паскорыць гэты працэс. У 1931 г. яны закрылі беларускую гімназію ў Клецку. Справа ў тым, што не была выдадзена канцэсія на яе ўтрыманне на 1931/1932 навучальны год. Бацькоўскі камітэт на сваім агульным сходзе 14 чэрвеня 1931 г. прыняў з гэтай нагоды адпаведную рэзалюцыю, у якой канстатаваў, што гімназія “за 7 гадоў свайго шматпакутнага існавання пацвердзіла сваю жыццяздольнасць” і што яе закрыццё “будзе вялікай стратай” [5]. Аднак лёс гімназіі ўжо быў вырашаны. У жніўні 1931 г. польская дэфензіва выкрыла падпольную дзейнасць гімназістаў і правяла арышты. З абвінаваўчага акту вынікала, што ў гімназіі ў Клецку існавала 15 падпольных ячэек (па 3-5 чалавек у кожнай), куды ўваходзіла большасць вучняў 4-8-х класаў. У канцы 1932 г. адбылося некалькі судовых працэсаў. Больш 20 гімназістаў атрымалі розныя тэрміны турэмнага зняволення [6]. Былі таксама ўведзены новыя абмежаванні для стварэння беларускіх школ. Дэкрэтам прэзідэнта Польшчы, выдадзеным у лістападзе 1930 г., мову выкладання ў школе можна было змяніць не раней 7 гадоў пасля прыняцця папярэдняга рашэння аб гэтым. Такім чынам, нельга было пры жаданні насельніцтва пэўнай мясцовасці пераўтварыць польскія ці польска-беларускія школы ў беларускія.

Усеабдымная школьная рэформа, да якой польскі ўрад прыступіў у пачатку 1930-х гадоў, не ўнесла нейкіх кардынальных змен у стан

беларускіх школ. Фактычна яна замацавала ў адукацыі тыя палажэнні, якія ўкладваліся ў агульнае рэчышча палітыкі рэжыма "санацыі" па дзяржаўнай асіміляцыі беларусаў. Прыярытэтнымі задачамі ў ажыццяўленні рэформы былі не столькі патрэбы сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця, колькі палітычныя. Асімілятарскія планы прысутнічалі ва ўсім змесце, характары навучальна-выхаваўчага працэсу і да ўсталявання рэжыма "санацыі", але тады яны не былі так тэарэтычна сфармуляваны і завуаліраваны.

Ідэя дзяржаўнага ці грамадзянскага выхавання стала вызначальнай у дзейнасці навучальных установаў. У яе абгрунтаванні асабліва пастараліся міністры веравызнанняў і грамадскай асветы С. Чэрвінскі, Я. Янджэевіч і іншыя прадстаўнікі кіруючага лагера. Яны часта заяўлялі, што ўсялякае паразуменне з няпольскім насельніцтвам адносна пытанняў адукацыі магчыма толькі пры наяўнасці "выхавання моладзі ў актыўных лаяльных адносінах да польскай дзяржавы" [7]. Варта пагадзіцца з высновай сучаснага польскага даследчыка М. Семаковіча, што ў 1930-я гг. рэжым "санацыі" пераняў эндэцкае бачанне праблем беларускай адукацыі [8].

У час абмеркавання ў польскім сейме школьных законапраектаў прадстаўнікі няпольскага насельніцтва (пасля парламенцкіх выбараў 1930 г. інтарэсы беларусаў адстойваў толькі пасол Ф. Ярэміч) выказвалі глыбокую занепакоенасць далейшым лёсам адукацыі на іх роднай мове. Яны не мелі сумненняў наконт палітычных матываў у ажыццяўленні школьнай рэформы, лічылі яе значным крокам па ўмацаванню пазіцый выключна польскіх навучальных установаў. Польскі ўрад тлумачыў неабходнасць яе правядзення цывілізатарскай місіяй.

11 сакавіка 1932 г. былі прыняты законы "Аб арганізацыі школьнай справы", "Аб прыватных школах, навучальных і выхаваўчых установах". Новае заканадаўства вызначыла наступную структуру сістэмы адукацыі: усеагульная пачатковая (першая ступень – 4, другая – 6, трэцяя – 7 класаў), агульнаадукацыйная сярэдняя (4 класы гімназіі і 2 – ліцэя), прафесійная, вышэйшая. Польская дзяржава дэкларавала гарантыі для ўсіх грамадзян аб вучобе дзяцей у школах больш высокай ступені. На практыцы ажыццявіць гэта не ўдалося, бо ў сельскай мясцовасці большасць склалі пачатковыя школы 1 і 2-й ступеняў.

Заканадаўства абвясціла пачатковае навучанне дзяцей з 7-гадовага ўзросту абавязковым. На самой справе Польская дзяржава так і не змагла гэта забяспечыць, асабліва ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Менавіта пачатковая адукацыя павінна была паскорыць дэнацыяналізацыю дзяцей у гэтых рэгіёнах. Аднак поўнасцю рэалізаваць гэта на практыцы не ўдалося.

Рэформа выразна вызначыла адыход ад пераемнасці і бесперапыннасці ў навучанні. Заходнебеларускае грамадства, якое было пераважна сялянскім, страціла шансы значна паправіць свой адукацыйны ўзровень. Недастатковая матэрыяльная забяспечанасць, пастаянныя перашкоды з боку мясцовых улад, шматступенчатасць сістэмы адукацыі абмежавалі доступ да сярэдняй і вышэйшай школы. Там была даволі высокая плата за вучобу. У 1931/32 навучальным годзе толькі ўступны ўзнос у польскую дзяржаўную гімназію складаў 223 злотых. Вельмі ўзрасла і плата за навучанне ў ВНУ. Для студэнтаў адзінай у Заходняй Беларусі вышэйшай школы – Віленскага універсітэта імя С. Баторыя – з 1932 г. уступны ўзнос павялічыўся да 270 злотых, за 2-гі і 3-ці курсы ўносілі адпаведна 250 і 220, за кожны наступны – 200 злотых [9]. Калі ўлічыць, што на рынку за карову плацілі 100-200 злотых, то вучыцца маглі толькі дзеці заможных сялян. З-за немагчымасці заплаціць такія вялікія сумы ў пачатку 1933 г. з універсітэта выключылі шмат студэнтаў.

Новыя законы ўзмацнілі дзяржаўны кантроль за прыватнымі школамі. Улады атрымалі магчымасць закрываць іх не толькі пры недастатковым узроўні вучэбна-выхаваўчай працы ў апошнія 3 гады, але і ў выпадку, калі яна адбывалася ў "нелаяльным да дзяржавы духу, калі школа не супрацьдзейнічала шкодным уплывам" на моладзь [10]. Школьныя чыноўнікі займелі неабмежаваныя правы ў зацвярджэнні ці адхіленні кандыдатаў на пасады дырэктараў, настаўнікаў прыватных навучальных устаноў. Іх правяралі не толькі на наяўнасць адпаведнай прафесійнай кваліфікацыі, але і на палітычную лаяльнасць да рэжыму "санацыі". З пашырэннем адміністрацыйнага ўціску на прыватныя школы беларусы фактычна страцілі магчымасць іх стварэння.

"Тупіковымі" з'яўляліся прафесійныя школы – навучэнцы пасля іх сканчэння не маглі прадоўжыць вучобу. У большасці быў 1-гадовы курс навучання, у рамесніцкіх школах тэрмін вучобы вагаўся ад 2 да 4 гадоў. Разам з сельскагаспадарчымі яны былі найбольш распаўсюджанымі ў Заходняй Беларусі. У ходзе правядзення рэформы было адкрыта некалькі навучальных устаноў, якія рыхтавалі рабочых для сельскай гаспадаркі і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Іх выпускнікі не мелі ніякіх шансаў трапіць у сярэднія і вышэйшыя школы. Утрымлівалі іх розныя польскія арганізацыі. Наогул, прафесійныя школы не змаглі задаволіць заходнебеларускія землі дастатковай колькасцю кваліфікаваных рабочых. Гэта часткова кампенсавалася каланізацыйнай перасяленчай палітыкай польскіх урадаў.

У ходзе рэфармавання не ўдалося вырашыць і праблему забеспячэння школ у Заходняй Беларусі педагагічнымі кадрамі. Калі ў

1929/30 навучальным годзе там дзейнічалі 15 настаўніцкіх семінарый, то пасля 1932 г. большасць з іх была скасавана – з-за пераходу да новай структуры падрыхтоўкі кадраў праз 3-гадовыя педагагічныя ліцэі і г. зв. 2-гадовыя педагогіўмы.

Рэформа адукацыі прывяла да поўнага заняпаду беларускіх школ. У 1932 г. у Вільні была закрыта беларуская настаўніцкая семінарыя імя Ф. Багушэвіча (дзейнічала з 1930 г.). У тым жа годзе была ліквідавана адзіная ўцалелая прыватная пачатковая школа з беларускай мовай навучання – у вёсцы Шаўляны Браслаўскага павета. Такі лёс напаткаў і дзяржаўныя школы. Вясной 1933 г. у Дзісенскім, Слонімскім, Гродзенскім і іншых паветах сталі польскімі беларускія і польска-беларускія школы. Калі ў 1930/31 навучальным годзе ў краі налічвалася 21 беларуская, 41 польска-беларуская пачатковая школа, то пасля 1932 г. іх колькасць значна зменшылася. У 1933/34 навучальным годзе толькі ў 16 польскіх пачатковых школах вывучалася беларуская мова ў якасці прадмета [11]. Свавольствам уладаў спрыяў агульны характар новага школьнага заканадаўства, асобныя палажэнні якога можна было адвольна тлумачыць.

Немагчымасць развіцця прыватнай адукацыі была вынікам цяжкага сацыяльна-эканамічнага становішча заходнебеларускай вёскі. Ішло агульнае збядненне сялян. У пачатку 1930-х гг. беднякі складалі каля 70%, серадлякі – 23%, заможныя сяляне – больш 6% [12]. Ураджаі збожжавых у бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарках у 1930-я гг. складалі каля 7 ц/га [13]. Многія сяляне не мелі коней ці нават каровы. Яны вымушаны былі займацца падзённай работай, працаваць за частку ўраджаю. Стан сельскагаспадарчай вытворчасці асуджаў заходнебеларускіх сялян на паўгалоднае існаванне.

Пад выглядам дакладнага выканання новых законаў былі зроблены захады па ліквідацыі дзвюх беларускіх гімназій – Віленскай і Навагрудскай. Улічваючы рознагалоссі ў асяроддзі заходнебеларускіх дзеячаў, школьныя ўлады здолелі пераўтварыць іх у 1932 г. у філіялы дзяржаўных гімназій з польскай мовай выкладання. З набыццём статуса дзяржаўных гімназіі часткова папраўілі сваю вучэбна-матэрыяльную базу, аднак страцілі ранейшую самастойнасць. Узмацніўся палітычны кантроль за “добранадзейнасцю” вучняў і настаўнікаў Віленскай гімназіі, многія з іх былі вымушаны развітацца з вучобай ці працай. Польскія ўлады ўзялі ў свае рукі падбор педагагічных кадраў. Пачалося выкладанне па-польску ўсеагульнай гісторыі, геаграфіі, фізкультуры і некаторых іншых прадметаў. Былі ўведзены заняткі па ваеннай падрыхтоўцы, дзе ў якасці выкладчыкаў выступалі польскія вайскоўцы.

Аднак наступ на ўцалелыя беларускія гімназіі працягваўся. У 1934 г. была закрыта польскімі ўладамі беларуская гімназія ў Навагрудку. Гэта выклікала абурэнне прагрэсіўнай беларускай і польскай грамадскасці. Нягледзячы на пратэсты, рашэнне аб ліквідацыі Навагрудскай гімназіі не было адменена. Такім чынам, на ўвесь край засталася адна Віленская беларуская гімназія – філіял польскай сярэдняй школы імя Ю. Славацкага.

На наш погляд, курс на поўнае знішчэнне беларускіх школ з'яўляўся лагічным вынікам захадаў аўтарытарнага рэжыма Ю. Пілсудскага па адмаўленню ад міжнародных абавязацельстваў, ад забеспячэння канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян. Хоць ранейшыя гарантыі былі пацверджаны як у новай канстытуцыі Польшчы, адобранай сеймам 26 студзеня 1934 г., так і ў канстытуцыйным законе ад 23 красавіка 1935 г., аднак урад не збіраўся іх выконваць. На пасяджэнні Лігі нацый у Жэневе ў кастрычніку 1934 г. міністр замежных спраў Польшчы Ю. Бэк заявіў аб адмове ўрада выконваць абавязацельствы аб задавальненні патрабаванняў няпольскага насельніцтва па Версальскаму трактату 1919 г. Гэтае грубае парушэнне норм еўрапейскай супольнасці фактычна пазбавіла рэжым "санацыі" ад усялякай адказнасці за нацыянальны ўціск жыхароў Заходняй Беларусі.

У такой абстаноўцы рэформа адукацыі 1932 г. умацавала арганізацыйныя, вучэбна-метадычныя асновы польскіх школ у Заходняй Беларусі. Дзеці беларусаў маглі атрымаць абмежаваную адукацыю толькі ў польскіх навучальных установах. Поўная выпрацоўка праграмнага забеспячэння рэформы была завершана толькі ў сярэдзіне 1930-х гадоў. У адрозненне ад ранейшых, новыя праграмы польскіх школ былі больш звязаны з грамадскай практыкай, улічвалі рэгіянальныя і мясцовыя асаблівасці. Аднак у аснову ўсёй вучэбна-выхаваўчай работы былі пакладзены рэлігійнае навучанне, нацыяналістычныя і мілітарысцкія ідэі. Гэта павінна было спрыяць ажыццяўленню адной з ідэалагічных мэт рэформы – сфарміраваць "грамадзяніна, які ўсведамляе свае задачы і абавязкі перад дзяржавай як найвышэйшай каштоўнасцю", лаяльнага да існуючага палітычнага рэжыму, здольнага "не толькі абараняць, але і працаваць на яго" [14]. Аўтары асобных падручнікаў імкнуліся выкарыстоўваць станоўчыя напрацоўкі польскай і замежнай педагогікі, пазбягаць адкрытай прапаведзі ідэалагічных пастулатаў. Часцей за ўсё такія падручнікі не прапускаліся ў друк міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы, якое патрабавала адпаведнай перапрацоўкі.

Каталіцкая царква прыклала шмат намаганняў па ўмацаванню свайго ўплыву ў школе. Было выдадзена афіцыйнае ўказанне аб распаўсюджванні ў школах спецыяльнай клерыкальнай літаратуры. У 1935 г. было

надрукавана распараджэнне міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы аб тым, што ўсе прадметы павінны закранаць пытанні рэлігіі.

Немалая ўвага ў польскіх школах надавалася прапагандзе культу асобы кіраўніка дзяржавы Ю. Пілсудскага. Ужо ў першых класах настаўнікі павінны былі знаёміць вучняў з партрэтамі прэзідэнта, маршалка, дзяржаўнай сімволікай (герб, сцяг, гімн). Гэтая праца пранізвала ўвесь вучэбна-выхаваўчы працэс у школах. Так, на першым месцы ў плане выхаваўчай работы ў 1932/33 навучальным годзе сярод вучняў 6-га класа польскай гімназіі ў Пінску была пазначана наступная задача: “Характарызаваць дзейнасць маршалка як ідэальны прыклад самаадданай грамадзянскай службы на карысць дзяржавы” [15].

Рэлігійныя і нацыянальныя польскія ідэі настойліва прывіваліся ў розных формах пазакласнай работы: на вечарах, маніфестацыях, у час правядзення ваенізаваных паходаў і г. д. Займаліся гэтым у Заходняй Беларусі шматлікія польскія культурна-асветніцкія арганізацыі, клерыкальныя дзіцячыя ўстановы, гурткі. Там выкарыстоўвалі прывабныя, з улікам узросту і інтарэсаў, мерапрыемствы – святочныя (часцей – рэлігійныя) абрады, бясплатныя кінафільмы і іншыя. Скаўцкія (харцэрскія) дружыны выхоўвалі дзяцей у паслухмянасці да існуючага рэжыму, рэлігійнай пакорнасці.

Найбольшую вагу ў пашырэнні гэтых ідэй у навучальным працэсе польскіх школ складалі прадметы гуманітарнага цыкла. Па-ранейшаму важнае значэнне надавалася вывучэнню польскай мовы. У пачатковай школе 3-й ступені ў параўнанні з 1920-мі гадамі колькасць вучэбнага часу на польскую мову павялічвалася з 40 да 43 гадзін у тыдзень ва ўсіх класах, хоць агульная колькасць гадзін зменшылася з 191 да 183 [16].

На ўроках гісторыі дзяржаўнасць, незалежнасць краіны разглядаліся як адзіны шлях да “шчасця і росквіту польскай нацыі”. Зыходзячы з інтарэсаў менавіта палякаў, гэта можна прызнаць нармальнай з’явай для народа, які аднавіў сваю дзяржаўнасць. Аднак ва ўмовах, калі ў складзе краіны знаходзіліся вялізарныя няпольскія этнічныя тэрыторыі, пастаноўка пытання ў такім выглядзе была непрыймальнай. Права на самавызначэнне заходнебеларускіх зямель не прызнавалася. Толькі асобныя фрагменты беларускай гісторыка-культурнай спадчыны згадваліся ў ходзе вывучэння гісторыі Польшчы. Рэкамендавалася настаўнікам часцей выдзяляць сведчанні аб тым, што беларусы ў мінулым уносілі свой уклад у станаўленне польскай дзяржаўнасці. У ходзе працяглай дыскусіі ў польскім педагагічным друку была выпрацавана адзіная пазіцыя аб дапушчэнні выкладання беларускім дзецям іх айчыннай гісторыі, але на польскай мове. Вучням прапаноўвалася сфальсіфікаваная

па зместу, чужая па мове мінуўшчына. Хоць і павольна, але гэта ўкаранялася ў школу, што прыносіла значную шкоду нацыянальнай свядомасці навучэнцаў.

У свядомасці палякаў ці паланізаваных беларусаў міжваеннага часу існуючыя школы былі роднымі, для беларусаў – пераважна чужымі. Яскрава гэта адлюстраваў Я. Брыль у аповесці “Сірочы хлеб”. Нават наглядная дзяржаўная атрыбутыка ў класе ўспрымалася праз прызму стэрэатыпаў, пануючых у асяроддзі заходнебеларускага сялянства. “А на сцяне паміж вокнамі – вусаты пан Пілсудскі, які прывёў сюды ўсіх паноў з усімі іх падаткамі, стрэльбамі і “элементажамі” [17]. Сярод настаўнікаў былі і такія, што “білі лінейкамі ў лапу, ставілі на калені, а за большыя правіны – на гароху, трымалі вучняў пасля ўрокаў у г.зв. козе” [18], прымянялі іншыя пакаранні. Аднак нельга сцвярджаць, што эфектыўнасць укаранення гэтых ідэй у навучанне і выхаванне была ўжо высокай. Настаўнікі самакрытычна прызнаваліся, што вучні слаба ведалі гісторыю, геаграфію ці польскую мову. Таму да сярэдзіны 1930-х гадоў польская школа ў Заходняй Беларусі яшчэ не стала пляцоўкай поўнай асіміляцыі дзяцей.

Да таго ж польская дэмакратычная грамадскасць нярэдка выступала супраць празмернай насычанасці навучальнага працэсу нацыяналістычнымі і клерыкальнымі ідэямі. Сярод настаўнікаў, якія працавалі ў польскіх школах у Заходняй Беларусі, былі і такія, якія імкнуліся выхоўваць у вучняў крытычныя адносіны да рэлігіі і нацыяналізма, прывіваць гуманістычна-дэмакратычныя каштоўнасці. Яны стараліся падбіраць дыдактычны матэрыял, які не быў заідэалагізаваны. Пры вывучэнні прыродазнаўства імі выкарыстоўваліся наступныя формы працы – экскурсіі, гутаркі.

Сярод настаўнікаў, якія працавалі ў польскіх школах у Заходняй Беларусі, былі і сапраўдныя польскія інтэлігенты. “Кланяліся людзі настаўнікам пры сустрэчы і шапкі здымалі. …Настаўнікаў шанавалі” [19]. Менавіта такімі засталіся гэтыя настаўнікі ў памяці людзей. Якраз пра такіх настаўніц – В. Лычакоўну і М. Пранеўскую, што сталі прататыпам яго гераіні М. Анджэеўскай – пісаў згаданы Я. Брыль: “Прыгожая, па мацярынску абаяльная і светлая душой, яна вучыла нас, заходнебеларускіх пастушкоў, любіць высокае, сапраўднае ў паэзіі і ў песні польскага народа” [20].

Прагрэсіўныя настаўнікі знаёмілі вучняў з польскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай думкай. Гэта спрыяла пашырэнню радыкальных ідэй у вучнёўскім асяроддзі. Сярод прагрэсіўных польскіх настаўнікаў былі і такія, што з прыхільнасцю ставіліся да культурна-нацыянальных правоў

беларускага народа. Адна з іх – Э. Кунавіч, якая выкладала ў мястэчку Ілья Вілейскага павета. Яна не толькі вызначалася ветлівасцю, творчасцю, пачуццём службовай адказнасці, энергічнасцю, як гэта прадугледжвалася інструкцыяй “Аб кваліфікацыі настаўніка”, але і спагадлівым стаўленнем да беларускай мовы, культуры. Настаўніца карысталася беларускай мовай і на ўроках, і пры арганізацыі мастацкай самадзейнасці насельніцтва [21].

Эканамічны крызіс 1929-1933 гадоў прымусіў польскі ўрад рэзка скараціць расходы на адукацыю. У першай палове 1930-х гадоў рэальныя выдаткі на аднаго вучня зменшыліся на 56%. Ва ўмовах, калі значна павялічылася колькасць дзяцей школьнага ўзросту, навісла рэальная пагроза над задачай забеспячэння ўсеагульнай пачатковай адукацыі. Нявырашанасць праблемы ахопу дзяцей польскімі школамі стрымлівала працэс дэнацыяналізацыі. Урад рабіў спадзяванні на разгортванне шырокай сеткі ўстаноў адукацыі з боку прыватных асоб, польскіх арганізацый.

Польскія ўлады таксама не стварылі разгалінаванай і ўсеабдымнай сеткі бібліятэк, чытальняў. У Палескім ваяводстве іх паслугамі ў 1934 г. карысталася ўсяго 1,3% насельніцтва. У сярэднім на 1 польскую кнігу прыходзілася каля 15 чытачоў [22]. Беднасць, няведанне польскай мовы, высокі ўзровень непісьменнасці былі перашкодамі ў карыстанні кнігамі і перыядычнымі выданнямі.

Такім чынам, школьная рэформа ў Польшчы пачатку 1930-х гадоў дала магчымасць рэжыму “санацыі” паскорыць працэс канчатковай ліквідацыі беларускіх школ. Яна не задаволіла сацыяльна-эканамічныя, культурныя запатрабаванні насельніцтва Заходняй Беларусі. У ходзе рэфармавання ўзмацніліся часткова пазіцыі польскіх школ. Адначасова захоўвалася імкненне беларусаў да набыцця ўласнай, нацыянальнай адукацыі. Яно ўвасаблялася ў дзейнасці культурна-асветніцкіх арганізацый, палітычных партый. Таму і зразумела жаданне польскіх улад не толькі абмежаваць іх працу, але і поўнасцю спыніць. Толькі тады можна было бесперашкодна ажыццяўляць асіміляцыю беларускага насельніцтва. Варта адзначыць, што беларуская праблематыка страціла сваю ранейшую палітычную актуальнасць для Масквы і Мінска. Гэта таксама падштурхоўвала польскія ўлады фарсіраваць працэс дзяржаўнай асіміляцыі жыхароў Заходняй Беларусі.

# Глава 2. Змаганне супраць паланізацыі: цяжкасці і поспехі

Пасля таго, як Галоўная ўправа ТБШ у канцы жніўня 1929 г. зноў атрымала магчымасць легальнага існавання, пачалося ажыўленне яго дзейнасці. Ужо з восені гэтага года была адноўлена практыка складання дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ. Аднак рэальныя вынікі акцыі былі нязначныя, бо мясцовыя ўлады паўсюдна адмаўляліся зацвярджаць подпісы, перашкаджалі іх збору.

Члены Галоўнай управы ТБШ прынялі актыўны ўдзел у аднаўленні яго акруговых упраў, гурткоў. Аб колькасным росце гурткоў сведчыць статыстыка самой Галоўнай управы: калі на 1 верасня 1929 г. іх было 432, то на 1 чэрвеня наступнага года – 459. Паводле некаторых падлікаў, у сярэдзіне 1930 г. гэтая лічба перавысіла адзнаку 500 (звыш 15 тыс. чалавек) [1]. Немалая заслуга ў гэтым была і клуба “Змаганне”.

У інтарэсах захавання ТБШ прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі, якія ўваходзілі ў яго Галоўную ўправу, імкнуліся не паддавацца на неканструктыўныя дзеянні КПЗБ. Яны выступалі супраць празмернай палітызацыі дзейнасці Таварыства, нігілістычных адносін да пытанняў нацыянальнай адукацыі, але не змаглі да канца адстаяць сваю пазіцыю.

Нацыянальна-дэмакратычная інтэлігенцыя Заходняй Беларусі імкнулася выкарыстоўваць дзеля абароны інтарэсаў адукацыі розныя легальныя магчымасці. 18 чэрвеня 1930 г. шэраг заходнебеларускіх арганізацый накіраваў прэзідэнту Польшчы адпаведны мемарандум. У ім справядліва адзначалася, што беларускае пытанне так і не атрымала належнага разумення з боку кіруючых колаў краіны. “У мэтах абагульнення праграмы па беларускаму пытанню ўважаем за неабходнае сканцэнтраванне адміністратыўнай улады на абшарах усяе Заходняй Беларусі і выдзяленне ваяводстваў Віленскага, Навагрудскага, Палескага і часці Беластоцкага ў адну адміністрацыйную адзінку. Для вырашэння культурна-асветніцкага пытання на вышэйпамянёных землях павінна быць арганізавана адзіная школьная акруга, а ў ім спецыяльны аддзел беларускага школьніцтва на чале з беларусам, выбраным з асяродку кандыдатаў, прадстаўленых беларускімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі” [2]. Ва ўмовах разгортвання палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі разлічваць на карэнныя змены школьнай адміністрацыі было бессэнсоўна.

У абставінах ажыўлення дзейнасці ТБШ пракацілася новая, больш знішчальная хваля рэпрэсій польскіх улад. Са жніўня 1930 да канца 1931 года было закрыта каля 100 гурткоў. Былі арыштаваны кіраўнікі ТБШ –

Ф. Стэцкевіч, Р. Шырма, М. Пяткевіч і іншыя. У пачатку 1932 г. з 7 акруговых управаў засталося толькі 3 – у Беластоку, Косаве, Ваўкавыску. Зачэпкай для закрыцця была не толькі наяўнасць "антыдзяржаўных элементаў", але і розныя недакладнасці ў справаводстве, рахункаводстве, як было ў выпадку з самай дзеяздольнай, шматлікай акруговай упраўай у Міры.

З-за неаднаразовых арыштаў так і не ўдалося правесці ў 1932-1933 гадах агульны з'езд ТБШ. Наступілі самыя змрочныя часы для Таварыства. Да восені 1932 г. агульная колькасць гурткоў зменшылася да 150 – каля 4 тыс. чалавек [3]. У большасці паветаў іх дзейнасць спынілася.

Найбольш моцнай заставалася акруговая ўправа ТБШ у Беластоку. Спачатку ўнутраных супярэчнасцей там не было, але паступова вызначыўся канфлікт паміж згодніцкім і радыкальным крылом. Выкарыстаўшы гэта, польскія ўлады павялі працу па ліквідацыі ўправы. Найперш яны запатрабавалі выдаліць "падрыўныя элементы" і згадзіцца на супрацоўніцтва з польскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі. Хоць Галоўная ўправа не адкідвала наогул ідэю плённага супрацоўніцтва, але быў дадзены адмоўны адказ. Кіраўніцтва Таварыства меркавала, што ў тагачасных абставінах, калі масава закрываліся гурткі і акруговыя ўправы, супрацоўніцтва пагражала стратай свайго нацыянальнага твару.

На сваім сходзе 20 лістапада 1932 г. кіраўнікі Беластоцкай акруговай управы Таварыства ўсё-такі выказалі сваю згоду з прапановамі ўлад. У чарговы раз яны заявілі, што ўхіляюцца ад палітызацыі ў працы [4]. Гэта сведчыла аб тым, што большасць пакуль мелі прадстаўнікі згодніцкай лініі.

Дэмакратычная частка лідэраў ТБШ ішла на кантакты з дзеячамі БХД, якія таксама выступалі супраць пераўтварэння ў 1932 г. Віленскай беларускай гімназіі ў філіял дзяржаўнай польскай, бо лічылі гэта крокам на шляху ліквідацыі беларускай асветы. Іх апаненты (з групы Р. Астроўскага, а таксама А. Луцкевіч) спадзяваліся на часовасць такога становішча, ўмацаванне матэрыяльнай базы школы.

Адначасова рыхтаваўся судовы працэс над кіраўнікамі ТБШ, якіх абвінавачвалі ў падрыхтоўцы "камуністычнай змовы". Суд адбыўся 1-4 лютага 1933 г. у Вільні. Падпарадкаванне Галоўнай управы камуністычнаму падполлю не было даказана. Падсудныя публічна заверылі, што ў інтарэсах захавання арганізацыі ім даводзілася змагацца як з польскімі ўладамі, так і з левасектанцтвам камуністаў і іх прыхільнікаў. Ф. Стэцкевіч, Р. Шырма, М. Пяткевіч былі апраўданы, М. Церах, Ю. Саковіч атрымалі 3, Я. Скурко – 2 гады турэмнага зняволення.

Разам з ганеннямі рэжыма “санацыі” Галоўная ўправа Таварыства падвяргалася абвінавачванням з боку заходнебеларускага камуністычнага руху, што наносіла ёй велізарны маральны ўрон. Аб гэтым пазней згадваў у сваіх успамінах яе сакратар Р. Шырма. “Аднойчы прыходзіць да мяне ад КПЗБ хлопец са Стаўпеччыны (Стаўбцоўшчыны – А. В.) Мікалай… і прапануе, каб я напісаў, што выходжу з Галоўнай управы ТБШ, тады, маўляў, мне на судзе лягчэй будзе (ім, як панам, трэба было ліквідавацьТБШ). А я кажу: “Я не хачу, каб мне было лягчэй на судзе, я хачу, каб так, як другім было. Я не хачу, каб пасля мяне ўсе ганьбілі ў гісторыі, плявалі, што я памагаў пілсудчыкам ліквідаваць ТБШ” [5]. “Агенты нацыянал-фашызму і польскай дэфензівы”, “пачка здраднікаў” – гэтыя і іншыя ярлыкі навешваліся на ўсю беларускую дэмакратычную інтэлігенцыю [6]. Недавер, падазронасць былі выказаны якраз да тых дзеячаў, якія сваёй практычнай работай на працягу многіх гадоў даказалі адданасць нацыянальным інтарэсам беларусаў.

Такая пазіцыя КПЗБ была вынікам памылковай тактычнай лініі, замацаванай яшчэ на III пленуме яе ЦК у кастрычніку 1929 г. – непасрэдна на сацыялістычную рэвалюцыю, якая адмаўляла супрацоўніцтва з арганізацыямі сацыял-дэмакратычных партый, дэмакратычным крылом беларускай інтэлігенцыі. Таму невыпадковым было з’яўленне ў 1933-1934 гадах не толькі памылковых, але і шкодных для справы захавання культурна-асветніцкіх арганізацый рэзалюцый ЦК партыі “Аб хістаннях сярод часткі дзеячаў руху Заходняй Беларусі”, “Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў КПЗБ”, “Агонь барацьбы супраць нацыянал-апартунізму”.

У рэзалюцыі ЦК КПЗБ “Аб хістаннях сярод часткі дзеячаў руху Заходняй Беларусі” ад 30 сакавіка 1933 г. падвяргаліся беспадстаўным абвінавачванням кіраўнікі Таварыства. Іх “грахі” праявіліся “у святкаванні некаторымі дзеячамі нацыянальна-вызваленчага руху супольна з БХД юбілею Я.Купалы”, “у становішчы тых самых асоб у судзе супраць Галоўнай управы ТБШ, дзе яны публічна дэкларавалі, што для выратавання ТБШ неабходна было змагацца як з санацыяй, так і з клубам “Змаганне” і г. д. [7]. “Няправільныя” хістанні выявілі ў дзеяннях Ф. Стэцкевіча, Р. Шырмы, у “здрадніцкім выступленні Марцінчыка на беластоцкім з’ездзе ТБШ”, у выказванні на старонках часопіса “Летапіс ТБШ” (1933, № 1) адносна моладзі, у якой ёсць “адзін шлях – шлях культуры” [8]. Кампанія была вынікам пераносу ў КПЗБ практыкі барацьбы з “нацыянал-апартунізмам” і “нацыянал-дэмакратызмам” у БССР.

Сапраўды, такое стаўленне выцякала з падзей, якія разгортваліся ў Савецкай Беларусі. Там пачаліся рэпрэсіі супраць беларускай інтэлігенцыі, ішла рэвізія зместу нацыянальнай культуры, наўмысная дэфармацыя мовы. Відныя дзеячы нацыянальна-вызваленчай барацьбы і культурна-асветніцкага жыцця Заходняй Беларусі (М. Бурсевіч, П. Валошын, Ф. Валынец, Я. Гаўрылік, І. Дварчанін, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі) былі прыцягнуты ў 1933 г. да сфабрыкаванай АДПУ справы "Беларускага нацыянальнага цэнтра", сталі ахвярамі сталінізму [9]. Іх "пакаянныя" паказанні былі выкладзены абстрактна, агульнымі выразамі, дакументальна не пацверджаны. Каб уявіць глыбіню трагедыі, варта ўзгадаць урыўкі з архіўных спраў. З паказанняў М. Бурсевіча ад 10 кастрычніка 1933 г.: "…Праз свае разведвальныя органы ён (Польскі генштаб – А. В.) пачаў вербаваць у лік супрацоўнікаў дэфензівы ўжо вядомых асоб, якія праявілі сябе нацыяналістычна (Лявіцкі з УНДО, Луцкевіч, Астроўскі і інш. з Беларускага Нацыянальнага Камітэта) і пачаў з імі дамаўляцца адносна сумеснай барацьбы з камунізмам. На гэтай аснове былі завербаваны ў лік сакрэтных супрацоўнікаў польскай дэфензівы Кахановіч, Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Валошын, Сабалеўскі і я – Бурсевіч, а потым – Гаўрылік, Дварчанін, Валынец, Верамей і іншыя". А вось "прызнанне" А. Капуцкага ад 20 кастрычніка 1933 г. адносна брашуры П. Мятлы "Аб Таварыстве беларускай школы і яго барацьбе" (Мінск, 1932): "Насычана беларускім нацыяналізмам і пахвальбой "герояў" – кіраўнікоў ТБШ – стваральнікам і кіраўніком якога з'яўляўся нацыянал-фашыст Луцкевіч" [11].

Усё гэта ўзмацняла прыгнятальнае маральнае ўздзеянне на членаў уцалелых гурткоў ТБШ, дэзарыентавала іх. Пра гэта яскрава сведчаць паказанні сакратара Беластоцкай акруговай управы Таварыства В. Ляшчынскага, які пазней таксама стаў ахвярай сталінізму. "Наогул, мы звязвалі кампанію растлумачальнай працы здрадніцкай ролі паслоў з кампаніяй па разаблачэнню Галоўнай управы. Мы тлумачылі масам, што гэта былі інтэлігенцкія элементы, якія імкнуліся выехаць на чыёсьці спіне, якія не хацелі самі ісці і весці актыўную работу на карысць мас... На шматлікіх сходах многія таварышы выказваліся такім чынам: каму ж цяпер можна верыць, гэтыя ж паслы сядзелі ў турме, іх збівалі, а яны, аказваецца, здраднікі?" [12].

Апынуўшыся паміж двумя агнямі, Галоўная ўправа Таварыства ўсё-такі лічыла змаганне за школы на роднай мове прыярытэтным напрамкам дзейнасці, хоць гэтая кампанія і не мела значнага поспеху. "Мы павінны звярнуць увагу на дамаганне дзяржаўнай беларускай школы, бо гутарыць

аб прыватнай адукацыі ў сучасных абставінах – гэта новы цяжар на плечы працоўнага селяніна” [13].

У пачатку 1932 г. намаганнямі студэнтаў-беларусаў, гурткоў ТБШ на Беласточчыне быў прачытаны цыкл лекцый па айчыннай гісторыі, культуры, мове. Такую справу спрабавалі наладзіць актывісты і ў іншых мясцовасцях.

Дапамагала і друкаванае слова. У 1932 г. Галоўная ўправа выдавала “Бюлетэнь ТБШ”, газету “Шлях”, а з мая 1933 г. – часопіс “Летапіс ТБШ”. Усяго ў 1933 г. выйшла 4 нумары – апошні ў кастрычніку-лістападзе. Арганізатарам і актыўным аўтарам быў Р. Шырма. “Мы павінны імкнуцца ... да наталення таго духоўнага голаду, які пануе на вёсцы, павінны шукаць шляхі, што лучылі б паміж сабой шчырых і свядомых, але распыленых па ўсёй Заходняй Беларусі, ідэйна адданых культурнай працы адзінак”, – так была вызначана мэта часопіса ў прадмове да яго першага нумара.

Імкнучыся пераўтварыць Таварыства ў радыкальную палітычную арганізацыю, лідэры КПЗБ дабіліся таго, каб у лютым 1934 г. адзіная ўцалелая акруговая ўправа ў Беластоку заявіла аб непрызнанні Галоўнай управы і адмове ёй у матэрыяльнай падтрымцы. Тая ў сваю чаргу заклікала гурткі не ісці такім шляхам, перачакаць “сумныя часы, узмацніўшы сваё змаганне за культуру і асвету для шырокіх беларускіх мас” [14].

Ажыўленне працы гурткоў у канцы 1933 г. у асобных паветах (Слонімскі, Баранавіцкі, Вілейскі, Сакольскі і іншыя) прымушала кіраўніцтва ТБШ аднавіць акруговыя ўправы, склікаць агульны з’езд. Аднак ажыццявіць гэта не ўдалося. У сакавіку 1934 г. польскія ўлады забаранілі акруговую ўправу ў Беластоку. У пачатку 1934 г. Галоўная управа ТБШ спрабавала ажывіць сваю дзейнасць на Віленшчыне. Там дзейнічалі толькі 5 гурткоў.

Пасля шматлікіх спроб нелегальны з’езд ТБШ адбыўся 17 чэрвеня 1934 г. у Вільні. Нягледзячы на заклік аб ажыўленні працы Таварыства, у чарговы раз была падвергнута шальмаванню Галоўная ўправа. Яе функцыі былі неправамоцна перададзены выбранаму часоваму кіраўніцтву. На нашу думку, у абставінах, калі амаль усе гурткі былі закрыты, бібліятэкі ліквідаваны, такая пазіцыя была шкоднай.

На фоне спаду рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў краі назіралася некаторая актывізацыя дзейнасці БХД. Партыя па-ранейшаму надавала ўвагу пытанням адукацыі, што пацвердзіў яе IV з’езд 13 снежня 1931 г. Патрабаванні абавязковасці, бясплатнасці пачатковага навучання на роднай мове вучняў, вывучэння рэлігіі, роўных правоў і аднолькавых субсідый для дзяржаўных і прыватных школ, незалежнасці школьных уладаў ад адміністрацыі і г. д. ізноў былі ўключаны ў праграму партыі.

Калі ў пачатку 1930-х гадоў праца ТБШ затухала, то адбывалася некаторае ажыўленне БІГіК. У 1931 г. БіГіК налічваў 52 гурткі (каля 700 чалавек), з іх 36 мелі бібліятэкі. Аказвалася дапамога адзінай прыватнай беларускай школе ў Шаўлянах Браслаўскага павета. Польскія ўлады часта адмаўлялі ў правядзенні ўрачыстых мерапрыемстваў. Супраць пашырэння ўплыву БіГіК выступалі і заходнебеларускія камуністы. Былі выпадкі правакацыйнай адпраўкі па пошце нелегальнай літаратуры для кіраўнікоў гурткоў БіГіК, што выклікала рэпрэсіўныя дзеянні польскай паліцыі [15].

Беларускія хрысціянскія дэмакраты па-ранейшаму надавалі выключнае значэнне культурна-асветніцкай працы. У прынятай на з'ездзе БХД у снежні 1931 г. рэзалюцыі ўтрымліваліся адпаведныя патрабаванні. "У культурна-асветніцкім жыцці: дамагацца стварэння па ўсёй Заходняй Беларусі пачатковых і сярэдніх школ у колькасці, прапарцыянальнай беларускаму насельніцтву, як і арганізацыі для такіх школ асобнага беларускага дэпартаменту; з'езд рашуча пратэстуе супраць заснавання г. зв. утраквістычных школ, якія з'яўляюцца нічым іншым, як польскімі школамі. З'езд прызнае, што двухмоўе ў школах не столькі вырашае нацыянальнае пытанне ў галіне асветы, але наадварот, яшчэ больш абвастрае нацыянальны антаганізм. У сувязі з дэкрэтам прэзідэнта Польшчы ад 29.11.1930 г., што замацоўвае адукацыю на нашых землях і забараняе пераўтварэнне польскай школы ў беларускую перад сканчэннем 7 гадоў ад часу яе адкрыцця, з'езд дамагаецца адмены замацавання польскай школы на беларускіх землях. …З'езд патрабуе стварыць некалькі беларускіх кафедраў у Віленскім універсітэце імя С. Баторыя…" [16]. Хоць гэтыя патрабаванні ў чарговы раз былі праігнараваны польскімі ўладамі, але БХД настойліва абараняла нацыянальныя правы заходнебеларускіх жыхароў, найперш праз БІГіК. Ужо ў 1934-1935 гадах налічвалася больш 80 яго гурткоў, якія аб'ядноўвалі каля 1,2 тыс. чалавек [17]. Амаль кожны гурток меў уласную бібліятэку-чытальню.

Наогул, для культурна-масавага напрамку асветніцкай дзейнасці БХД уласцівы былі наступныя формы: адкрыццё бібліятэк-чытальняў, правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў, лекцый, арганізацыя маладзёжных таварыстваў, кааператываў. На працягу 1934 г. было наладжана каля 100 вечарынак, 40 лекцый, больш 50 тэатралізаваных пастановак. Хоць і з цяжкасцямі, але ажыццяўлялася выдавецкая справа. БІГіК часткова кампенсаваў страту ўплыву ТБШ, але не змог стаць масавай арганізацыяй. Дзеячы БіГіК мелі слабыя магчымасці сур'ёзна ўплываць на сацыяльна-эканамічнае развіццё заходнебеларускіх зямель. Таму асноўны акцэнт у сваёй дзейнасці звярталі толькі на культурна-асветніцкую працу.

Група інтэлігенцыі на чале з А. Луцкевічам, Р. Астроўскім ва ўмовах узмацнення рэпрэсій супраць адраджэнцкіх працэсаў як з боку сталінскага, так і польскага рэжыму адзіна магчымым выйсцем лічыла менавіта пошук кампрамісаў з існуючай уладай. Пасля таго, як ім не ўдалося ў сярэдзіне 1929 г. прадухіліць узмацненне расколу ў кіраўніцтве ТБШ, быў створаны Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюз). Цэлы шэраг патрабаванняў утрымліваўся ў наказах яго кандыдатаў на парламенцкіх выбарах 1930 г. Няўдача на іх так і не дала магчымасць гэта рэалізаваць.

Лідэры Цэнтрасаюза меркавалі заняцца выключна пытаннямі нацыянальнай культуры. “Мы мусім напружыць нашы сілы ў кірунку нацыянальнай самаабароны і тварэння беларускіх культурных каштоўнасцей” [18]. На базе Цэнтрасаюза была створана ў 1932 г. культурна-асветніцкая арганізацыя Таварыства беларускай асветы. З 1933 г. пачалося выданне часопіса “Родны край”. Мэта ТБА ў яго статуце была вызначана так: “Праца над развіццём беларускай культуры, пашырэннем школьнай і пазашкольнай асветы беларусаў на іх роднай мове, уздымам маральнага ўзроўню і вывучэннем польскай культуры, культурных адметнасцей іншых народаў, якія жывуць на супольнай тэрыторыі з беларусамі” [19].

У 1933 г. ТБА здолела адкрыць у 33 населеных пунктах Віленскага ваяводства свае бібліятэкі-чытальні, яшчэ ў 12 ішла падрыхтоўчая праца. Праводзіліся лекцыі, наладжваліся тэатральныя выступленні. Кіраўніцтва таварыства заклікала правесці сумесную школьную акцыю. “Кожная мясцовасць, якая цвёрда хоча дабіцца роднай беларускай школы, перш за ўсё павінна звязацца ці з беларускім часопісам, ... ці з той культурна-асветніцкай арганізацыяй, з якой бацькі бліжэй звязаны ідэйна (ТБА, ТБШ, БІГіК)” [20]. Аднак ТБА не змагла разгарнуць шырокай дзейнасці, бо пазіцыя “беларускай санацыі” негатыўна ўспрымалася як з боку КПЗБ, так і БХД. Супярэчнасці паміж культурна-асветніцкімі арганізацыямі рэзка абвастрыліся ў 1932 г. з-за пытання аб далейшым лёсе Віленскай беларускай гімназіі.

Сярод кіраўніцтва ТБА таксама не было адзінства. Калі А. Луцкевіч адстойваў свае незалежніцкія погляды, адмоўна ставіўся да нацыянальнай палітыкі рэжыму “санацыі”, то Р. Астроўскі працягваў з ім супрацоўнічаць. У 1934 г. справа дайшла да іх канчатковага разрыву. Выбраны шлях кампрамісаў не засцерагаў таварыства ад ганенняў з боку польскіх уладаў. Паланафільскія аб’яднанні не адыгралі значнай ролі ў грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным жыцці заходнебеларускіх зямель. Нярэдка яны функцыянавалі пры падтрымцы

польскіх уладаў. Іх дзейнасць уносіла разлад у нацыянальна-вызваленчы рух. У тагачасных рэаліях паланафільскія ідэі не маглі знайсці шырокага адабрэння і падтрымкі з боку насельніцтва Заходняй Беларусі.

Такім чынам, так і не быў створаны адзіны агульнанацыянальны фронт супраць паланізацыі. Асноўнымі прычынамі гэтага з'яўляліся як памылкі асобных палітычных партый, культурна-асветніцкіх арганізацый, іх слабасць, так і рэпрэсіўныя меры польскіх улад. На гэта ўплываў і знешні фактар – усталяванне і ўзмацненне сталінскай таталітарнай сістэмы.

Аднак нават у такіх умовах палітычныя партыі Заходняй Беларусі вялі барацьбу супраць нацыянальнага прыгнёту. Камуністы і камсамольцы арганізоўвалі рух навучэнцкай моладзі. У ходзе масавых выступленняў, дэманстрацый, забастовак школьная моладзь выстаўляла і палітычныя, і акадэмічныя патрабаванні: аб забароне эксплуатацыі і фізічнага пакарання малалетніх, свабодным аб'яднанні ў гуртках, арганізацыях, супраць паліцэйскага нагляду, за навучанне на роднай мове, бясплатнасць адукацыі, даступнасць для дзяцей працоўных сярэдняй і вышэйшай школы, аддзяленне школы ад царквы і г. д. Адна з такіх акцый адбылася 23 сакавіка 1934 г. У гэты дзень было зафіксавана больш 300 школьных забастовак і дэманстрацый у Беластоцкім, Брэсцкім, Гродзенскім, Навагрудскім і іншых паветах, у якіх прымалі ўдзел каля 2 тыс. вучняў [21]. Аднак камуністам не ўдалося пераўтварыць такія кампаніі пратэсту ў агульнакраёвыя выступленні.

Рэальная небяспека этнічнай асіміляцыі аўтахтоннага насельніцтва Заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1930-х гадоў падштурхнула нацыянальныя сілы розных палітычных лагераў стаць на шлях узаемадзеяння. Падставай для гэтага паслужыла афіцыйнае адмаўленне камуністаў ад сваёй ранейшай тактыкі. У адпаведнасці з рашэннямі VII кангрэса Камінтэрна II з'езд КПЗБ (9-18 мая 1935 г.) прызнаў неабходным стварэнне шырокага антыфашысцкага народнага фронту. Сярод іншых у аснову яго платформы ляглі патрабаванні раўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей і моў, адкрыцця дзяржаўных школ на роднай мове, беларускага універсітэта ў Вільні. У прынятай на з'ездзе рэзалюцыі ўказвалася, што працоўныя масы павінны змагацца супраць ліквідацыі беларускіх школ.

Найперш пачаліся кантакты паміж КПЗБ і БХД. На працягу жніўня-верасня 1935 г. адбыліся сустрэчы на ўзроўні ЦК партый. Беларускія хрысціянскія дэмакраты пайшлі на перамовы, хаця сумняваліся ў сапраўднасці намераў сваіх палітычных апанентаў адысці ад практыкі нацыянальнага нігілізму. Рознасць палітычных поглядаў, скажэнні нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР не прывялі да згоды. Была

дасягнута толькі дамоўленасць па пытаннях нацыянальнай адукацыі: аб сумесным зборы дэкларацый, выданні граматыкі і часопіса аб праблемах выхавання і навучання па-за школай.

У новых абставінах кіраўнікі ТБШ распачалі працу па ажыццяўленню дамовы. У пачатку 1936 г. аднавілася выданне часопіса "Летапіс ТБШ". Галоўная управа павяла працу па аднаўленню старых і стварэнню новых гурткоў, адкрыццю бібліятэк-чытальняў, курсаў для непісьменных.

У лютым 1936 г. паміж ТБШ і БІГіК было заключана пагадненне аб адзінстве дзеянняў у школьнай справе. 26 лютага 1936 г. была прынята сумесная дэкларацыя ў справе дамагання роднай школы. У агульным звароце дзве арганізацыі заклікалі заходнебеларускае грамадства падаваць дэкларацыі аб адкрыцці беларускіх школ. "Калі вы хочаце, каб дзеці нашы не адракліся сваіх сярмяжных бацькоў, любілі мазольную працу, сваю мову, Айчыну і ёй служылі ..., то неадкладна патрабуйце сваёй роднай беларускай школы ..." [22]. Для правядзення сумеснай акцыі быў створаны агульны сакратарыят, які адразу разаслаў каля 50 тыс. дэкларацый. Была выдадзена і распаўсюджана інструкцыя з юрыдычнымі даведкамі па школьнаму заканадаўству і практычнымі парадамі.

Канструктыўныя захады па аб'яднанню намаганняў дзвюх культурна-асветніцкіх арганізацый ў школьнай справе не знайшлі разумення з боку ТБА. З-за палітычных меркаванняў яно адмовілася ад сумесных дзеянняў: быццам гэтая акцыя накіроўвалася з Масквы.

На ўзроўні масавай свядомасці кампанія была ўспрынята станоўча. Ужо ў пачатку 1936 г. у Гродзенскім павеце markdown рознымі гурткамі і курсамі было ахоплена 1,5 тыс. чалавек. Інтэнсіўна ішло складванне дэкларацый у Баранавіцкім, Браслаўскім, Ваўкавыскім, Вілейскім, Маладзечанскім, Слонімскім і іншых паветах [23]. Як адзначалася ў справаздачы навагрудскага ваяводы, у ходзе гэтай акцыі праводзілася ўзмоцненая агітацыя, распаўсюджвалася літаратура.

Польскія ўлады аказвалі моцнае супрацьдзеянне школьнай кампаніі. Як правіла, войты паўсюдна адмаўляліся зацвярджаць подпісы, праводзіліся канфіскацыі дэкларацый, рэвізіі, затрымкі карэспандэнцыі на пошце, арышты ўпаўнаважаных і г. д. Фактычна ўвесь адміністрацыйна-паліцэйскі апарат быў выкарыстаны для барацьбы з рухам за адкрыццё беларускіх школ. Ён разглядаў школьную акцыю выключна праз прызму "камуністычнай змовы", заяўляючы аб тым, што гэта не адпавядала настроям заходнебеларускага сялянства.

Ганенні выклікалі выступленні пратэсту. Навучэнцы многіх школ падтрымалі збор подпісаў забастоўкамі, якія набылі характар

скаардынаваных выступленняў дзяцей і бацькоў. Такія забастоўкі адбыліся амаль ва ўсіх паветах. Школьныя інспектары вымушаны былі паабяцаць адкрыць навучальныя ўстановы на роднай мове вучняў у бліжэйшы час.

Тагачасная сітуацыя прымушала спадзявацца на менш прыкметную працу па самаадукацыі, хатняму навучанню. Групы самаадукацыі да 8 чалавек маглі існаваць у кожнай вёсцы без дазволу мясцовых уладаў. Роля настаўніка адводзілася любому адукаванаму чалавеку, інтэлігенту. Такі спосаб пазнання роднага слова прызнаваўся адзіна магчымым. Для гэтага настаўнік С. Паўловіч, адзін з кіраўнікоў ТБШ, склаў і выдаў буквар для хатняга навучання “Першыя зярняткі” (Вільня, 1936) (у 1937 г. – “Засеўкі” лацінскай азбукай).

Усе 137 малюнкаў на старонках буквара выкананы з вялікай любоўю і добрым веданнем прыроды, укладу жыцця беларускіх сялян. Аб гэтым парупіліся мастакі Я. Драздовіч, М. Васілеўскі, У. Паўлюкоўскі. За азбукай адразу ішоў раздзел “Беларусь і беларусы”, які адкрываўся краявідам Я. Драздовіча. Змястоўнымі былі таксама раздзелы “Прырода і праца на Беларусі”, “Культура і поступ (прагрэс)”, “Вучэнне – свет, невучэнне – цьма”. Там было шмат казак, вершаў, прыказак, прымавак. Буквар вылучаўся выразным нацыянальна-гістарычным каларытам, агульнадаступнасцю, густам афармлення. Уся прагрэсіўная заходнебеларуская грамадскасць прыхільна прыняла буквар. Вялікая папулярнасць кнігі напалохала польскія ўлады. У 1937 г. яе другое выданне было канфіскавана. Адзін з дзеячаў БНА, доктар С. Грынкевіч, у кнізе “Асвета (Аб народным універсітэце і іншых спосабах асветнай працы)” (Вільня, 1936) таксама папулярызаваў шэраг мер па самаадукацыі, навучанню па-за школай.

Нягледзячы на цяжкасці, Школьны сакратарыят працягваў сваю працу. Ён атрымаў каля 4,5 тыс. заяў з месцаў [24]. Спрабаваў таксама наладзіць больш цесныя кантакты з украінскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі, асабліва “Просвітай”, гурткі якой існавалі да 1933 г. і ў Палескім ваяводстве. Былі спадзяванні на падтрымку з боку заходнеўкраінскіх дзеячаў у польскім сейме, прэсе. Аднак узаемадзеянне ў школьным пытанні так і не было наладжана. Аб недастатковай салідарнасці ў разгортванні школьнай кампаніі ў межах ўсёй Польшчы гаварылі дэлегаты антыфашысцкага кангрэса работнікаў культуры (Львоў, 16-17 мая 1936 г.).

Ажыўленне дзейнасці ТБШ дазволіла правесці 5 ліпеня 1936 г. агульны сход яго кіраўнікоў і віленскага актыву. Там абмяркоўваліся пытанні аб рабоце арганізацыі і яе задачах. Быў выбраны новы склад

Галоўнай управы, куды ўвайшлі Ф. Стэцкевіч (старшыня), М. Кепель, В. Склубоўскі, Ф. Грышкевіч, Р. Шырма, М. Пяткевіч, М. Марцінчык, Ф. Кізевіч, С. Паўловіч, М. Касцевіч і іншыя. Членамі Нагляднай рады сталі М. Манцэвіч, М. Хацяновіч, Н. Ламашэвіч і іншыя [25]. Знаходжанне ў кіраўніцтве тых людзей, якія ў свой час адмоўна ставіліся да спроб КПЗБ ажывіць дзейнасць Таварыства, сведчыць аб іх усведамленні неабходнасці кансалідацыі ўсіх нацыянальных сіл краю. Немалое значэнне тут мела паслядоўнае правядзенне камуністамі Заходняй Беларусі ў жыццё тактыкі антыфашысцкага народнага фронту.

Цеснаму і шчыраму супрацоўніцтву ТБШ і БІГіК яшчэ перашкаджалі недаверлівыя адносіны паміж дзеячамі дзвюх партый, якія на іх уплывалі – КПЗБ і Беларускага нацыянальнага аб'яднання (новая назва БХД). Яшчэ захоўваліся рэцыдывы падазронасці да беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, у тым ліку і з асяроддзя Таварыства. Аб гэтым сведчаць матэрыялы II пленума ЦК КПЗБ (сакавік-красавік 1936 г.). "У галіне адукацыі створаны сумесны школьны камітэт (Школьны сакратарыят – А. В.). Аднак пры гэтым былі дапушчаны і памылкі. Людзі, якія ўваходзяць ад ТБШ – чужыя нам. Памылкова дапусцілі Шырму" [26].

Пры гэтым трэба ўлічваць тое, што на закрытым пасяджэнні пленума сакратара ЦК КПЗБ І. Лагіновіча закляймілі як "пілсудчыцкага шпіёна". Таму некаторыя камуністычныя дзеячы, кіраўнікі ТБШ паспяшылі адмежавацца ад вядомых дзеячаў нацыянальна-вызваленчай барацьбы, каб пазбегчы аналагічных абвінавачванняў у свой адрас. Камуністам не ўдалося поўнасцю пазбавіцца праяў ранейшых нігілістычных адносін да нацыянальных праблем беларусаў. "У галіне нацыянальнай за апошні час ёсць актывізацыя – рост самасвядомасці, але мы не арганізавалі і не кіравалі гэтым", – самакрытычна прызнаўся адзін з кіраўнікоў партыі [27].

Прызнанне памылак прысутнічала і ў праекце рэзалюцыі згаданага пленума. "Нацыянальны нігілізм, недаацэнка барацьбы беларускага народа за яго паўсядзённыя нацыянальныя патрэбы і культуру, недаацэнка лепшых вызваленчых традыцый беларускага народа, няздольнасць выкарыстаць іх для развіцця нацыянальна-вызваленчага руху аслаблялі ролю партыі як кіруючага фактара ў жыцці беларусаў, давалі магчымасць беларускай буржуазіі паказваць КПЗБ чужой нацыянальным інтарэсам беларускага народа, вылучаць сябе яго адзіным прадстаўніком" [28]. Падкрэслівалася таксама, што недастаткова засяроджвацца толькі нелегальнымі формамі барацьбы. "З народным фронтам у вёсцы … вельмі слаба з-за адпора ў нашых сельскіх арганізацыях. Ёсць шэраг спроб працаваць па-новаму (самаадукацыя, вечарыны, частковыя патрабаванні), але ў

цэлым работы па-новаму яшчэ няма. Не ўмеюць і баяцца легальных форм. Самі лезуць у падполле” [29].

У ходзе сумеснай школьнай акцыі ставілася пытанне пра аб’яднанне ТБШ і БІГіК. На месцах яно знаходзіла практычнае ўвасабленне – члены закрытых некалі гурткоў Таварыства плённа працавалі ў структурных адзінках другой арганізацыі. Аднак Галоўная управа ТБШ адхіліла такую прапанову, спасылаючыся на рознасць ідэалагічных асноў, традыцый і сферы ўплыву, хоць і прызнала пажаданым супрацоўніцтва з БІГіК не толькі ў школьнай справе, але і ў галіне пазашкольнай асветы, выдавецкай працы.

Аб’яднанае выступленне прымусіла польскія ўлады пайсці на нязначныя ўступкі: былі ўведзены ў некаторых школах урокі беларускай мовы, адкрыты польска-беларускія школы. Беларускае пытанне стала аб’ектам часовай увагі афіцыйнай польскай прэсы, дыскусіі ў сейме. Аднак рэальныя вынікі былі сціплыя.

Можна меркаваць, што значэнне акцыі было ў тым, што ў заходнебеларускім грамадстве пачалі ўсведамляць магчымыя вынікі палітыкі асіміляцыі. “Застаецца два шляхі: або павольнае нацыянальнае кананне, або ўпартае змаганне за сваю мову. І вось беларусы, маючы за сабой маральнае і юрыдычнае права, выбіраюць гэты апошні шлях” [30]. Супрацоўніцтва нацыянальных сіл выйшла за межы адной толькі школьнай кампаніі. Да шэрагу юбілееў – 15-годдзя ТБШ, Беларускага музея ў Вільні, 10-годдзя БІГіК і іншых – было прымеркавана ўрачыстае мерапрыемства “Дзень беларускай культуры”, якое адбылося 13 снежня 1936 г. Актыўны ўдзел у ім прынялі як дзеячы Таварыства, так і БІГіК. Нягледзячы на рознасць палітычных поглядаў, у камітэт па святкаванню ўваходзілі А. Клімовіч, М. Машара, Я. Пазняк, С. Паўловіч, П. Сергіевіч, М. Танк, Я. Шутовіч, Р. Шырма. Аднак як і ў першай палове 1930-х гадоў, не ўдалося стварыць агульнанацыянальны культурна-асветніцкі рух.

Усплеск нацыянальна-вызваленчай барацьбы выклікаў шалёную рэакцыю польскага ўрада. Асаблівую занепакоенасць у яго выклікала тэндэнцыя да кансалідацыі заходнебеларускага руху. Менавіта гэта падштурхнула 2-гі аддзел МУС Польшчы выпрацаваць у канцы 1936 г. план ліквідацыі ўсіх легальных арганізацый. 2 снежня была забаронена дзейнасць ТБШ, 4 снежня – БІГіК. Гэтыя рашэнні былі пацверджаны яшчэ раз 22 і 27 студзеня наступнага года. Тое ж стала з Беларускім настаўніцкім саюзам.

Негатыўны ўплыў на стан нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі аказаў роспуск у 1938 г. Выканкамам Камінтэрна Кампартыі Польшчы і яе састаўной часткі – КПЗБ. Такім чынам,

намаганнямі польскага ўрада і сталінскага рэжыму ў канцы 1930-х гадоў у краі зніклі арганізаваныя формы супраціўлення нацыянальнаму ўціску насельніцтва.

Тым не менш, беларуская культура не прайграла ў сутыкненні з польскай, бо парытэтнага, паўнавартаснага саперніцтва не было. Польская культурная экспансія на “усходнія крэсы” не здзейснілася ў запланаваных памерах. Уздым не толькі польскага патрыятызму, але і шавінізму, паўплываў на адкрыццё заходнебеларускім насельніцтвам сваёй нацыянальна-культурнай тоеснасці. Сама рэчаіснасць аказала мабілізуючае ўздзеянне на працэс самазахавання заходнебеларускай культуры. Аднак пагроза страты этнічна-культурнай адметнасці беларусаў у Польскай дзяржаве ў бліжэйшай перспектыве была даволі рэальнай.

У цэлым, у гісторыі барацьбы за беларускія школы перыяд 1930-1936 гадоў быў даволі складаны і трагічны. Рух за адкрыццё беларускіх школ не стаў такім масавым, як у 1926-1929 гадах. Культурна-асветніцкія арганізацыі перажывалі цяжкасці: ТБШ змагалася за сваё існаванне, БІГіК змог ажывіць працу, але яна мела абмежаваны характар, ТБА не знайшло адабрэння ў шырокіх колах грамадскасці. Асноўныя палітычныя партыі Заходняй Беларусі – БХД і КПЗБ – у сваёй практычнай рабоце імкнуліся закранаць праблемы адукацыі. Нягледзячы на асобныя захады ў наладжванні акцый пратэсту супраць насаджэння польскіх школ, пралікі ў стратэгіі і тактыцы заходнебеларускага камуністычнага руху не спрыялі захаванню і абароне інтарэсаў нацыянальнай школы. Выпраўленне такога становішча пачалося толькі ў сярэдзіне 1930-х гадоў.

## Глава 3. Стан адукацыі ў Заходняй Беларусі ў канцы 1930-х гадоў

Пасля забароны дзейнасці ТБШ, БІГіК і іншых нацыянальных арганізацый далейшы лёс беларускіх школ быў фактычна ўжо вырашаны. Да 1937/38 навучальнага года планавалася замяніць у Навагрудскім ваяводстве ўсе беларускія і літоўскія школы на польскія. З польскіх школ меркавалі выдаліць настаўнікаў няпольскай нацыянальнасці, прызначыць дырэктарамі былых вайскоўцаў, настроеных нацыяналістычна, прыхільна да ўраду. Рэкамендавалася школьным уладам цесна супрацоўнічаць з паліцэйска-адміністрацыйнымі. Гэта ўсё для таго, каб “у бліжэйшыя 4 гады пачатковая школа была поўнасцю апанавана польскім праўрадавым элементам” [1].

Такую накіраванасць мелі і прапановы палескага ваяводы В. Костэк-Бернацкага, выкладзеныя ім у лютым 1937 г. у сакрэтным лісце ў МУС Польшчы. І гэта пры тым, што на Палессі ўжо не было ніводнай няпольскай школы. "Настаўніцкія сілы для палескай вёскі трэба старанна падбіраць з элементаў польскага ядра, якія ўсведамляюць значнасць місіі, што трэба выканаць тут, з ідэалагічным настаўленнем. Няма чаго і гаварыць, у крайнім выпадку на працягу 10 бліжэйшых гадоў, каб настаўнікам на Палессі быў рускі, украінец, беларус ці нават мясцовы паляшук" [2].

Рабіліся канкрэтныя захады па пашырэнню паланізацыі праз мясцовыя органы ўлады. Яскравым сведчаннем з'яўляецца распараджэнне таго ж В. Костэк-Бернацкага павятовым старастам ад 31 студзеня 1938 г. "Адусюль ідуць скаргі і паведамленні пра тое, што служачыя дзяржаўнай адміністрацыі ... у час выканання службовых абавязкаў выкарыстоўваюць рускую, украінскую ці беларускую мову і нават яўрэйскі жаргон," – абураўся палескі ваявода. Таму было дадзена строгае папярэджанне аб тым, што "у межах Палескага ваяводства пры размове з насельніцтвам забаронена выкарыстоўваць якую-небудзь чужую мову. Людзей, якія яшчэ не валодаюць польскай мовай, трэба зразумець і не прымушаць іх выказвацца па-польску, аднак нельга гаварыць і пісаць не па-польску" [3]. Была ўстаноўлена адказнасць за парушэнне дадзенага распараджэння.

Беларуская нацыянальная школа апынулася ў поўным заняпадзе. Калі ў снежні 1936 г. існавалі яшчэ 8 беларускіх школ, то ў 1937/38 навучальным годзе ўжо не было ніводнай. Колькасць польска-беларускіх школ складала адпаведна 14 і 5, польскіх, дзе навучалася беларуская мова, – 43 і 44 [4]. Аднак іх лік да верасня 1939 г. значна зменшыўся. Фактычна беларускія пачатковыя школы перасталі існаваць.

У крытычнай сітуацыі апынулася Віленская беларуская гімназія. Польскія ўлады імкнуліся яе закрыць. Наладжваўся збор подпісаў бацькоў за змену мовы выкладання, запалохваліся вучні. Пагоршылася матэрыяльна-тэхнічнае забяспячэнне школы. Аднак гімназія працягвала карыстацца аўтарытэтам у заходнебеларускім грамадстве. Настаўнікі клапаціліся аб тым, каб не парушаўся вучэбна-выхаваўчы працэс. Яшчэ ў 1934 г. былі адноўлены скаўцкія традыцыі – існавалі дружыны хлопцаў і дзяўчат. Дружына хлопцаў насіла імя Ф. Багушэвіча, дзявочая дружына – імя Е. Полацкай. У 1936 г. у Вільні быў створаны Гурток прыяцеляў беларускіх скаўтаў (старшыня – ксёндз С. Глякоўскі). Беларускія скаўты прымалі ўдзел у міжнародным злёце скаўтаў у Спале. Дружыновымі ў бой-скаўтаў былі К. Паўла, А. Бразаўскі. Заходнебеларускія скаўты мелі зялёную форму з пагонамі на кашулі, аксельбантамі адпаведнага колеру.

Замест хусткі яны павязвалі на шыю ткану беларускі паясок, надзявалі пілотку ці шэрую фуражку з невялікім трохкутнікам і металічныя значкі з выявай нацыянальнага гістарычнага герба. Быў распрацаваны і герб беларускіх скаўтаў. Варта адзначыць, што юнакі і дзяўчаты імкнуліся захоўваць маральна-этычныя прынцыпы – абавязваліся не піць алкагольныя напоі, устрымлівацца ад курэння, дапамагаць слабейшым і абараняць пакрыўджаных. “Скаўты любяць і шануюць прыроду, не нішчаць дрэўцаў і птушак. Скаўты заўсёды радасныя і ветлівыя да ўсіх, не выкарыстоўваюць брыдкіх слоў” [5].

Паводле справаздачы дырэктара, у 1937/38 годзе ў Віленскай гімназіі дзейнічалі гурткі – гісторыка-літаратурны, краязнаўчы, спартыўны, вучнёўскі кааператыў, школьная каса ашчаднасці, выпускалася насценная газета “Наша жыццё”. Сярод вучняў найбольш было моладзі з Навагрудчыны. Большасць (81%) складалі дзеці сялян (пераважна малазямельных) і рабочых [6]. Аб папулярнасці гімназіі сведчыць і тое, што ў тым жа навучальным годзе на 40 месцаў у першым класе прэтэндавалі 80 кандыдатаў.

Бацькоўскі камітэт, незадаволены пераўтварэннем гімназіі ў 4-класную – згодна з школьным заканадаўствам 1932 г., дабіваўся ў чэрвені 1937 г. адкрыцця ў Вільні беларускага ліцэю гуманітарнага тыпу. Дазвол так і не быў дадзены, што з’яўлялася для гімназіі дадатковай стратай.

У 1938/39 навучальным годзе лёс гімназіі быў няпэўны. Папячыцельства Віленскай школьнай акругі загадала скасаваць першы клас. Хадайніцтва дэлегатаў бацькоўскага камітэта перад міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы ў маі 1939 г. плённых вынікаў не дало. Нягледзячы на гэта, уступныя экзамены летам 1939 г. праводзіліся.

Ліквідацыя польскімі ўладамі арганізаваных форм змагання за беларускія школы яшчэ не азначала, што насельніцтва поўнасцю пагадзілася з такой сітуацыяй. На нашу думку, пратэст супраць нацыянальнага ўціску акумуліраваўся ў патаемныя формы барацьбы. З-за недастатковага ўзроўню нацыянальнай свядомасці беларусаў яе размах не мог ўжо быць велізарным. Аднак нават пасіўнае супраціўленне магло ўяўляць небяспеку для польскай дзяржавы. Аб гэтым згадваў А. Станкевіч у дакладзе “Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы” (напісаны быў у 1935-1936 гадах для нейкага міжнароднага форума) [7]. У сваім рэфераце “Этычныя падставы нацыянальна-культурных правоў нацыянальных меншасцей”, які быў зачытаны на кангрэсе нацыянальных меншасцей (Лондан, 14-15 ліпеня 1937 г.), ён пацвердзіў думку аб тым, што ўзмацненне ўціску беларусаў і іншых няпольскіх народах можа паўплываць на дэстабілізацыю становішча ва ўсім усходнееўрапейскім

рэгіёне. Аўтар выводзіў права кожнага народа на захаванне роднай мовы, рэлігіі, палітычнай і эканамічнай самастойнасці з прынцыпаў агульначалавечай, хрысціянскай этыкі. А. Станкевіч адзначаў, што непавага правоў нацыянальных меншасцей большым народам “звычайна паходзіць ад яго неабмежаванага, немаральнага нацыянальнага ці дзяржаўнага эгаізму” [8].

Дэмакратычная грамадскасць Польшчы таксама не адабрала дзеянні ўрада па ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі. У 1930-я гады ў часткі палітычнай эліты Польшчы ўзнікла разуменне, што паланізацыя ўкраінцаў і беларусаў зайшла ў тупік, што неабходна шукаць іншыя сродкі ў ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Такія канцэпцыі былі сфармуляваны раней, асабліва сярод прыхільнікаў Ю. Пілсудскага, але яны не знайшлі практычнага прымянення. Дэпутат В. Пэлчынская лічыла, што мэтазгодна дазволіць легальныя формы дзейнасці беларусаў. Яна была ўпэўнена, што практыка перашкод і праследаванняў была не на карысць Польскай дзяржаве, бо толькі абуджала ў беларускага насельніцтва пачуццё ўласнай сілы, спрыяла пераходу яго незадаволенасці ў нелегальныя формы барацьбы [9]. Аднак такія выступленні былі адзінкавыя. Лічым, што змяншэнне цікавасці да беларускага пытання з боку польскай грамадскасці, у тым ліку і дэмакратычнай, была адным з праяўленняў кансалідацыі польскай нацыі. Не маючы пасля 1935 г. сваіх выбраннікаў у польскім сейме, беларусам нельга было разлічваць на паспяховасць абароны уласных правоў.

Змаганне за этнічнае выжыванне ўсё-такі не спынілася. У некаторых мясцовасцях, дзе раней вялікі ўплыў мелі гурткі ТБШ, былі зафіксаваны выступленні. Напрыклад, восенню 1937 г. жыхары вёскі Ігнатавічы Гродзенскага павета патрабавалі выкладання рэлігіі па-беларуску. У многіх паветах людзі зноў патрабавалі адкрыць беларускія школы. Аднак “тысячы людзей арыштоўваліся толькі за тое, што асмельваліся дамагацца для сваіх дзяцей школы на роднай мове” [10].

Цягу людзей да ведаў на роднай мове магла часткова задаволіць самаадукацыя. Шмат зрабіў у яе прапагандзе часопіс “Беларускі летапіс”, у выданні якога прымалі актыўны ўдзел Ф. Стэцкевіч, С. Паўловіч, М. Танк, Р. Шырма, В. Тумаш і іншыя. У разуменні С. Паўловіча самаадукацыя была не толькі сродкам авалодвання элементарных ведаў, навыкаў чытання, пісьма ў час хатняга навучання, але і шляхам для далейшага пазнання нязведанага, нацыянальнага, культурнага, эканамічнага і палітычнага ўсведамлення. Яго метадычныя распрацоўкі, буквары з’яўляліся найлепшымі тады дапаможнікамі як для дзяцей, так і непісьменных дарослых.

Усведамляючы ўвесь трагізм сітуацыі з нацыянальнай школай, выдаўцы “Беларускага летапіса” заклікалі ўсе ўцалелыя палітычныя сілы Заходняй Беларусі да канструктыўнага супрацоўніцтва, кансалідацыі. С. Паўловіч лічыў, што ў першую чаргу неабходна кінуць лепшыя інтэлектуальныя сілы на справу кнігадрукавання. “Каб скрануць з месца так занядбаную ў нас справу кніжкі ці бібліятэкі для вёскі, ад чаго залежыць будучыня нашага народу, трэба большага аб’яднання грамадзянства, трэба большай адвагі і ахвярнасці там, дзе іх не хапае, бо інакш ніколі не пабудаваць нам Дому беларускай культуры” [11]. Аднак самаадукацыя не набыла масавага характару.

Заходнебеларуская інтэлігенцыя працягвала самаахвярна займацца асветніцкай працай сярод моладзі. Для гэтага выкарыстоўваліся любыя магчымыя сродкі, у т. л. і друк. На працягу 1934-1938 гадоў С. Глякоўскі выдаваў у Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны ў Вільні штомесячны дзіцячы часопіс (лацінкай) “Пралескі”. У першыя 2 гады яго рэдагавала Л. Войцікава (З. Верас). У першым нумары заснавальнікі так тлумачылі дзецям назву свайго выдання, яго мэту: “Памагчы Вашым бацькам выхаваць Вас, каб Вы як тыя кветачкі пралескі няслі ўсюды радасць вясны і ўлівалі ў сэрцы старэйшых надзею лепшай будучыні нашага беларускага народу”. На старонках “Пралескі” можна было прачытаць шмат цікавага, павучальнага і займальнага матэрыялу для дзяцей. Змяшчыліся там вершы, казкі, калыханкі, байкі В. Адважнага, Я. Пачобкі, М. Машары, У. Паўлюкоўскага  і іншых аўтараў.

У названай друкарні выходзіў у свет у 1938-1939 гг. таксама лацінкай дзіцячы дадатак да часопіса “Хрысціянская думка” – “Зорка”. Адказным рэдактарам гэтага дзіцячага часопіса з’яўляўся В. Ермалковіч, а выдаўцом – А. Станкевіч. Дзіцячы фальклор В. Адважнага, М. Машары, С. Новіка-Пяюна і іншых займаў належнае месца ў кожным нумары “Зоркі”. Выданне прызначалася не толькі для беларускіх дзетак-католікаў, але і праваслаўных. Таму сярод іншых рэкламаваліся і кнігі С. Паўловіча. “Трэба брацца за кніжку!” – такі кліч быў кінуты да дзетак у адным з нумароў часопіса. Віленская ўлада з падазрэннем адносілася да выдання, даходзіла справа нават да канфіскацыі яго накладу (№ 8 за 1938 г.).

З мая 1937 г. С. Паўловіч рэдагаваў дзіцячы царкоўны, культурна-асветніцкі ілюстраваны часопіс “Снапок”, які выдаваўся ў Варшаве. Усяго выйшла 10 нумароў часопіса. Кожны з іх змяшчаў даволі цікавыя матэрыялы. Чытачоў знаёмілі са святамі – Вялікаднем, Сёмухай, Раством Хрыстовым і іншымі. Дзеці мелі магчымасць пачытаць пра многія культурныя здабыткі, знакамітых асветнікаў – віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія, Яўстахія (№ 1), пачынальнікаў пісьменства святых Кірылу і

Мяфодзія (№ 3), полацкую ігуменню святую Ефрасінню (№ 6), Каложскую (Барысаглебскую) царкву ў Гародні (№ 7-8). Аўтарам большасці гэтых артыкулаў быў сам рэдактар. Знаёмілі дзяцей таксама і з асобнымі каштоўнасцямі сусветнай культуры.

Часопіс быў своеасаблівым дзіцячым календаром прыроды. На кожны месяц юныя чытачы атрымлівалі заданні – назіраць за навакольнай прыродай. Даючы апісанне пораў года, С. Паўловіч не забываўся аб галоўнай мэце сваёй дзейнасці. “Таксама, як уся прырода імкнецца да абуджэння ў час вясны, гэтак жывуць пад небам, гэтак змагаюцца за жыццё вольнае і культурнае, гэтак чакаюць свае “вясны” і цэлыя народы”. Толькі трэба шмат працаваць, набліжаючы час адраджэння. На старонках “Снапка” можна было прачытаць шмат вершаў, жартаў, прыказак, прымавак, загадак, скарагаворак, напамінаў. Часопіс хутка набыў папулярнасць.

Адначасова польская адміністрацыя рабіла новыя захады па пашырэнню асіміляцыі беларусаў. Чарговыя меры па ўзмацненню “польскага стану валодання” ў Навагрудскім ваяводстве прысутнічалі ў сакрэтным плане, які быў распрацаваны ў красавіку 1939 г. У дадатак да ранейшых адпаведных крокаў ад школьнага кіраўніцтва патрабавалі поўнасцю выключыць з вучэбных планаў беларускую мову, перападрыхтаваць усіх настаўнікаў у духу клерыкальных, мілітарысцкіх ідэй, значна абмежаваць доступ да сярэдняй адукацыі дзецям няпольскага насельніцтва і г. д. У дакуменце падкрэслівалася, што “польская школа павінна мець ясна паказаную палітычную мэту і адпаведна падрыхтаваны персанал” [12].

Узмацніць асіміляцыю патрабаваў і беластоцкі ваявода Г. Асташэўскі ў сакрэтнай дакладной запісцы ад 23 чэрвеня 1939 г. у МУС Польшчы. Ён выступаў за тое, каб беларускае насельніцтва не толькі вучылася па-польску, але і думала “ў духу польскай дзяржаўнасці”. “Адпаведная кніжка, спецыяльна падабраная навуковым кіраўніком, складае найлепшы інструмент для селяніна, а таксама для ўкаранення прапольскіх ідэй у душу беларускага дзіцяці”. Аб сапраўдных намерах польскай адміністрацыі ў заходнебеларускім рэгіёне сведчыць і наступная вытрымка з дадзенай запіскі: “Рана ці позна беларускае насельніцтва будзе паланізавана. Яны (беларусы – А.В.) з’яўляюцца пасіўнай масай, без шырокай народнай свядомасці, без уласных дзяржаўных традыцый. ...Мы павінны адолець старажытную беларускую культуру. Неабходна зрабіць тут адпаведныя ўкладанні ў народную адукацыю, транспарт, ахову здароўя і г. д.” [13].

Усё гэта сведчыць аб тым, што напярэдадні верасня 1939 г. існавала рэальная пагроза страты заходнебеларускім насельніцтвам сваёй нацыянальнай адметнасці. Праводзілася мэтанакіраванае знішчэнне не толькі адукацыі, але і іншых элементаў сістэмы нацыянальна-культурнага аднаўлення беларусаў.

Да канца 1930-х гадоў улады не змаглі стварыць у Заходняй Беларусі разгалінаванай сеткі польскіх пачатковых школ. На тэрыторыю ў 100 кв. км на Віленшчыне і Навагрудчыне прыходзілася 5,4, Палескім – 3,4 школы, калі сярэдні паказчык па ўсёй Польшчы складаў 7,3 школы [14]. У многіх заходнебеларускіх паветах, асабліва на Палессі, існавалі “бясшкольныя акругі”. У 1936 г. у Палескім ваяводстве з 236 тыс. дзяцей школьнага ўзросту 53 тыс. (23%) не былі ахоплены пачатковым навучаннем. У Віленскай школьнай акрузе 21,6% дзяцей не вучыліся [15]. Усяго ў Заходняй Беларусі ў 1938/39 навучальным годзе не наведвалі школу больш 100 тыс. дзяцей.

Для ажыццяўлення задачы ўсеагульнага пачатковага навучання не хапала не толькі дастатковай колькасці школ, але і кваліфікаваных педагагічных кадраў. У 1936 г. на Палессі налічвалася 1200 школьных будынкаў, з іх 820 – арэндаваных. Такая сітуацыя назіралася і ў Віленскай школьнай акрузе. Большасць памяшканняў не была прыстасавана для нармальнага функцыянавання школ. У 1936/37 навучальным годзе ў Палескім ваяводстве замест 4235 школ працавалі 2350 [16]. У 1938/39 навучальным годзе па усёй Заходняй Беларусі на настаўніцкія пасады патрабавалася больш 5 тыс. чалавек.

Слабая матэрыяльная база школ была вынікам змяншэння дзяржаўнага фінансавання. Дзякуючы падтрымцы фізічных асоб, розных польскіх арганізацый ішло адкрыццё прыватных школ. Розныя польскія культурна-асветніцкія ўстановы і арганізацыі, што дзейнічалі ў мястэчках і вёсках Заходняй Беларусі, не толькі спрыялі развіццю польскай культуры, але і ажыццяўлялі нацыянальную асіміляцыю мясцовага насельніцтва. Шырокую дзейнасць разгарнуў Саюз вясковай моладзі, які імкнуўся выхоўваць юнакоў і дзяўчат “добрымі грамадзянінамі” Польскай дзяржавы.

Польскае школьнае таварыства (Польска мацеж школьна) рабіла ідэалагічны і паланізатарскі ўплыў на заходнебеларускія землі, дзе мела ваяводскія (Палеская, Віленска-Навагрудская, Гродзенская), павятовыя ўправы і гурткі. За час існавання адкрыла ў Заходняй Беларусі 300 польскіх пачатковых прыватных школ, некалькі гімназій і прафесійных школ. Колькасць пачатковых школ (пераважна 1 і 2-й ступеняў) Польскага школьнага таварыства на Палессі павялічылася з 13 (531 вучань) у 1931/32

да 116 (5684 вучні) у 1938/39 навучальным годзе [17]. Таварыства праводзіла ў пачатку 1939 г. асветніцкую працу ў Заходняй Беларусі ў 239 чытальнях-святліцах, 675 стацыянарных і перасоўных бібліятэках, 184 курсах для непісьменных дарослых, а таксама ў народных універсітэтах і дамах, на кароткатэрміновых прафесійных курсах, у дзіцячых садах і прытулках. Пры фінансаванні клерыкальных і ваенных колаў былі створаны рэгіянальныя адзінкі Таварыства падтрымкі будаўніцтва пачатковых школ. Пры ўдзеле гэтай арганізацыі ўлады здолелі ўвесці шмат школьных будынкаў [18]. З 1937 г. пачалося будаўніцтва ў кожным ваяводстве 100 школ імя Ю. Пілсудскага. Як сведчыць польская статыстыка, у ходзе гэтай акцыі ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне былі ўзведзены 200 пачатковых школ (744 памяшканні). Пры гэтых школах былі пабудаваны 624 дамы для настаўнікаў.

Існуючыя польскія школы абцяжарвалі вучням доступ да сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У Палескім ваяводстве ў 1939 г. з 1075 пачатковых школ першай ступені было 811, другой – 170, трэцяй – толькі 94 [19]. Захоўваўся вялікі працэнт адсеву. У параўнанні з 1932/33 навучальным годам, калі ў Брэсцкай школьнай акрузе налічвалася 18% другагоднікаў (разам з неатэставанымі – 25%), становішча палепшылася нязначна [20]. Уплываў на гэта і дрэнны стан здароўя дзяцей, аб чым гаварылася на канферэнцыі інспектараў гігіены ў міністэрстве веравызнанняў і грамадскай асветы 28-29 мая 1937 г. Распаўсюджанай прычынай непаспяховасці былі пропускі заняткаў з-за аддаленасці школ, неабходнасці памагаць бацькам па гаспадарцы, матэрыяльнай незаможнасці.

Удзельная вага беларусаў сярод навучэнцаў польскіх гімназій, ліцэяў, студэнтаў універсітэтаў была мізэрнай. У 1936/37 навучальным годзе ў прафесійных школах Польшчы яны складалі 0,53% [21]. У студэнцкім асяроддзі Віленскага універсітэта імя С. Баторыя ў 1930-1936 гадах беларусаў было 1,6-2,8%. Доля ж палякаў няўхільна павялічвалася і рабілася дамінуючай [22]. Безумоўна, што іх рады папаўняла і частка беларускай моладзі.

Нягледзячы на наяўнасць сярэдніх і прафесійных школ, інтарэсы сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця Заходняй Беларусі задавальняліся недастаткова. У 1937/38 навучальным годзе ў Віленскім, Навагрудскім, Палескім ваяводствах было 54 гімназіі і 49 ліцэяў, дзе займаліся адпаведна 13,3 і 2,6 тыс. вучняў [23]. Настаўніцкіх семінарый налічвалася ўсяго толькі 8 (каля 300 навучэнцаў). Школьная адміністрацыя паспяхова вывела беларускую мову з настаўніцкіх семінарый. У 1937/1938

навучальным годзе ў дзяржаўным педагогіуме ў Вільні яна не вывучалася нават як прадмет.

Нацыянальна-культурныя патрэбы няпольскага насельніцтва задавальняліся слаба. Нешматлікія тэатры, музычныя ўстановы, радыё, кінатэатры прапагандавалі пераважна польскую культуру, ігнаравалі інтарэсы няпольскага насельніцтва. У 1936 г. у Польшчы працавалі 103 тэатры, з іх польскіх было 67, украінскіх і рускіх – 16, яўрэйскіх – 15, аб беларускіх і літоўскіх афіцыйных звестак не было [24].

Поспехі ў ліквідацыі непісьменнасці былі, але не такія, як падавалі афіцыйныя ўлады. Удзельная вага пісьменных павялічвалася за кошт навучання моладзі ў польскіх школах. Тэмпы прыроста пісьменных моцна не змяніліся ад тых, што назіраліся ў 1920-я гады. Можна пагадзіцца з меркаваннем У.А. Палуяна, што для поўнай ліквідацыі непісьменнасці ў Заходняй Беларусі спатрэбілася б шмат часу [25]. Наогул, у канцы 1930-х гадоў па асноўных паказчыках адукацыі заходнебеларускія землі адставалі ад іншых рэгіёнаў тагачаснай Польскай дзяржавы.

Асвета этнічных супольнасцей з цяжкасцямі, але трымалася іх уласнымі арганізацыямі. Сіяністы ўплывалі на працу яўрэйскага культурна-асветніцкага таварыства “Тарбут” (“Культура”). Толькі на працягу 1929-1930 гг. у Палескім ваяводстве было адкрыта каля 30 рэгіянальных прадстаўніцтваў гэтай арганізацыі. А ў 1936 г. там было 11 пачатковых школ, 1 гімназія, што ўтрымліваліся таварыствам “Тарбут” [26]. Існавалі і яўрэйскія рэлігійныя школы – хедары, талмуд-торы, школы “Бет-Якаў” для дзяўчат і ешыботы для хлопцаў. Рэгулярна наладжваліся рэлігійныя курсы.

Некаторае ажыўленне назіралася і ў яўрэйскім тэатральным мастацтве. Асобнае таварыства стварыла ў Вільні яўрэйскі драматычны тэатр, Саюз яўрэйскіх акцёраў. Самабытнымі пастаноўкамі вылучаўся там тэатр марыянетак “Майдзім”. У 1935 г. у Вільні ўжо працавалі 15 яўрэйскіх тэатральных калектываў. Напярэдадні Другой сусветнай вайны была распачата кампанія будаўніцтва буйнога яўрэйскага тэатра [27]. Аднак тады з-за актывізацыі антысемітызму, ганенняў і перашкод з боку польскіх улад згортвалася дзейнасць яўрэйскіх аб’яднанняў.

З 7 рускамоўных газет, што друкаваліся ў 1930-я гг. у Польшчы, 3 выходзілі ў Вільні. 2 газеты на рускай мове пасля непрацяглага выдання ў пачатку 1930-х гг. у Палескім ваяводстве былі закрыты ўладамі за “нелаяльныя адносіны да польскай дзяржаўнасці і прапаганду вялікадзяржаўных манархічных поглядаў” [28]. Да 1932 г. у заходнебеларускіх землях існавалі нешматлікія рускія прыватныя навучальныя ўстановы – пачатковыя школы, рэальныя школы і гімназіі. У

Палескім ваяводстве дзейнічала руская гімназія ў Брэсце, рэальныя школы ў Пінску, Лунінцы.

Руская гімназія ў Брэсце з'яўлялася своеасаблівым нацыянальна-культурным цэнтрам. У гімназіі працавалі літаратурны, гістарычны, фізічны гурткі, гурток прыродазнаўства "Зялёныя сябры", аматараў-фатографаў. Гімназісты мелі сваю скаўцкую арганізацыю, займаліся мастацкай самадзейнасцю, выдавалі часопіс "Праблескі". У 1935/36 навучальным годзе ў яе класах вучыўся 141 вучань. Усяго ж у 1921-1939 гг. у рускай гімназіі і пачатковай школе ў Брэсце вучылася 8-8,5 тыс. чалавек [29].

У Навагрудскім ваяводстве існавалі 2 рускія школы, у Віленскім да сярэдзіны 1930-х гг. засталася толькі 1 прыватная руская гімназія ў Вільні [30]. Там наладжваліся вечарыны, штогадовыя ўрачыстасці ў гонар А. Пушкіна і іншыя пазашкольныя мерапрыемствы. З удзелам праваслаўнай царквы часта арганізоўвалі рэлігійна-асветніцкія акцыі. Аднак рускім было вельмі складана адстойваць пазіцыі сваіх нацыянальных школ. Палітыка паланізацыі вяла да дыскрымінацыі рускай мовы.

Рэпрэсіўныя дзеянні ўлад падрывалі моц украінскай культурна-асветніцкай арганізацыі "Просвіта". У 1930 г. ўцалелі толькі 79 гурткоў (1534 чалавекі), на наступны год – 56 (1031 чалавек) [31]. У 1933 г. былі ліквідаваны ўсе вясковыя бібліятэкі-чытальні "Просвіты" (засталася толькі 1 у Брэсце). Такі ж лёс напаткаў і гурткі – захаваліся толькі 2. З гэтага часу дзейнасць "Просвіты" у Палескім ваяводстве прыйшла ў заняпад. Крытычным было становішча адзінай украінскай школы ў Брэсце.

У той час, калі польская меншасць пры спрыянні дзяржавы не толькі актыўна пашырала, але і насаджвала сваю культуру няпольскаму насельніцтву, беларусы, яўрэі, рускія, украінцы, літоўцы і іншыя этнічныя супольнасці не атрымалі магчымасцей для паўнапраўнага нацыянальна-культурнага развіцця.

Такім чынам, да канца 1930-х гадоў польскія ўлады стварылі сетку навучальных устаноў у Заходняй Беларусі, ажыццявілі захады ў барацьбе з непісьменнасцю, але гэта толькі часткова задавальняла патрэбы жыцця краю. Адукацыйная сістэма пераўтварылася па мове выкладання, зместу ў мананацыянальную (польскую). Беларуская нацыянальная школа, якая перажывала да 1921 г. перыяд станаўлення, пасля працяглага змагання за сваё існаванне да канца 1930-х гадоў перастала дзейнічаць. Замест русіфікацыі, якая дамінавала ў школьнай палітыцы да Першай сусветнай вайны, стала праводзіцца гвалтоўная паланізацыя. Асабліва асіміляцыйны працэс паглыбіўся пасля ліквідацыі польскімі ўладамі арганізаваных форм

культурна-асветніцкага, палітычнага жыцця беларусаў. Канчатковая страта беларусамі сваёй этнічнай адметнасці стала пытаннем бліжэйшай перспектывы.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Захады ў справе пабудовы на Беларусі дэмакратычнай, працоўнай школы, якая ў адрозненне ад ранейшай была б пазбаўлена многіх супярэчнасцей, сталі заканамерным працягам нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст. З-за раз’яднання беларускіх зямель у розных частках адбывалася гэта неаднолькава. Калі ў БССР практычныя вынікі ў галіне адукацыі пачалі праяўляцца з пачатку 1920-х гадоў, то ў Заходняй Беларусі паўстала праблема захавання беларускіх школ.

З улікам умоў і абароны інтарэсаў нацыянальнай школы ў Заходняй Беларусі ў яе становішчы яскрава вылучаюцца 2 перыяды – 1920-я і 30-я гады. Хоць іх аб’ядноўвае агульная тэндэнцыя да страты беларускай адукацыі ў тагачаснай Польшчы сваіх пазіцый, аднак у 1920-я гады яшчэ працавалі нешматлікія нацыянальныя гімназіі і пачатковыя школы, часткова абараняліся іх правы, праводзілася распрацоўка вучэбна-метадычнага забяспячэння. У 1930-я гады польскія ўлады сталі на шлях канчатковай ліквідацыі беларускіх школ. Напярэдадні Другой сусветнай вайны нацыянальная школа беларусаў, як сістэма навучальных устаноў, падрыхтоўкі і перакваліфікацыі педагагічных кадраў, іх навукова-метадычнага, паліграфічна-выдавецкага забяспячэння, ужо не існавала.

Мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка Польшчы па асіміляцыі беларусаў аказала асноўны ўплыў на заняпад іх адукацыі. Сярод прычын, якія паспрыялі гэтаму, варта назваць змяншэнне цікаўнасці да беларускага пытання наогул у Польшчы з боку еўрапейскай супольнасці і асабліва – СССР. Такая сітуацыя дазволіла “санацыі” адкінуць усялікія міжнародныя абавязацельствы, парушаць канстытуцыйныя правы грамадзян. Змены ў грамадска-палітычным жыцці БССР і СССР, якія былі звязаны з канца 1920-х гадоў з узмацненнем сталінскага рэжыму, выклікалі складанасці і цяжкасці ў разгортванні нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Акрамя таго, недастатковы ўзровень нацыянальнай свядомасці, які быў выкліканы вынікамі русіфікатарскай практыкі ў папярэдні час і незавершанасцю этнічнай кансалідацыі, перашкаджаў пашырэнню барацьбы за адкрыццё школ на роднай мове. З-за невысокага ўзроўню жыцця беларускіх сялян была выключана магчымасць развіцця сеткі прыватных школ, што набывала асаблівае значэнне ва ўмовах адсутнасці рэальнай падтрымкі з боку Польскай дзяржавы.

Барацьба за адкрыццё беларускіх школ была часткай вызваленчага руху. Яе асноўнай сацыяльнай сілай былі сяляне. Менавіта таму культурна-асветніцкія ўстановы, арганізацыі, палітычныя партыі Заходняй Беларусі ў сваёй дзейнасці цесна звязвалі школьныя пытанні з патрабаваннямі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага характару. Асабліва гэта праявілася ў рабоце масавай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі – Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Радыкалізацыя настрояў сялянскіх мас вызначыла адчувальны перавес якраз рэвалюцыйна-дэмакратычнага крыла вызваленчага руху. Па меры аслаблення яго пазіцый (канец 1920-х – першая палова 30-х гадоў) спадала і актыўнасць змагання супраць нацыянальнага ўціску. Акрамя сялян, сацыяльную базу складалі таксама рабочыя, прадстаўнікі інтэлігенцыі.

Ва ўмовах, калі пачала абвастрацца праблема этнічнага выжывання беларускага насельніцтва, вялікае значэнне мела якраз праца па папулярызацыі культурна-гістарычнай спадчыны народа, ліквідацыі непісьменнасці, самаадукацыі. Гэтая дзейнасць у першую чаргу ажыццяўлялася праз беларускія школы.

У выніку мэтанакіраванай палітыкі правячых колаў дамінуючым тыпам нацыянальных школ у Заходняй Беларусі сталі польскія. Адпаведна змяніўся змест, формы, метады навучання і выхавання ў навучальных установах краю. У параўнанні з папярэднім часам (да ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы) польскія ўлады здолелі аднавіць і нават пашырыць сетку школ у Віленскім, Навагрудскім, Палескім ваяводствах, дабіцца некаторых поспехаў у ліквідацыі непісьменнасці. Не столькі цывілізатарскія памкненні, колькі стратэгічныя інтарэсы Польскай дзяржавы прымушалі гэта рабіць. Аднак існуючая сетка польскіх школ не забяспечвала сацыяльна-эканамічныя, культурныя патрэбнасці краю. Яна так і не ахапіла да канца 1930-х гадоў усіх дзяцей школьнага ўзросту. Павольна вялася і барацьба з непісьменнасцю дарослых. Не былі вырашаны праблемы асветы не толькі беларусаў, але і яўрэяў, украінцаў, рускіх, літоўцаў і іншых этнічных супольнасцей (акрамя палякаў) Заходняй Беларусі. Задаволіць адукацыйныя інтарэсы беларускага насельніцтва, вырашыць пытанне аб стварэнні школ на роднай мове, аблегчыць доступ да ведаў можна было толькі на нацыянальнай аснове.

Гэта пацвярджаецца ажыўленнем культурнага жыцця Заходняй Беларусі пасля ўз’яднання яе з БССР. Ужо ў снежні 1939 г. Наркамасветы рэспублікі выдаў “Інструкцыю аб парадку рэарганізацыі школ заходніх абласцей БССР”, паводле якой прадугледжваўся перавод навучання ў школах на родную мову вучняў. Як вынік гэтага – у 1941 г. у заходніх

абласцях рэспублікі працавалі 4192 беларускія, 987 – польскія, 173 – рускія, 168 – яўрэйскія, 63 – літоўскія, 43 – украінскія школ. Акрамя таго, існавалі педінстытут (у Беластоку), настаўніцкія інстытуты (у Беластоку, Пінску, Баранавічах), 8 педвучылішчаў (у Беластоку, Пінску, Брэсце, Навагрудку, Гродна, Маладзечна, Лідзе, Ваўкавыску).

# ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

## Уводзіны

1. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы. – Минск, 1962. – Т. 1; Минск, 1972. – Т. 2; Революционное движение в Вильнюсском крае: Документы и материалы. – Вильнюс, 1978; Назаўсёды разам: Да 60-годдзя уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск, 1999.

2. У суровыя гады падполля: Успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. – Мінск, 1958; Багдановіч Я. На жыццёвым шляху: Успаміны. – Мінск, 1992; Рагуля В. Успаміны. – Мінск, 1993; Чэмер А. (Анішчык А.). Наваградзкая беларуская гімназія. – Вільнюс, 1997 і іншыя.

## Раздзел І. СТАН АДУКАЦЫІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ДА 1921 г.

1. Снапкоўская С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца ХІХ – пачатку ХХ ст. – Мінск, 1995. – С. 8.

2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей – БДАМЛіМ). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 126. – Арк. 118-119.

3. Луцкевіч А. Польская акупацыя ў Беларусі. – Вільня, 1920. – С. 14 і інш.

4. Мазец В.Г. Беларуская Народная Рэспубліка: абвяшчэнне і дзейнасць (1918 год): Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02/ АН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1995. – С.14.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 804. – Воп. 1. – Спр. 6. – Арк. 26.

6. Przegląd narodowy. – 1921. – № 1. – S. 48.

7. Там жа.

8. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 74.

9. Філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна (далей – ФДАМВ у Маладзечна). – Ф. 93. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 282-283.

10. Дзяржаўны архіў Літвы (далей – ДА Літвы). – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 233.– Арк. 30-37.

11. НАРБ. – Ф. 604. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 27.

12. Склубоўскі В. Школьная справа і беларускі нацыянальна-вызваленчы рух // Беларускі каляндар 1967 г. – Беласток, 1967. – С. 99; Przegląd Wileński. – 1926. – 16 września.

13. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej 1920/22. – Warszawa, 1923. – Część II. - S. 279.

## Раздзел II. БЕЛАРУСКАЯ АСВЕТА Ў 1920-я ГАДЫ

### Глава 1. Палітыка польскіх уладаў у галіне адукацыі

1. Рыжская дамова 1921 г. (Мирный договор между Россией и Украиной, с одной стороны, и Польшей – с другой ) // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 17.

2. Almanach szkolnictwa Ziemi Wileńskiej 1919-1925. – Wilno, 1925. – S. 12.

3. Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. – Gdańsk, 1992. – S.103.

4. Oświata Polska. – 1924. – № 1. – S. 53.

5. Bartoszewicz J. Znaczenie polityczne Kresów wschodnich dla Polski. – Warszawa, 1924. – S.31.

6. Grabski S. Uwagi o bieżącej historycznej chwili Polski. – Warszawa, 1922. – S. 25.

7. Bartoszewicz J. Op. cit. – S. 31.

8. Oświata Polska. – 1924. – № 1. – S. 53.

9. Droga. – 1923. – № 4. – S. 25.

10. Tamże. – S. 26.

11. Szkolnictwo powszechne w roku szkolnym 1922/23. – Warszawa, 1925. – S. 16-21.

12. Koruś-Kabacińska J. Położenie ludności białoruskiej Rzeczypospolitej Polskiej w latach 1924-1926. – Warszawa, 1961. – S. 204.

13. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 16. – Białystok, 2001. – S. 85.

14. Прамовы дэпутатаў Беларускага пасольскага клюбу ў польскім сойме ў часе дыскусіі аб бюджэце і законах аб мовах меншасцяў: Паводле соймавых стэнаграм. – Вільня, 1924. – С. 44.

15. Przegląd Wileński. – 1925. – 28 czerwca.

16. Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. – S. 104-105.

17. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej 1925/26. – Warszawa, 1927. – S. 388-391.

18. Dzieje najnowsze. – 1972. – № 3. – S. 144, 156.

19. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 1459. – Арк. 6 адв.

20. Sprawy narodowościowe. – 1928. – № 3-4. – S. 407.

21. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1928. – S. 401.

22. Sprawy narodowościowe. – 1929. – № 6. – S. 819.

23. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 21. – Арк. 4.

24. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 17. – Białystok, 2002. – S. 133.

25. Dzieje najnowsze. – 1972. – № 3. – S. 166.

26. История Литовской ССР. – Вильнюс, 1978. – С. 367.

27. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1928. – S. 394; 1925/26. – Warszawa, 1927. – S. 398.

28. Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.). – Минск, 1978. – С. 33.

29. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). – Ф. 59. – Воп. 2. – Спр. 314. – Арк. 6; Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 1086. – Арк. 19.

30. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 77. – Арк. 140 адв.

31. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1928. – S. 399.

32. ФДАМВ у Маладзечна. – Ф. 204. – Воп. 1. – Спр. 186. – Арк. 3, 5.

33. Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. – S. 112; Беларуска-польскія архівалії: стан і перспектывы. Матэрыялы Другой беларуска-польскай канферэнцыі архівістаў 10-11 кастрычніка 2001 года, Мінск. – Мінск, 2003. – С. 110-111.

34. ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 2. – Спр. 623. – Арк. 36 адв.

35. Там жа. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 139. – Арк. 16.

36. Там жа. – Воп. 9. – Спр. 1183. – Арк. 23.

37. Там жа. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 364. – Арк. 27.

38. Там жа. – Спр. 17. – Арк. 25.

39. Там жа. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 46. – Арк. 69.

40. Там жа.

## Глава 2. Першыя гады існавання Таварыства беларускай школы

1. Луцкевіч А. Польская акупацыя ў Беларусі. – Вільня, 1920. – С. 14.

2. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 14. – Арк. 18.

3. Там жа. – Арк. 22.

4. Там жа. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 17. – Арк. 16.

5. Там жа. – Спр. 14. – Арк. 54.

6. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 14. – Арк. 54.
7. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 15. – Białystok, 2001. – S. 50.
8. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 17. – Арк. 4.
9. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 20. – Арк. 40.
10. Заходняя Беларусь: Зборнік грамадскае мыслі, літаратуры, мастацтва Заходняй Беларусі. – Вільня, 1924. – С. 145.
11. Там жа. – С. 151-152.
12. Як вучыць у новай школе? Увагі для вучыцеляў беларускіх сярэдніх школ /Апрацаваў А. Луцкевіч. – Вільня, 1923. – С. 13-14.
13. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 58а. – Арк. 1.
14. Там жа. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 32. – Арк. 19.
15. Там жа. – Спр. 17. – Арк. 48.
16. Беларус. – 1973. – № 195.
17. Przegląd Wileński. – 1927. – 15 kwietnia.
18. ДАБВ – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 768. – Арк. 19 адв.
19. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 16. – Białystok, 2001. – S. 78.
20. ДА Літвы. – Ф. 51. – Воп. 17. – Спр. 521. – Арк. 35.
21. Падлічана паводле: НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 77. – Арк. 148-154; ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1666.
22. Беларускі каляндар на 1927 г. – Вільня, 1927. – С. 100.
23. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 26. – Арк. 376.
24. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 4.
25. Przegląd Wileński. – 1937. – 29 styczńja.
26. Tamże.
27. ДА Літвы. – Ф. 51. – Воп. 17. – Спр. 7. – Арк. 5.
28. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 35. – Арк. 161.

**Глава 3. Рух за беларускія школы ў 1926-1929 гады**

1. Праграма і арганізацыйны статут БСР Грамады. – Вільня, 1926. – С. 1-12.
2. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 42. – Арк. 317.
3. ДАБВ. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 1135. – Арк. 93.
4. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 112. – Арк. 2.
5. Grabski S. Szkoly dwujęzyczne// Muzeum. – 1927. – № 1-2. – S. 48.
6. Революционное движение в Вильнюсском крае (1920-1940): Документы и материалы. – Вильнюс, 1978. – С. 121-122.
7. Беларускі календар на 1927 г. – Вільня, 1927. – С. 100.
8. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 21. – Спр. 112. – Арк. 5.
9. Станкевіч А. Беларускі хрысціянскі рух. – Вільня, 1939. – С. 206-207.

10. Natio. – 1927. – № 3-4. – S. 144.
11. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 14. – Białystok, 2000. – S. 129.
12. Купала Я. Поўны збор твораў: У 9 т. – Т. 9. – Кн. 2. – Мінск, 2003. – С. 14 – 16.
13. Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.). – Минск, 1978. – С. 107-108.
14. Ладысеў У.Ф. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 1. – С. 85-86.
15. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 112. – Арк. 8.
16. Там жа. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 210. – Арк. 30.
17. Там жа. – Спр. 235. – Арк. 1-2.
18. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 1323. – Арк. 96 адв., 144.
19. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 153. – Арк. 26.
20. Там жа. – Спр. 305. – Арк. 55.
21. Там жа.
22. Студэнцкая думка. – 1929. – №1. – С. 36.
23. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 1225. – Арк. 6.
24. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей – ДАГВ). – Ф. 93. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 104-105.
25. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 1225. – Арк. 8.
26. Sprawy narodowościowe. – 1929. – S. 816-818.
27. Гістарычны альманах. – Т. 8. – Гродна, 2003. – С. 221.
28. ДАГВ. – Ф. 93. – Воп. 1. – Спр. 4. – Арк. 101-102.
29. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 47. – Арк. 90-92.
30. Стаповіч А. Соймавыя прамовы і публіцыстыка // Спадчына. – 1994. – № 6. – С. 2.

**Глава 4. Беларускія гімназіі і пачатковыя школы**

1. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 672. – Арк. 58-59.
2. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 26. – Арк. 80.
3. Беларускі студэнт. – 1924. – № 7. – С. 32.
4. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 58а. – Арк. 1.
5. Бібліятэка АН Літвы. – Ф. 21. – Спр. 2237. – Арк. 6.
6. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 672. – Арк. 60-61.
7. Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 35.
8. Сям'я і школа. – 1929. – № 1. – С. 8.
9. Wysłouch S. Wilno i Ziemia Wileńska. Zarys monograficzny. – Wilno, 1930. – T. 1. – S. 256.
10. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 14. – Арк. 10 адв.
11. Там жа. – Спр. 30. – Арк. 87.

12. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 753. – Арк. 31-32.
13. Там жа. – Спр. 7672. – Арк. 26 адв.; БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 13, 56 адв.
14. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 28. – Арк. 3.
15. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 64. – Арк. 8.
16. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 5.
17. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 64. – Арк. 7.
18. Там жа. – Арк. 6.
19. Максім Гарэцкі: успаміны, артыкулы, дакументы. – Мінск, 1984. – С. 87-88.
20. Полацак. – 1992. – № 3. – С. 50.
21. Каталёг (кнігасьпіс) беларускіх кніг кнігарні "Пагоня". – Вільня, 1937. – С. 11.
22. Turonek J. Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921-1939. – Warszawa, 2000. – S. 28.
23. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Спр. 60. – Арк. 60 адв.
24. Там жа. – Спр. 61. – Арк. 51.
25. Чэмер А. (Анішчык А.). Наваградзкая беларуская гімназія. – Вільнюс, 1997. – С. 14.
26. Там жа. – С. 21.
27. Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 29, 30.
28. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 959. – Арк. 80.
29. Там жа. – Спр. 1235. – Арк. 45.
30. Сям'я і школа. – 1929. – № 1. – С. 20.
31. Язэп Драздовіч: Альбом-манаграфія. – Мінск, 2002. – С. 15.
32. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 941. – Арк. 8.
33. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 235. – Арк. 1-2.
34. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 1211. – Арк. 7 адв.

## РАЗДЗЕЛ III. ЗАНЯПАД БЕЛАРУСКАГА АСВЕТНІЦТВА Ў 1930-я ГАДЫ

### Глава 1. Канчатковая ліквідацыя беларускіх школ

1. НАРБ. – Ф. 242 – Воп. 1. – Спр. 435. – Арк. 45.
2. Słowo. – 1932. – 1 lipca.
3. Chojnowski A. Koncepcje polityki norodowościowej rządów polskich w latach 1921-1939. – Wrocław – Warszawa – Kraków, 1979. – S. 164.
4. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 10. – Białystok, 1998. – S. 106.

5. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 5519. – Арк. 21.

6. Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 4. – С. 31.

7. Czerwiński S. O nowy ideał wychowawczy. – Warszawa, 1931. – S. 8.

8. Białoruskie zeszyty historyczne. – № 10. – Białystok, 1998. – S. 76.

9. ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 1. – Спр. 1351. – Арк. 1.

10. Kotuła O., Tłuczek P. Podręczny poradnik dla kierowników i nauczycieli szkół powszechnych. – Lodź, 1936. – S. 301.

11. Statystyka szkolnictwa. – 1936/37. – S. 18; Mały rocznik statystyczny. – Warszawa, 1935. – S. 205.

12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Ч. 2. – Мінск, 1995. – С. 219.

13. Rocznik statystyki Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa, 1930. – S. 39-40; Mały rocznik statystyczny. – Warszawa, 1938. – S. 65.

14. Garbowska W. Szkolnictwo powszechne w Polsce w latach 1932-1939. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk, 1976. – S. 50.

15. ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 2. – Спр. 1196. – Арк. 21.

16. Garbowska W. Op. cit. – S. 94.

17. Брыль Я. Збор твораў: У 5 т. – Т.2. – Мінск, 1980. – С. 16.

18. У новай айчыне: Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. – Беласток, 2001. – С. 166.

19. Там жа. – С. 175, 178.

20. Брыль Я. Думы ў дарозе // Пяцьдзесят чатыры дарогі. – Мінск, 1963. – С. 62.

21. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. – Мінск, 1968. – С. 387.

22. ДАБВ. – Ф.1. – Воп. 8. – Спр. 299. – Арк. 99.

## Глава 2. Змаганне супраць паланізацыі: цяжкасці і поспехі

1. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 301. – Арк. 8.

2. Цыт. па кн.: Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917-1939 гг.). – Мінск, 2003. – С. 298.

3. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 532а. – Арк. 75.

4. ДАБВ. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 1984. – Арк. 29.

5. Ліцвінка В. Шырма расказвае пра сябе... // Мастацтва. – 1992. – № 7. – С. 25-26.

6. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 439а. – Арк. 10.

7. Там жа. – Спр. 458. – Арк. 22.

8. Там жа. – С. 45.

9. Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 3-4. – С. 48.

10. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 580а. – Арк. 10.

11. Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20-50-х гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994. – С. 61-64.
12. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 580а. – Арк. 10; Спр. 456а. – Арк. 29.
13. Летапіс ТБШ. – 1933. – № 3-4. – С. 42.
14. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 301. – Арк. 23. 15.
15. Беларуская крыніца. – 1932. – 8 мая.
16. Sprawy narodowościowe. – 1931. – № 6. – S. 629.
17. НАРБ. – Ф. 883. – Воп. 1. – Сп. 112. – Арк. 9.
18. Беларускі звон. – 1931. – 7 жніўня.
19. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 31. – Арк. 3.
20. Родны край. – 1934. – № 3. – С. 2.
21. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 494. – Арк. 4; Спр. 554. – Арк. 16.
22. Беларуская крыніца. – 1936. – 15 сакавіка.
23. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 923. – Арк. 2, 12.
24. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 615а. – Арк. 32.
25. Летапіс ТБШ. – 1936. – № 4-8. – С. 52.
26. НАРБ. – Ф. 242. – Воп. 1. – Спр. 582а. – Арк. 70.
27. Там жа.
28. Там жа. – Арк. 115.
29. Там жа. – Арк. 71.
30. Летапіс ТБШ. – 1936. – № 4-8. – С. 55.

**Глава 3. Стан адукацыі ў Заходняй Беларусі ў канцы 1930-х гадоў**

1. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 1281. – Арк. 40 адв.
2. Там жа. – Спр. 1656. – Арк. 15-16.
3. Там жа. – Ф. 2. – Воп. 4. – Спр. 165. – Арк. 2.
4. Statystyka szkolnictwa. – 1936/37. – S. 18; 1937/38. – S. 26.
5. Лозка А.Ю. Беларускі скаўтынг. – Мінск, 1997. – С. 24.
6. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 6794. – Арк. 2-5.
7. БДАМЛіМ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 280. – Арк. 6-22.
8. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. – Ф. 4. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 3.
9. Беларускі фронт. – 1937. – 5 сакавіка.
10. Танк М. Збор твораў: У 6 т. – Мінск, 1981. – Т. 6. – С. 384.
11. Беларускі летапіс. – 1937. – № 6-7. – С. 136.
12. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. – Мінск, 1993. – С. 202.
13. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 21. – Спр. 1784. – Арк. 43.

14. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 1092. – Арк. 36.
15. ДА Літвы. – Ф. 172. – Воп. 1. – Спр. 5912. – Арк. 3.
16. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 2. – Спр. 3613. – Арк. 2-3.
17. Polska Macierz Skolna na Polesiu. – Warszawa, 1939. – S. 36.
18. Sprawozdanie z działalności Towarzystwa Popierania budowy publicznych szkoł powszechnych za rok 1937 i plan pracy na rok następny. – Warszawa, 1938. – S. 43.
19. ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 2. – Спр. 657. – Арк. 3-4.
20. Там жа.– Спр. 417. – Арк. 5-7.
21. Miąso J. Szkoły zawodowe w Polsce w latach 1918 – 1939, ich rozwój, organizacja i funkcje społeczne. – Wrocław – Warszawa – Kraków, 1988. – S. 300.
22. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1092. – Арк. 39.
23. Mały rocznik statystyczny. – Warszawa, 1939. – S. 318.
24. Tamże. – S. 346.
25. Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.). – Минск, 1978. – С. 33.
26. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 879. – Арк. 5.
27. Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – № 5. – С. 63.
28. ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 794. – Арк. 20.
29. Монтвилов М.В. Русская гимназия в Бресте на Буге, 1919-1939. – Ним – Брест – Минск, 1996. – С. 55, 76.
30. ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 5. – Спр. 6679. – Арк. 16.
31. Там жа – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 46. – Арк. 69.

# Рэзюмэ
## Аляксандр Вабішчэвіч
## Асвета ў Заходняй Беларусі
## (1921 – 1939 гг.)

Даследуецца стан асветы, праблемы яе захавання ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг. На падставе новых гістарычных крыніц прааналізавана дзейнасць культурна-асветніцкіх арганізацый, палітычных партый, беларускіх гімназій і пачатковых школ, якія рэальна супрацьдзейнічалі планам паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва.

Акрамя падрабязнага вывучэння асветніцкага жыцця беларусаў, закрануты таксама пытанні, якія звязаны з адукацыяй іншых этнічных супольнасцей у дадзеным рэгіёне. Канстатуецца, што рэпрэсіўныя меры польскай адміністрацыі, раз'яднанасць нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, тэндэнцыя да фарсіравання леварадыкальных працэсаў, узмацненне таталітарнага рэжыму ў СССР прывялі да фактычнага разгрому самую масавую і ўплывовую культурна-асветніцкую арганізацыю – Таварыства беларускай школы.

Зроблена выснова аб тым, што адукацыя, асветніцкая праца сыгралі значную ролю ў самазахаванні беларусаў ва ўмовах іх нацыянальна-культурнай асіміляцыі ў складзе II Польскай рэспублікі.



# Резюме
## Александр Вабищевич
## Просвещение в Западной Беларуси
## (1921 – 1939 гг.)

Исследуется состояние просвещения, проблемы его сохранения в Западной Беларуси в 1921 – 1939 гг. С использованием новых исторических источников проанализирована деятельность культурно-просветительских организаций, политических партий, белорусских гимназий и начальных школ, которые реально противодействовали планам полонизации западнобелорусского населения.

Кроме детального изучения просветительской жизни белорусов, затронуты также вопросы, связанные с образованием других этнических сообществ в данном регионе. Констатируется, что репрессивные меры польской администрации, разобщенность национально-освободительного движения Западной Беларуси, тенденция к форсированию леворадикальных процессов, усиление тоталитарного режима в СССР

привели к фактическому разгрому самую массовую и влиятельную культурно-просветительскую организацию – Товарищества белорусской школы.

Делается вывод о том, что образование, просветительская работа сыграли значительную роль в самосохранении белорусов в условиях их национально-культурной ассимиляции в составе II Польской республики.

## Summary

**Aljaksandr Vabishchevich**

**Enlightenment in Western Belarus (1921 – 1939)**

The article deals with the state of enlightenment, problems of its preservanion in western Belarus in 1921 – 1939. Using new historical resources the author analyses the activity of cultural instructive organizations, political parties, Belorussian gymnasiums and primary schools which counteracted the plans of polonising Western Belorussian population.

The questions of formation of other ethnic communities alongside with detailed studies of instructive life of Belorussians in the given region are also concerned. It is stated that the repressive measures of Polish administration, disconnection of national – liberation movement in Western Belarus, tendency to speeding up left – radical processes, strengthening of totalitarian regime in the USSR led in fact to defeat of the most massive and influential cultural – instructive organization – Association of Belorussian Schools.

The author comes to the conclusion that education and instructive work played a great role in self – preservation of Belorussians under conditions of national – cultural assimilation being a part of the Second Polish Republic.

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ........................................................................................ 3

Раздзел I. СТАН АДУКАЦЫІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ДА 1921 г. ........................................................................................ 10

Раздзел II. БЕЛАРУСКАЯ АСВЕТА Ў 1920-я ГАДЫ
Глава 1. Палітыка польскіх уладаў у галіне адукацыі........................................................................................ 15
Глава 2. Першыя гады існавання Таварыства беларускай школы........................................................................................ 28
Глава 3. Рух за беларускія школы ў 1926-1929 гады........................................................................................ 39
Глава 4. Беларускія гімназіі і пачатковыя школы.................................. 55

Раздзел III. ЗАНЯПАД БЕЛАРУСКАГА АСВЕТНІЦТВА Ў 1930-я ГАДЫ
Глава 1. Канчатковая ліквідацыя беларускіх школ........................................................................................ 71
Глава 2. Змаганне супраць паланізацыі: цяжкасці і поспехі........................................................................................ 80
Глава 3. Стан адукацыі ў Заходняй Беларусі ў канцы 1930-х гадоў........................................................................................ 92

ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………… 102

ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ……………………..... 104

РЭЗЮМЭ……………………………………………………….. 113

**Навуковае выданне**

**ВАБІШЧЭВІЧ Аляксандр Мікалаевіч**

# АСВЕТА
# Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921-1939 гг.)

Манаграфія